WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

7 КАСТРЫЧНІКА 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 196
(26804)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

Дапамогі, пенсіі, паслугі

Адрасная сацыяльная дапамога і варыянты сацыяльных паслуг, асаблівасці вылічэння стажу і індывідуальнага каэфіцыента, пенсійныя надбаўкі і павышэнні — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» нашай газеты з удзелам намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціны Вікенцьеўны Каралёвай.

Такім чынам, увага! Паводле папярэдняй дамоўленасці, «прамая лінія» будзе праходзіць **з 11 да 12 гадзін 13 кастрычніка** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8 017) 292 38 92 і 232 38 21**. Нумар для папярэдніх пытанняў — **287 17 57**.

Заробак генеральнага дырэктара страхавой арганізацыі — Br 10 МЛН У МЕСЯЦ. ЗА ШТО?

Учора ў Камітэце дзяржкантролю прагучала абяцанне: дзейнасць страхавых кампаній разглядаецца чацвёрты раз — і апошні

Чацвёрты раз за апошнія тры гады запар Камітэт дзяржкантролю на сваіх калегіях указвае на сур'ёзныя недахопы ў страхавой сферы Беларусі, уносіць прапановы па ўдасканаленні заканадаўства, аднак пакуль сітуацыю кардынальна змяніць не ўдалося. Страхавымі арганізацыямі не выконваюцца асноўныя эканамічныя паказчыкі і заданні, прадугледжаныя Рэспубліканскай праграмай развіцця страхавой дзейнасці на 2006-2010 гады. У нашай краіне сёння працуе 25 страхавых кампаній, з іх чатыры — дзяржаўныя, і яшчэ чатыры, у асноўных фондаў якіх дзяржаўная доля складае больш за палову. Пры гэтым з 26 асноўных эканамічных паказчыкаў у гэтай сферы сёлета не выкананы 10. Але гэта зусім не абстрактныя для абывацеля лічбы, а прамое адлюстраванне незадаволенасці насельніцтва якасцю паслуг, якія аказваюць страхавыя арганізацыі.

— За гэтымі лічбамі стаяць лёсы людзей, — пракаментаваў журналістам сітуацыю **намеснік старшыні Камітэта дзяржкантролю Аляксандр АГЕЕУ**. — Кампенсаванне выдаткаў па страхавым выпадку часта пераўтвараецца ў хаджэнне па пакутах. Некаторыя людзі чакаюць вяртання грошай ад страхаўшчыкоў па 8 месяцаў. Ды і само прызнанне страхавога выпадку аказваецца праблематычным, бо патрабаванні страхавых кампаній часам цалкам абсурдныя і невыканальныя. Адсюль і малая доля страхавых узносаў ва ўнутраным валавым прадукце, і маленькі працэнт добраахвотнага страхавання жыцця — толькі тры працэнты насельніцтва краіны. А ў Францыі, напрыклад, — 96 працэнтаў.

Пра тое, наколькі якасна працуюць страхавыя кампаніі, сведчаць і лічбы страхавых паступленняў на кожнага жыхара краіны. У Беларусі яны летась склалі 41 долар, у Казахстане — 71, Венгрыі — 500 долараў, Швецыі — 4000. Намеснік старшыні Камітэта дзяржкантролю заўважыў, што з боку дзяржавы страхавым кампаніям аказваецца каласальная дапамога. На працягу апошніх 5 гадоў з бюджэту было выдзелена ў асноўныя фонды страхавых кампаній 1,5 трл беларускіх рублёў. У той жа час страхавыя кампаніі вярнулі ў бюджэт толькі 340 млрд беларускіх рублёў.

У людзей гэтая паслуга таксама запатрабаваная, аднак складаецца ўражанне, што самі страхавыя арганізацыі цалкам задаволеныя станам спраў і не робяць патрэбных крокаў для ўдасканалення сваёй дзейнасці.

Так, на Калегіі быў разгледжаны прыклад, калі рэжым працы некаторых страхавых кампаній зусім нязручны для кліентаў. Апошнім для таго, каб заключыць дагавор або заявіць аб наступленні страхавога выпадку, трэба ахвяраваць сваім працоўным часам.

У насельніцтва нашай краіны няма даверу да страхаўшчыкоў і таму, што стапрацэнтная кампенсацыя выдаткаў пры наступленні страхавога выпадку часта аказваецца нерэальнай. Яскравы прыклад таму — страхаванне транспартных сродкаў. Калі размова ідзе не пра новы аўтамабіль, то страхавая кампанія аплачвае норма-гадзіну на яго рамонт у выпадку ДТЗ па тарыфах, якія значна меншыя, чым кошт рэальных норма-гадзінаў на станцыях тэхнічнага абслугоўвання. Таксама вярнуць грошы за рамонт новага аўтамабіля аказваецца прасцей, але наколькі гэта справядліва ў адносінах да менш забяспечанай катэгорыі грамадзян, якія купляюць патрыманыя аўто?

— Тэма гэта ўжо паспела набіць аскому, — заўважыў на Калегіі **старшыня Камітэта дзяржкантролю Зянон ЛОМАЦЬ**. — Летась па нашай прапанове былі вызваленыя ад займаемых пасад тры кіраўнікі страхавых арганізацый. Быў прыняты шэраг нарматыўных актаў, але істотных паляпшэнняў у гэтай сферы няма. Калі доля страхавых узносаў, згодна з Праграмай, павінна скласці 1,5 працэнта ўнутранага валавога прадукту, а складае 0,88 працэнта, у нас узнікае пытанне да Міністэрства фінансаў, якое кантралюе гэту дзейнасць: у вас 25 чалавек кантралююць гэтую сферу, дык чым яны займаюцца? Сённяшняя размова павінна паслужыць рэзкім штуршком для прыняцця больш эфектыўных мераў.

На Калегіі дзяржкантролю была звернутая ўвага на тое, што нават тыя нездавальняючыя паказчыкі па выкананні Праграмы з'яўляюцца завышанымі і не адлюстроўваюць рэальнага стану спраў, які насамрэч значна горшы. Разам з тым, кіраўніцтва некаторых страхавых арганізацый усталёўвае для сваіх работнікаў высокія заробкі і, нягледзячы на невыкананне планаў, выплачвае прэміі. Напрыклад, сярэдні заробак у Беларускім народным страхавым пенсійным фондзе складае 3 мільёны рублёў, а генеральны дырэктар, яго намеснік і галоўны бухгалтар атрымліваюць ад 7 да 10 млн рублёў.

— Хоць гэта і вельмі высокі заробак, але ён не выклікаў бы пытанняў, калі б гэтая кампанія жыла за кошт добраахвотнага страхавання жыцця фізічных асоб, — абурыўся старшыня Камітэта дзяржкантролю. — Але 85 працэнтаў страхавых унёскаў «БНСПФ» складаюцца з абавязковага страхавання трох буйных дзяржаўных прадпрыемстваў. Інтарэсы дзяржавы павінны быць абароненыя незалежна ад таго, ідзе размова пра прыватную або пра дзяржаўную структуру.

Па выніках Калегіі Камітэт дзяржкантролю рэкамендаваў Савету Міністраў разгледзець пытанне аб прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці шэраг кіраўнікоў Міністэрства фінансаў. Акрамя таго, Мінфіну прапанавана прыняць меры па навядзенні парадку ў сферы страхавання грамадзянскай адказнасці транспартных сродкаў, а таксама забяспечыць жорсткі кантроль за выкананнем страхавымі арганізацыямі правілаў і ўмоў страхавання, у тым ліку пры разглядзе звароткаў грамадзян.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

МАРОЗНАЕ МАЛАКО

Выпас свойскага статку ў вёсцы Ілля Вілейскага раёна.

РЭНЕСАНС АТАМНАЙ ЭНЕРГЕТЫКІ

Акрамя Беларусі, нашы суседзі — Літва, Польшча, Калінінградская вобласць Расіі — заявілі аб намеры ўзвесці на сваёй тэрыторыі АЭС. Атрымаецца, што ў адным рэгіёне з'явіцца некалькі атамных электрастанцый, таму ў самым выгадным становішчы апынецца тая краіна, якая раней распачне будаўніцтва сваёй АЭС.

Пра гэта ўчора заявіў журналістам першы намеснік старшыні прэзідыума НАН Пётр Віцязь на брыфінгу ў межах II Міжнароднай канферэнцыі «Ядзерныя тэхналогіі XXI стагоддзя».

— У таго, хто раней пабудуе атамную электрастанцыю, будзе лішак энергіі, — патлумачыў навуковец. — Ён першым падпіша дагаворы і зойдзе на рынак — свой ці чужы. Таму чым раней мы пабудуем АЭС, тым лепей.

Два гады таму ў нашай краіне было прынятае рашэнне аб будаўніцтве АЭС сумарнай магутнасцю 2000 МВт з уводам у эксплуатацыю першага энергаблока ў 2016 годзе, другога — у 2018-м.

— Пытанне бяспекі для нашай краіны — выключна важнае, — пацвердзіў генеральны дырэктар «Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў — Сосны» НАН Беларусі Вячаслаў Куўшынаў. — Пасля карпатлівага аналізу быў зроблены выбар на карысць праекта, які істотна — у дзясяткі тысяч разоў — больш бяспечны, чым іншыя (расійскі праект АЭС-2006). Фактычна верагоднасць цяжкіх аварый звядзеная да велічынь, блізкіх да нуля. Акрамя таго, там прадугледжаная яшчэ і сістэма пасіўнай бяспекі (без удзелу чалавека). Плюс — двайная абарончая абалонка супраць смерчаў, падзення самалётаў і г.д.

Як патлумачыў Вячаслаў Куўшынаў, у нас ужо распрацаваная праграма падрыхтоўкі кадраў — уведзены 6 новых спецыяльнасцяў у 4 універсітэтах краіны, якія будуць рыхтаваць кадравы «касцяк» будучай АЭС. Большасць «атамных» спецыялістаў пройдзе стажыроўку за мяжой (ва Украіне, Расіі). Пры «Аб'яднаным інстытуце энергетычных і ядзерных даследаванняў — Сосны» ствараецца вучэбна-вылічальны цэнтр, абсталяваны супер-камп'ютарам для падрыхтоўкі часткі спецыялістаў-атамшчыкаў вышэйшай кваліфікацыі. Паводле звестак Міжнароднай ядзернай асацыяцыі (WNA), сёння ў 30 краінах свету эксплуатуецца 441 атамны энергаблок, яшчэ 58 знаходзяцца на розных стадыях будаўніцтва. Многія краіны заявілі пра пачатак развіцця сваіх нацыянальных праграм па атамнай энергетыцы. У бліжэйшае дзесяцігоддзе запланавана распачаць будаўніцтва 152 новых ядзерных рэактараў. Толькі ў ЗША сёння эксплуатуецца 104 ядзерныя энергаблокі, а да 2050 года іх колькасць плануецца павялічыць да 300. У свеце аднаўляецца маштабнае будаўніцтва атамных станцый. Спецыялісты гавораць аб рэнесансе атамнай энергетыкі. Усё больш людзей пераконваецца, што без хуткага і маштабнага развіцця гэтай галіны могуць замарудзіцца тэмпы эканамічнага росту. Атамная энергетыка з'яўляецца часткай энергетычнай бяспекі краіны.

Інга МІНДАЛЁВА.

Кватэрнае пытанне

КАЛІ Ў КАЛЕКТЫЎНЫМ ДАГАВОРЫ ЗАПІСАНА...

Чытаў у вашай газеце, што прадпрыемствы могуць вызначаць свае асобыя (больш ільготныя, чым у выканкаме) умовы пастаноўкі работнікаў на кватэрны ўлік. Як гэта рэалізуецца на практыцы?

Л. Громаў, *Рагачоўскі р-н*

Сапраўды, згодна з пунктам 5 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, выдзяленне жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565), арганізацыі, якія маюць ва ўласнасці, на праве гаспадарчага падпарадкавання або аператыўнага кіравання жылыя памяшканні, у вызначаным парадку могуць прадугледжваць (па ўзгодненні з уласнікам або ўпаўнаважаным ім асобай) у калектыўных дагаворах дадатковыя падставы для прызнання сваіх работнікаў тымі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Пры гэтым паляпшэнне жыллёвых умоў такіх работнікаў ажыццяўляецца толькі па месцы іх працы.

Адпаведныя рэкамендацыі дадзеныя ў Метадычных матэрыялах Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі па распрацоўцы калектыўных дагавораў, у якіх можа быць канкрэтызаванае кола асоб з дадатковымі падставамі для прызнання іх тымі, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а таксама ўказаныя і канкрэтныя крытэрыі, па якіх гэтыя работнікі прымаюцца на ўлік. Напрыклад, работнікі, якія бесперапынна прапрацавалі ў арганізацыі 20 і больш гадоў, пры забяспечанасці іх агульнай плошчай ў жылым памяшканні, якое яны займаюць, менш за 18 кв. м.

Выкарыстоўваецца і такая льготная падстава, як пражыванне ў адной кватэры (аднакватэрным жылым доме), заселенай (заселеным) некалькімі ўласнікамі жылых памяшканняў, калі іх уласнасць выдзеленая ў пэўным парадку (праведзены падзел жылога памяшкання з утварэннем двух і больш асобных жылых памяшканняў або з выдзяленнем ва ўласнасць ізаляваных жылых пакояў з пакіданнем падсобных памяшканняў у агульным карыстанні і ў агульнай долевай уласнасці), і (або) наймальнікамі жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (незалежна ад узроўню забяспечанасці агульнай плошчай жылога памяшкання на кожнага члена сям'і).

У метадычных матэрыялах прадугледжана таксама, што права пастаноўкі на ўлік незалежна ад узроўню забяспечанасці агульнай плошчай жылога памяшкання можа быць выдзелена работнікам, якія пражываюць у жылым памяшканні, якое не адпавядае ўзроўню добраўпарадкавання ў прымяненні да ўмоў пэўнага населенага пункта, і г.д.

Віктар САВІЦКІ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ВІРУСЫ «ПРЫТАРМАЗІЛІ»?

На працягу апошняга тыдня (з 27 верасня па 3 кастрычніка) у сталічныя ўстановы аховы здароўя з прастуднымі захворваннямі звярнуліся 24 901 чалавек. Большую палову захварэлых (56 працэнтаў) склалі дзеці і падлеткі. Умераны рост (на 7 працэнтаў) захваральнасці вострымі рэспіраторнымі інфекцыямі ў параўнанні з папярэднім тыднем адзначаўся сярод дзяцей ва ўзросце да 6 гадоў. Затое сярод падлеткаў 15—17 гадоў назіралася зніжэнне захваральнасці на 30 працэнтаў.

Як сцвярджаюць у сталічнай санэпідслужбе, за прайшоўшыя 6 тыдняў актывізацыі ВРВІ прычынамі захворвання мінчан на прастуду станавіліся рэспіраторна-сінтыцыяльныя вірусы, адэнавірусы і змешаныя формы інфекцыі. Вірусы грыпу лабараторна пакуль не выяўляліся.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ВЫРАТАВАЛІ З ДОМА І З МАШЫНЫ

У Віцебску ў кватэры на трэцім паверсе пяціпавярховага жылога дома па вуліцы Церашковай сярод белага дня адбыўся пажар. Выратавальнікі дапамаглі выбрацца з ахопленай агнём кватэры гаспадару, ягонай жонцы і знаёмаму. Яны шпіталізаваныя з атручваннем прадуктамі гарэння. З верхніх паверхаў выратавальнікі эвакуявалі двух чалавек. Мяркуемая прычына пажару — неасцярожна пры курэнні.

У той жа дзень праз некалькі гадзін выратавальнікі выехалі на месца аварыі. У Полацкім раёне ў выніку сутыкнення двух легкавых аўтамабіляў пасажыр адной з машын аказаўся ў «палоне». Выратавальнікі дапамаглі яму выбрацца — дэблакіравалі. Пацярпелы — у бальніцы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НА 1000 МІНЧАН — 1177 МІНЧАНАК

Згодна з вынікамі перапісу насельніцтва Беларусі 2009 года, у яе сталіцы жаночы твар. Мяркуйце самі: перапісчыкі налічылі тады 993 тыс. мінчанак, ці 54,1 % ад агульнай колькасці насельніцтва.

Як паведамілі ў Галоўным статыстычным упраўленні горада Мінска, пасля перапісу насельніцтва 1999 года колькасць жанчын з мінскай прапіскай павялічылася на 11,3 % пры павелічэнні агульнай колькасці сталічнага насельніцтва на 9,3 %.

Пры гэтым узрост сярэднестатыстычнай мінчанкі з 1999 года павялічыўся з 36,9 да 39,7 года ў 2009 годзе.

Колькасць прадстаўніц цудоўнага пола працаздольнага ўзросту склала 61,4 %, старэй за працаздольны — 25,7 % ад агульнай колькасці жанчын. Летась яны складалі 54,1% ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва, занятага на прадпрыемствах і ў арганізацыях сталіцы. У 2009 годзе ў Мінску 16 513 жанчын узялі шлюб. Сярэдні ўзрост мінчанак, якія выйшлі замуж упершыню, склаў 25,2 года, паўторна — 37,8 года.

Віктар КУШНАРОЎ, *«Мінск-Навіны»*.

ЗАГІНУЛІ НЕПРЫШПІЛЕНЫЯ

Аўтааварыя са смяротным зыходам адбылася раніцай 6 кастрычніка ў прыгарадзе Гродна.



Жанчына-кіроўца аўтамабіля «Фальксваген», праехаўшы закругленне дарогі, на хвіровым пакрыцці няправільна абрала хуткасць. Аўтамабіль павяло ўправа. У кювеце ён некалькі разоў перакуліўся, упаў на дах і стукнуўся ў слуп. Кіроўцу і пажылую пасажырку выкінула з салона машыны ў поле. Ад атрыманых траўмаў яны памерлі. Муж пасажыркі з траўмамі шпіталізаваны. Цяжару наступстваў спрыяла тая акалічнасць, што загінулыя не былі прышпіленыя рамянямі бяспекі.

Алег ДУК,
старшы інспектар УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.

ДТЗ З ФУРМАНКАЙ: ДЗВЕ АХВЯРЫ

У вёсцы Зубры Горацкага раёна загінулі жонка і муж. Увечары 4 кастрычніка яны ехалі на фурманцы, якая перакулілася ў кювет і прыціснула ездакоў. На жаль, у момант здарэння навокал нікога не было, а целы 50-гадовага мужчыны і 45-гадовай жанчыны знайшлі толькі на наступную раніцу.

Алена КАЗЛОВА.

АРЫЕНТАЦЫЯ ПА АДЗІНЫМ НУМАРЫ

У горадзе Магілёве з'явіўся адзіны даведачны нумар для мясцовай улады — 142. Па гэтым нумары супрацоўнікі Магілёўскага гарвыканкама дапамогуць чалавеку зарыентавацца ў структуры ўлады. Яму падкажуць, куды трэба звярнуцца для вырашэння канкрэтнага пытання, а таксама ўдакладняць нумары, адрасы, прыёмныя дні і гадзіны чыноўнікаў. Аднак 142 — гэта не «гарачая лінія», куды можна паскардзіцца, а, хутчэй, тэхнічная кансультацыя для заяўніка.

Ул. інф.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

КІРАЎНІК БАНКА «ВТБ 24»: НА ПРАЦЯГУ ТРОХ НАЙБЛІЖЭЙШЫХ ГАДОЎ РАСІЮ ЧАКАЮЦЬ СТАГНАЦЫЯ І СТРАТА КАНКУРЭНЦЫІ

Тэмпы росту эканомікі Расіі ў 2011 годзе могуць замарудзіцца да 3 %, заявіў на інвестыцыйным форуме «Расія кліча!» кіраўнік ВТБ 24 Міхаіл Задорнаў, перадае РІА «Навіны».

«Рост 3 % у год на працягу трох-чатырох найбліжэйшых гадоў у Расіі — вельмі сумная карціна. Па сутнасці — гэта стагнацыя і страта канкурэнцыі з краінамі, якія імкнуцца да мадэрнізацыі», — сказаў ён. Да запаволення тэмпаў эканамічнага росту ў краіне могуць прывесці рост інфляцыі і недастатковая бюджэтная кансалідацыя. Меркаванне Цэнтрабанка пра тое, што «хваля інфляцыі сыдзе праз шэсць—дзевяць месяцаў», Задорнаў назваў «сцэнарыем самазаспакаення».

СЛАВАКІЯ РАШЫЛАСЯ НА ІНВЕСТЫЦЫІ ВА ЎКРАІНСКІЯ ГАЗАПРАВОДЫ

Славакія гатовая падтрымаць рэалізацыю любых праектаў па мадэрнізацыі газаправодаў і нафтаправодаў на Украіне. Такую заяву зрабіў прэзідэнт Славакіі Іван Гашпаровіч па выніках сустрэчы з украінскім калегам Віктарам Януковічам.

Янукovіч, у сваю чаргу, падкрэсліў неабходнасць мадэрнізацыі газатранспартнай сістэмы (ГТС) краіны, «як з пункта гледжання надзейнасці сістэм, так і з пункта гледжання росту аб'ёмаў прапампоўкі газу і нафты». «Славакія — таксама транзітная краіна. Яна з'яўляецца нашым партнёрам, з якім мы гатовыя супрацоўнічаць у гэтай сферы», — перадае словы прэзідэнта Украіны «Ліга».

МВФ СПАЛОХАЎСЯ «ВАЙНЫ ВАЛЮТ»

Дырэктар-распарадчык Міжнароднага валютнага фонду Дамінік Строс-Кан папярэдзіў пра пагрозу «валютнай вайны» паміж найбуйнейшымі эканомікамі свету. Пра гэта піша The Guardian. Паводле яго слоў, у свеце пачынае цыркуляваць ідэя пра тое, што валюты могуць выкарыстоўвацца ў якасці палітычнай зброі.

Строс-Кан дадаў, што такія ідэі ўяўляюць найсур'ёзную рызыку для аднаўлення эканомікі пасля глабальнага крэдытнага крызісу. Нагадаем, на мінулым тыдні міністр фінансаў Бразіліі Гвідо Мантэга папярэдзіў пра магчымы пачатак валютнай вайны. Пад ёй ён меў на ўвазе імкненне кожнай краіны прынізіць курс сваёй валюты да мінімуму.

«НАШЫ» РАЗРЭКЛАМАВАЛІ КАЛЯНДАР З АГОЛЕНЫМІ СТУДЭНТКАМІ МДУ ДЛЯ ПУЦІНА

Студэнткі факультэта журналістыкі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта зрабілі прэм'ер-міністру Уладзіміру Пуціну незвычайны падарунак на дзень нараджэння, якое ён адзначае 7 кастрычніка. У гонар 58-годдзя кіраўніка ўрада дзяўчыны зняліся ў адкрытай фотасесіі і апублікавалі свае здымкі ў календары на 2011 год.

Каляндар быў выдадзены тыражом 50 тысяч асобнікаў і ўжо паступіў у продаж у гандлёвыя цэнтры расійскай сталіцы. На кожнай старонцы календара — па адной фатаграфіі дзяўчыны ў ніжняй бялізне з подпісам, які так ці інакш мае дачыненне да прэм'ера і па двухсэнсоўным змесце ніколькі не саступае малюнку. На адной са старонак напісаны зварот да Пуціна «Уладзімір Уладзіміравіч, лясы патушылі, а я ўсё яшчэ гару!», іншая дзяўчына просіць «пракаціць на «Каліне», трэцяя — «узяць другім пілотам». Дзяўчына лютага пытае: «Як наконт трэцяга разу?» Першай пра гэты каляндар паведаміла прэс-сакратар пракрамлёўскага руху «Нашы» Крысціна Патупчык.

НА СВЯТКАВАННІ 300-ГОДДЗЯ МІНСКАЙ АРХІКАТЭДРЫ КАРДЫНАЛ З РЫМА ПРАМОВІЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

Пасланнік Папы Рымскага, рымскі кардынал Юзаф Томка, які прыбудзе ў Мінск на святкаванне 300-годдзя асвячэння мінскага архікатэдральнага касцёла, сваё казанне падчас урачыстай службы прамовіць па-беларуску. Пра гэта журналістам паведаміў архіепіскап Мінска-Магілёўскі мітрапаліт Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ.

— Гэта была ўласная ініцыятыва кардынала, — гаворыць мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч, — Падчас абмеркавання цэлебрацыі ўрачыстасці мы прапанавалі звычайны ў такіх умовах варыянт: кардынал скіруе свой зварот па-італьянску, а перакладчык перакладзе яго словы на беларускую мову. Але кардынал адразу сказаў, што будзе прамаўляць па-беларуску. Таксама некаторыя часткі службы (падчас вялікіх урачыстасцяў часта выкарыстоўваецца лацінскі варыянт богаслужэння — **І.Л.**) па яго просьбе адбудуцца па-беларуску. Пасланнік Папы хоча, каб вернікі разумелі яго як мага лепш.

Акрамя цэнтральнай службы ў мінскім архікатэдральным касцёле імя Найсвяцейшай Дзевы Марыі, якая адбудзецца 9 кастрычніка, кардынал Юзаф Томка ўзначаліць службу і ў маладзечанскім касцёле св. Юзафа ў нядзелю 10 кастрычніка, прычым таксама з гаміліяй на беларускай мове. Жаданне кардынала прамаўляць сваё казанне па-беларуску Тадэвуш Кандрусевіч называе знакам павагі да Беларусі, каталіцкай царквы і культуры Беларусі ў цэлым. Акрамя таго, паводле слоў Тадэвуша Кандрусевіча, дадаткова адбудзецца спатканне папскага пасланніка Юзафа Томкі з кіраўніком Праваслаўнай Царквы ў Беларусі мітрапалітам Філарэтам.

Ілья ЛАПАТО.

белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «Белагропромбанк» сообщает об изменении с 11 октября 2010 года процентных ставок по договорам срочного банковского вклада (депозита)

«Время денег!»

С 11 октября 2010 года размер процентных ставок по вновь заключаемым договорам срочного банковского вклада (депозита) «Время денег!» составит:

Период хранения	Для вкладов в, % годовых		
	белорусских рублях	долларах США и евро	российских рублях[1]
с 1 по 95 день	14,5	4	5
с 96 по 190 день	15,5	6	7
с 191 по 285 день	16,5	8	9
с 286 по 380 день	17,5	9	11

[1]К договорам срочного банковского вклада (депозита), заключенным до 11.10.2010, данный размер процентных ставок применяется с 11.11.2010.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

10 МЛН ДОЛАРАЎ ЗА 10 ГАДОЎ

Ідэя стварэння беларускага партала TUT.BY прагучала 5 кастрычніка 2000 года на інтэрнэт-форуме газеты «Компьютерные вести».TUT.BY адзначыў сваё дзесяцігоддзе. Сёння яго кошт ацэньваецца ў 10 млн долараў і нават больш. Партал пастаянна развіваецца. З'яўляюцца новыя сэрвісы. І расці ёсць куды, лічыць кіраўніцтва УП «Надзейныя праграмы», якое з'яўляецца заснавальнікам партала TUT.BY.

Напрыклад, раздзел «Фінансы» пачынаўся з курсаў валют. А сёння, па словах кіраўніка праекта FINANCE.TUT.BY Віталя Лапцёнка, у яго 20 тысяч наведванняў у дзень. Палова аўдыторыі — людзі старэйшыя за 25 гадоў. Яно і не дзіўна. Тут можна знайсці амаль любую інфармацыю на эканамічную тэматыку і нават, пры наяўнасці банкаўскай карткі, аплаціць камунальныя паслугі без камісіі.

Зразумела, што і ўвесь беларускі сегмент інтэрнэту не стаіць на месцы. 10 гадоў таму, калі з'явіўся TUT.BY, у Байнэце налічвалася каля 500 сайтаў, а сёння іх ужо тысяч 60—70. Толькі ў даменнай зоне by зарэгістравана каля 35 тысяч сайтаў. Дакладная ж колькасць карыстальнікаў інтэрнэту ў Беларусі невядомая, але эксперты лічаць, што яна складае 3-4 млн.

Ірына ТАМКОВІЧ.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению Минского райпо (продавец) проводит открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества:

Лот № 1: здание магазина (инв. № 600/С-105006), об. пл. 128,5 кв.м, расположенного по адресу: Минский р-н, Крупицкий с/с, д. Закружка. *Начальная цена с НДС – 99 600 000 бел. рублей.* Площадь земельного участка – 0,1217 га.

Лот № 2: здание магазина (инв. № 600/С-104995), об. пл. 94,2 кв.м, Минский р-н, Самохваловичский с/с, д. Углы. *Начальная цена с НДС – 67 200 000 бел. руб.* Площадь земельного участка – 0,0571 га.

Лот № 3: здание магазина (инв. № 600/С-114085), об. пл. 94,1 кв.м, Минский р-н, Крупицкий с/с, д. Дубинки. *Начальная цена с НДС – 63 600 000 бел. рублей.* Площадь земельного участка – 0,0514 га.

Лот № 4: здание магазина «Хозтовары» (инв. № 600/С-55695), об. пл. 187,0 кв.м, Минский р-н, Ждановичский с/с, д. Ждановичи. *Начальная цена с НДС – 273 600 000 бел. руб.* Площадь земельного участка – 0,0773 га.

Задаток 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 15 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, **если иное не предусмотрено договором купли-продажи.**

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **09.11.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 08.11.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.10.2010 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▼1 долар ЗША	2 995,00	1 чэшская крона	169,34	USD	29,8929
▲1 еўра	4 152,87	1 польскі злоты	1053,87	10 UAH	37,6295
1 латвійскі лат	5 851,32	▲1 расійскі рубель	100,19	1000 BYR	9,9444
1 літоўскі літ	1 201,89	1 украінская грыўня	376,90	EUR	41,4017

Агенцтва Уладзіміра Грыцкова

У БЕЛАРУСІ РАСПРАЦАВАНА ДЗЯРЖПРАГРАМА РАЗВІЦЦЯ КУРОРТНАЙ ЗОНЫ НАРАЧАНСКАГА РЭГІЁНА НА 2011—2015 ГАДЫ

Адпаведны ўказ № 514 Прэзідэнт Беларусі падпісаў 30 верасня.

Праграма распрацавана ў мэтах павышэння эфектыўнасці выкарыстання ўнікальнага прыродна-рэсурснага патэнцыялу Нарачанскага краю, вырашэння шэрагу сацыяльна-эканамічных і экалагічных пытанняў, якія ўзніклі ў апошнія гады на тэрыторыі рэгіёна.

Галоўная задача дзяржпраграмы — стварэнне на базе курортнай зоны Нарач буйнейшага аздараўленчага, культурна-забаўляльнага і турыстычнага цэнтра рэспублікі, які зможа паспяхова канкурыраваць з вядомымі замежнымі курортамі. У мэтах фарміравання спрыяльнага клімату для развіцця прыватнага бізнэсу для суб'ектаў гаспадарання, якія рэалізуюць інвестыцыйныя праекты ў Нарачанскім краі, гэтым указам уводзіцца пяцігадовы мараторый на выплату падатку на нерухомую маёмасць, падатку на прыбытак, зямельнага падатку. Таксама названыя суб'екты вызваляюцца ад адлічэнняў у інавацыйны фонд Мінскага аблвыканкама і Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, ад выплаты сродкаў, якія спаганяюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі пры выдачы дазвольнай дакументацыі на будаўніцтва і (або) рэканструкцыю аб'ектаў, і платы за права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў.

Вялікае значэнне надаецца знешняму выгляду курортнага пасёлка Нарач і цэнтральнай частцы курортнай зоны, а таксама стварэнню спрыяльнага асяроддзя для лячэння, адпачынку і турызму. Акрамя традыцыйнай тэрыторыі курортнай зоны ў межах Мядзельскага раёна будзе выдзелена лакальная тэрытарыяльная зона г.п. Крывічы — в. Будслаў плошчай 10,1 тыс. га для развіцця сферы аздараўлення, адпачынку і турызму.

У мэтах развіцця інфраструктуры рэгіёна будзе праведзена рэканструкцыя здраўніц, гасцініц, культурна-забаўляльных аб'ектаў, прадпрыемстваў гандлю і харчавання. Прадугледжваецца таксама стварэнне інфраструктуры для развіцця аграэкалагічнага, культурна-пазнавальнага, воднага, спартыўнага, аздараўленчага і іншых відаў турызму (добраўпарадкаванне шэрагу турыстычных маршрутаў, абсталяванне экалагічнай сцежкі і экспазіцыйных аб'ектаў у прыродным комплексе «Блакітныя азёры»). Важным момантам з'яўляецца ўключэнне ў сістэму турызму гісторыка-культурных аб'ектаў гэтага рэгіёна. Акрамя таго, для забеспячэння транспартнай даступнасці рэгіёна плануецца стварэнне хуткаснай аўтамабільнай трасы, якая будзе адпавядаць міжнародным стандартам, а таксама вырашэнне пытання аб арганізацыі «зялёнага калідора» для замежных турыстаў. Гэты ўказ уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста Беларусі Юрыя Траяна з 60-годдзем

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў галоўнага балетмайстра Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі народнага артыста Беларусі Юрыя Траяна з 60-годдзем.

«Вы неразрыўна звязалі сваё жыццё з адным з самых прыгожых відаў мастацтва. Высокі прафесіяналізм, працавітасць, тонкае пачуццё гармоніі і нястомны творчы пошук далі вам магчымасць стварыць незабыўныя вобразы ў спектаклях Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, якія ўвайшлі ў залаты фонд сусветнай харэаграфіі», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПАСТАНОВЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аб прызнанні паўнамоцтваў члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання Ладуцькі М.А.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Прызнаць паўнамоцтвы члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання Ладуцькі Мікалая Аляксандравіча, назначанага Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 19 ліпеня 2010 года.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУБІНАЎ

4 кастрычніка 2010 года, г. Мінск.

№ 304 — СР4/V

Аб дачы згоды на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь суддзёй Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь Курылы В.А.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

У адпаведнасці з пунктам 2 часткі першай артыкула 98 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь даць згоду на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь суддзёй Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь Курылы Віктара Аляксандравіча.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУБІНАЎ

4 кастрычніка 2010 года, г. Мінск.

№ 306 — СР4/V

Аб дачы згоды на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь суддзёй Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь Сарнаўскай Н.М.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

У адпаведнасці з пунктам 2 часткі першай артыкула 98 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь даць згоду на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь суддзёй Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь Сарнаўскай Наталлі Мікалаеўны.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУБІНАЎ

4 кастрычніка 2010 года, г. Мінск.

№ 307 — СР4/V

Аб дачы згоды на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь членам Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Дубкова С.В.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

У адпаведнасці з пунктам 2 часткі першай артыкула 98 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь даць згоду на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь членам Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Дубкова Сяргея Вітальевіча.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУБІНАЎ

4 кастрычніка 2010 года, г. Мінск.

№ 308 — СР4/V

Аб дачы згоды на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь членам Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Палонскага В.У.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

У адпаведнасці з пунктам 2 часткі першай артыкула 98 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь даць згоду на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь членам Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Палонскага Васіля Уладзіміравіча.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУБІНАЎ

4 кастрычніка 2010 года, г. Мінск.

№ 309 — СР4/V

Аб зацвярджэнні намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Зацвердзіць намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ладуцьку Мікалая Аляксандравіча.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУБІНАЎ

4 кастрычніка 2010 года, г. Мінск.

№ 318 — СР4/V

НЕ СПРАВІЎСЯ З КІРАВАННЕМ У 82 ГАДЫ

прыватным трактарам «Т-25» 82-гадовы жыхар вёскі Махновічы Мазырскага раёна. Як паведамляе прэс-служба УУС Гомельскага аблвыканкама, пенсіянер з'ехаў у меліярацыйную канаву і разам з машынай зваліўся ў ваду. Пажылы мужчына загінуў на месцы здарэння.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ДЗЕЦІ І ШКЛО

Неасцярожныя дзіцячыя гульні на школьным перапынку прывялі да сур'ёзнай траўмы. У Касцюковіцкую цэнтральную раённую бальніцу з пранікальным раненнем грудзей шпіталізаваны вучань 11 класа са школы ў вёсцы Мурын Бор. Высветлілася, што падлетак з размаху наляцеў на аконнае шкло, упаў і параніўся. Ён атрымаў неабходную медыцынскую дапамогу, і ўрачы ацэньваюць стан хлопца як стабільны.

Алена КАЗЛОВА.

19 октября 2010 года в 12.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. Выборы членов совета директоров.
2. О материальном вознаграждении членов совета директоров.
3. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Базановой, 19.

Начало регистрации участников собрания: 12.00.

УНП 200050191

У МІНСКУ АДЗНАЧАЮЦЬ, ШТО ПАЧАСЦІЛІСЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ПРАВАКАЦЫІ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА БЕЛАРУСІ І ЯЕ КІРАЎНІЦТВА

Заявы пра тое, што нібыта Беларусь згорне свой удзел у інтэграцыйных праектах на постсавецкай прасторы ў выпадку непрызнання Расіяй прэзідэнцкіх выбараў, што з'явіліся ў некаторых расійскіх СМІ, з'яўляюцца «дэзынфармацыяй і брудная правакацыяй», — заявіў агенцтву «Інтэрфакс-Захад» кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей.

«Гэта чарговая ў дачыненні да Беларусі правакацыя, яны, на жаль, пачасціліся ў апошні час», — адзначыў кіраўнік прэзідэнцкай адміністрацыі.

Як заявіў У. Макей, «толькі хворае ўяўленне аўтараў наспех згатаванай інфармацыйнай «вуткі» магло ўявіць магчымасць з'яўлення якіх-небудзь ультыматыўных заяў Прэзідэнта Беларусі з нагоды выхаду рэспублікі з любых інтэграцыйных працэсаў». Зусім відавочна, што Аляксандр Лукашэнка ў прынцыпе не мог ніколі гэтага заяўляць. Тым больш у гэтыя дні на нейкіх «закрытых» нарадах, калі ён знаходзіцца з рабочым візітам у Турцыі, дзе абмяркоўвае пытанні развіцця двухбаковых палітычных, гандлёва-эканамічных адносінаў паміж краінамі», — сказаў У. Макей.

Ён выказаў сумненне ў тым, «што дэзынфармацыя, якая з'явілася ў СМІ, выходзіць па ўказанні вышэйшага кіраўніцтва Расіі». «Хутчэй за ўсё, гэта чарговая мядзведжая паслуга далёкіх ад рэальнай аналітыкі паркетных пісакаў і падобных на іх палітолагаў, якія ў сілу свайго інтэлекту і «дасведчанасці» не ў стане прыдумаць колькі-небудзь праўдападобную «вутку» і хоць бы як мінімум азнаёміцца з выказваннямі Прэзідэнта Беларусі па гэтай тэме», — заявіў У. Макей.

На прэс-канферэнцыі для расійскіх рэгіянальных журналістаў на мінулым тыдні А. Лукашэнка, скептычна ацаніўшы перспектывы развіцця Мытнага саюза, тым не менш пацвердзіў удзел Беларусі ў гэтым праекце. «Я не ведаю, што будзе ў нас з гэтым Мытным саюзам. Пакуль апладысментаў з нашага боку няма, але мы не збіраемся ламаць любы накірунак інтэграцыі — толькі б зачапіцца за нешта, і не разваліцца і не разысціся канчаткова», — сказаў А. Лукашэнка.

ЧЛЕНЫ РГА «БЕЛАЯ РУСЬ» АДДАЛІ БОЛЬШ ЯК 100 ТЫС. ПОДПІСАЎ У ПАДТРЫМКУ ВЫЛУЧЭННЯ КАНДЫДАТАМ У ПРЭЗІДЭНТЫ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ

Члены Эспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» аддалі больш як 100 тыс. подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатам у прэзідэнты Аляксандра Лукашэнкі. Аб гэтым расказаў БЕЛТА кіраўнік ініцыятыўнай групы па вылучэнні Аляксандра Лукашэнкі кандыдатам у прэзідэнты Аляксандр Радзькоў.

На гэтым удзел ініцыятыўнай групы ў пікетах і збор подпісаў не будзе завершаны. Плануецца і далей прадоўжыць гэту работу, а падпісныя лісты здаць у выбарчыя камісіі, як і належыць, да 29 кастрычніка. «Любы можа пацвердзіць подпісам сваё жаданне бачыць на выбарах у якасці кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнку», — адзначыў Аляксандр Радзькоў. Аддаваць галасы ў падтрымку той ці іншай асобы, якая жадае балаціравацца на выбарах, могуць толькі грамадзяне, старэйшыя за 18 гадоў. Пры гэтым кожны выбаршчык мае права паставіць подпіс у падтрымку некалькіх кандыдатур, але толькі адзін раз у падтрымку адной і той жа кандыдатуры. Кандыдатам у прэзідэнты становіцца чалавек, якога падтрымалі не менш як 100 тыс. выбаршчыкаў.

МІСІЯ НАГЛЯДАЛЬНІКАЎ СНД ПАЧНЕ НАЗІРАННЕ ЗА ВЫБАРАМІ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ З 20 КАСТРЫЧНІКА

Аб гэтым заявіў кіраўнік місіі назіральнікаў СНД Сяргей Лебедзеў учора, атрымліваючы першае пасведчанне міжнароднага назіральніка ў Цэнтрвыбаркаме Беларусі, перадае БЕЛТА.

Сяргей Лебедзеў адзначыў, што беларускія выбаршчыкі могуць быць упэўнены ў аб'ектыўнасці ацэнкі, якую місія наглядальнікаў СНД дасць маючым адбыцца прэзідэнцкім выбарам. «Місія наглядальнікаў СНД заўсёды кіравалася і будзе кіравацца прынцыпамі аб'ектыўнасці, добразычлівага падыходу, неўмяшання ва ўнутраныя справы (дзяржавы, дзе праходзяць выбары. — **Заўвага БЕЛТА**)», — падкрэсліў ён. Сяргей Лебедзеў адзначыў, што ўжо ўзначальваў місію наглядальнікаў СНД у час парламенцкіх выбараў у Беларусі і бачыў, як была арганізавана выбарчая кампанія. Паводле яго слоў, намаганні ўлад заўсёды былі накіраваны на тое, каб арганізаваць выбары адкрыта і гарантаваць свабоднае волевыяўленне грамадзян. Кіраўніку місіі СНД вядома, што за апошні час выбарчае заканадаўства Беларусі было дэмакратызавана. У сувязі з гэтым ён разлічвае, што ў час маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбараў будзе высокі ўзровень арганізацыі, заўсёды характэрны для Беларусі.

Абзац

Як папярэджваюць сіноптыкі, у пачатку наступнага тыдня межаў нашай краіны дасягне хваля халоднага паветра з Нарвежскага мора. У многіх раёнах пройдуць ападкі, прычым дождж можа чаргавацца з мокрым снегам. Тэмпература паветра да сярэдзіны наступнага тыдня ноччу будзе ад 0 да мінус 5, а дзённая не перавысіць 1—6 цяпла. Сярэднясутачная тэмпература наблізіцца да нулявой адзнакі.

Псіхолагі будуць вучыць кантралёраў размаўляць. Мінсктранс заявіў пра павелічэнне колькасці кантралёраў у грамадскім транспарце. Да канца года іх штат павялічыцца ўдвая і складзе 208 чалавек. Навучыць размаўляць кантралёраў з безбілетнікамі бяруцца псіхолагі: будуць арганізаваныя спецыяльныя трэнінгі, дзякуючы якім рэвізоры стануць стрэсаўстойлівымі і камунікабельнымі. Як мяркуюць спецыялісты, штрафы за безбілетны праезд з лішкам пакрыюць усе затраты.

Мінчанка падазраецца ў сутэнёрстве і арганізацыі бардэляў. Мінская міліцыя затрымала сутэнёршу, якая мяркуецца, кантралявала раён плошчы Перамогі. Праваахоўныя органы ўжо ўстанавілі, што 43-гадовая мінчанка «страхавала» 10 прастытутак, аднак аператыўнікі ўпэўненыя, што іх было намнога больш. Жанчына раней прыцягвалася да крымінальнай адказнасці за аналагічнае злачынства.

У грамадзяніна Беларусі ў Рызе з аўтамабіля скралі сумку. У ёй было 7 тысяч еўра і 1,5 млн беларускіх рублёў. Па словах паліцыі, пацярпелы пакінуў аўтамабіль каля аўтарынка. Калі ён вярнуўся, у аўтамашыны было праколатае кола. Беларус адправіўся ў бліжэйшы аўтасэрвіс. Мужчына зайшоў з працаўніком сэрвісу ва ўнутраныя памяшканні, а калі вярнуўся, то ўбачыў, што з машыны скралі сумку. Паліцыя мяркуе, што шына была праколатая менавіта дзеля крадзяжу сумкі з салона аўтамабіля.

Цэрэтэлі заявіў пра намер паставіць помнік Лужкову. Вядомы скульптар Зураб Цэрэтэлі паведаміў, што ў Маскве будзе стаяць помнік былому мэру расійскай сталіцы Юрыю Лужкову. У інтэрв'ю Бі-бі-сі ён заявіў, што калі манумент экс-начальніку горада не будзе ўстаноўлены, то ён паставіць яго сам.

Поўны абзац

У сталіцы Харватыі адкрыўся музей нешчаслівага кахання. Ён закліканы дапамагчы тым, чые пачуцці памерлі. Ідэя стварэння музея належыць мастаку і мастачцы, якія расталіся 4 гады таму. Адразу пасля разрыву яны вырашылі сабраць рэчы, якія нагадвалі ім пра згаслыя пачуцці. А абвестку пра музей яны размясцілі ў інтэрнэце — і з усяго свету пачалі прысылаць экспанаты. Зараз у калекцыі — больш за 600 экспанатаў. Самыя папулярныя — любоўныя пісьмы, мяккія цацкі. Ёсць тут і вясельная сукенка, веласіпед, жоўты матаролер, на якім закаханыя збіраліся паехаць у рамантычнае падарожжа. Як лічаць мастакі, іх музей аказвае на людзей тэрапеўтычнае ўздзеянне, лечыць іх душэўныя раны. Бо першы крок да лекавання разбітага сэрца — пазбаўленне ад таго, што нагадвае пра былыя пачуцці.

Праваахоўным органам Сімферопаля ніяк не ўдавалася злавіць прафесійнага злодзея, які арудаваў у горадзе. Але аднойчы ўмяшаўся яго вялікасць выпадак — злодзея, Сяргея Т., падвялі яго цёплыя бацькоўскія пачуцці. У яго ёсць маленькі і вельмі любімы сын. Сяргей вырашыў апрануць яго з іголачкі, каб усе бачылі, які ў хлопчыка клапатлівы тата. Пачаў з абутку. Узяў лісток паперы, абвёў сынаву ножку алоўкам і з гэтым узорам паехаў на рынак. Там купіў шыкоўныя, але вельмі дарагія боцікі, таму пакупка была пакінутая дома, а мужчына адправіўся на чарговую справу. Як заўсёды, усё прайшло гладка, слядоў не засталося. Акрамя паперкі з адбіткам маленькай ножкі. Яе і заўважылі аператыўнікі Чыгуначнага РАУС горада, калі прыехалі па выкліку гаспадароў. Пацярпелыя паняцця не мелі, што гэта за лісток. Усё стала зразумелым, калі паперку перавярнулі — гэта аказалася даведка, выдадзеная Сяргею год таму па месцы былой працы, на Прыдняпроўскай чыгункі. Усё астатняе было справай тэхнікі...

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

КВАТЭРНЫЯ АДКАЗЫ

Дыскусійная трыбуна

Праект новага Жыллёвага кодэкса будзе разгледжаны народнымі абраннікамі на восеньскай сесіі

Павышаная камфортнасць

Дамы тэрыторыяй больш за 200 квадратных метраў, абсталяваныя каналізацыяй, водаправодам ды іншымі дабротамі, патрапілі ў разрад — так і хочацца сказаць раскошных — дамоў павышанай камфортнасці. Іх уладальнікам давядзецца аплачваць камунальныя паслугі па сабекошце. Здавалася б, усё справядліва. Амаль па-робінгудаўску: адбяром грошы ў багатых і аддадзім бедным. «Панабудавалі сабе харомы, няхай расплачваюцца цяпер!» — можа ў праведным гневе ўсклікнуць чытач. Аднак напрасправуйце ўявіць сабе не ваяўнічую цытадэль пад Мінскам з гаражом на 12 машын, джакузі, кіна- ды більярднай залай, а дыхтоўны сельскі дом у глыбінцы, дзе ўсе даброты цывілізацыі (у выглядзе каналізацыі, напрыклад, ці воднай свідравіны) зробленыя ўмелымі рукамі руплівага гаспадара. Які ўсё жыццё паклаў, «каб жыць як чалавек». І цяпер на старасці год... яго, выхадзіць, раскулачаць? Як быць з такімі «заможнымі» небаракамі, пацікавілася карэспандэнт «Звязды», прапанаваўшы ад сябе вылучыць нейкі «ліміт» заможнасці... Ну насамрэч, як адзіноці пенсіянер зможа выплачваць гэты падатак на багацце?!

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 6 кастрычніка.)

— Рэальныя прыбыткі цяжка ўстанавіць: бывае, што грамадзянін афіцыйна не працуе, але прыбытку ён атрымлівае ў тры разы больш, чым мы з вамі, — мяркуе **Наталля КАЧАН, начальнік упраўлення юрыдычнай работы і кадраў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі**.

Аднак я, напрыклад, далёкая ад думкі, што адзінокія састарэлыя могуць аказацца падпольнымі Карэйкамі. Застаецца шанц на атрыманне дапамогі. Паводле Указа аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе, можна звяртацца па дапамогу на аплату камунальных паслуг, канстатуе Наталля Качан. Аднак наўрад ці разавай дапамогі хопіць на павышаны «заможны» тарыф...

— Як гэта, у катэджы жывеш, і бедны? — дзівіцца Наталля Качан.

Маўляў, ніхто не змушае жыць у раскошы. Заўжды можна пераехаць у больш сціплае месца. Варыянт аналагічны сітуацыі са звычайнымі (незаможнымі) неплацельшчыкамі. Дарэчы, сярод іх, паводле слоў спадарыні Качан, нямшмат прадстаўнікоў сацыяльна неабароненых катэгорый — пенсіянераў, напрыклад, толькі тры адсоткі. Аднак наколькі б мізэрнай ні была доля гэтых незаможных «заможных», іх цяжкасці ад гэтага не зменшацца... І цяжка нават уявіць, як чалавеку сталага веку пакінуць родныя мясціны, дзе прайшло ўсё яго жыццё. Толькі таму, што ўзведзены яго ўласнымі рукамі дом стаў домам павышанай камфортнасці...

Дыскусію падхопліваюць калегі, працягваюць іншыя ўдзельнікі сустрэчы. І вось мы ўжо чуем, што «з цягам часу 100 адсоткаў за камунальныя паслугі будуць плаціць усе» (нагадаем, што зараз звычайныя, незаможныя, грамадзяне аплачваюць прыкладна трэць). Засталося толькі спадзявацца, што заробкі нашы таксама паспеюць да гэтага часу падняцца...

Тым часам «варта мяняць псіхалогію жыхароў», падаецца намесніку старшыні пастаяннай камісіі палаты прадстаўнікоў Уладзіміру МІХАСЁВУ. Ён упэўнены, што «ў будучым Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі павінна выконваць функцыі каардынацыі, а ўсё астатняе нам неабходна пачаць арганізоўваць сваімі рукамі». Народны абраннік праводзіць аналогію з аўтамабілем. Маўляў, «машыну вам дзяржава адрамантаваць не дапамагае, чаму з жыллём павінна быць па-іншаму?». Магчыма, таму што парадак у сваёй машыне, як і беспарадак, аўтаўладальнік стварае сам, без «дапамогі» жыхароў свайго пад'езда і ўсіх блізкіх... Пастаянна кажуць пра таварыствы, а мне пакуль вельмі цяжка ўявіць усіх алкаголікаў і дармаедаў (яны ёсць у кожным двары), якія будуць добраахвотна скідвацца на добраўпарадкаванне пад'езда. Затое не складае цяжкасці ўявіць, як нехта будзе паскудзіць і крышыць тое, на што выдаткавалі астатнія...

Карацей, да чаго абавяжуць жыхароў новым Жыллёвым кодэксам, мы ўжо больш-менш уцямілі, а вось...

...да чаго абавяжуць камунальшчыкаў?

- Падрабязна распісваць у жыроўцы, на што ідуць нашы грошы.
- Дастаўляць жыроўку не пазней за 15 чысло кожнага месяца (з тым, каб у нас быў час разлічыцца да 25-га).
- Адключаць гарачую ваду не даўжэй, чым на два тыдні.
- Пра графік капрамонту інфармаваць загадзя... каб вокны не давялося пасля вырываць!

Як расказала Наталля Качан, грамадзяне, што патраціліся на шклопакеты, а пасля даведаліся пра капрамонт (ён прадугледжвае бясплатную замену вокнаў) на што толькі не ішлі, каб «страсці» з дзяржавы вокны — нават дэманціравалі пастаўленыя. Эх, чаго не зробіць наш чалавек дзеля так званай «халявы», на якую сам і адлічае штомесяц...

Нават адназначныя адказы на жыллёвыя пытанні нясуць неадназначнае ўздзеянне. Агульны пазітыўны эфект перакрывае асобныя негатыўныя перагібы? Адказ, як водзіцца, неадназначны. Але час на дыскусію яшчэ застаецца...

Ала МАЧАЛАВА.

АДНЫ МІЛІЦЫІ ДАВЯРАЮЦЬ, ДРУГІЯ ПРАВЯРАЮЦЬ

Грамадскае меркаванне

ДАЎНЫМ-ДАЎНО аднаго майго знаёмага добра пабіў прадстаўнік органаў аховы правапарадку. Не памятаю ўжо дакладна, у чым там была справа, і што прымусіла чалавека ў форме падняць руку хоць і на п'янага, але абсалютна не агрэсіўнага грамадзяніна... Тым не менш факт меў месца. Было і трывіяльнае вырашэнне сітуацыі — міліцыянер адкупіўся. Думаю, у любой сферы дзейнасці могуць трапляцца несумленныя людзі. Аднак вельмі важна, каб далёка не кожны з нас ведаў падобныя прыклады, а ў выпадку іх выяўлення вінаватыя абавязкова атрымлівалі па заслугах.

Паводле леташніх звестак, сабраных аддзелам маніторынгу галоўнага арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення МУС, поўнасцю давяраюць органам унутраных спраў каля 37 працэнтаў насельніцтва. Падобная ацэнка праводзіцца на працягу літаральна гадоў пяці. Апошнім часам назіраецца тэндэнцыя да зніжэння ступені даверу насельніцтва. Загадчык кафедры псіхалогіі і педагогікі Акадэміі МУС Аляксандр ПАСТУШЭНЯ кажа, што меркаванне грамадства адносна такіх «рэчаў», як давер органам унутраных спраў, фарміруецца на падставе не толькі непасрэднага вопыту, але цэлага шэрагу суб'ектыўных прычын. Заўважана, што звычайна грамадства дзеліцца ў такіх сітуацыях на тры прыкладна роўныя часткі: адна трэць настроеная пазітыўна, другая трэць — негатыўна і яшчэ трэць — у сумненнях.

Намеснік начальніка ўпраўлення Генеральнай пракуратуры Ігар СЯЎРУК сцвярджае, што праблемы ў самой праваахоўнай сістэме няма. Іншая рэч — «факты, якія носяць адзінкавы характар». І кожны такі факт сур'ёзна разбіраецца. Летась у пракуратуру ад грамадзян паступіла звыш 200 зваротаў, звязаных з прымяненнем незаконных метадаў дазнання і следства, аднак у выніку аб'ектыўным быў прызнаны толькі адзін факт. З 61 звароту, што паступіў на працягу шасці месяцаў гэтага года, абгрунтаваным быў прызнаны таксама толькі адзін факт.

Наогул у МУС штогод паступае каля 5 тысяч скаргаў на дзеянні супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Пацвярджаецца з гэтай колькасці не больш за 1 працэнт. «Намнога больш мы выяўляем самі падчас службовых, ініцыяваных нашай службай, праверак, — тлумачыць намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення ўласнай бяспекі МУС Аляксей ЮСТУС. — З сотні ўчыненых у гэтым годзе работнікамі міністэрства злачынстваў 80 працэнтаў выявіла наша служба. У асноўным размова ідзе пра злачынствы супраць інтарэсаў службы — перавышэнне службовых паўнамоцтваў, службовы падлог, халатнасць...».

На думку спадара Юстуса, нельга гаварыць пра зніжэнне ўзроўню даверу. Іншая справа, праваахоўныя органы — органы карныя, і наўрад ці пакараная штрафам асоба застанецца ў выніку ўдзячнай. Сцвярджаецца, што ўзровень самакантролю ў сучасных прадстаўнікоў праваахоўных органаў значна вышэйшы, чым быў яшчэ некалькі гадоў таму. Цяпер веды міліцыянераў маюць добры юрыдычны падмурак. За работай ДАІ, напрыклад, праводзіцца тайны нагляд, у выніку якога могуць звальняцца тыя, хто не прыцягнуў вінаватых да адказнасці. З другога боку, у ДАІ наогул да праблемы з хабарніцтвам падышлі комплексна: да адказнасці прыцягваецца і той, хто ўзяў хабар, і той, хто яго даў.

Паводле «ўнутраных» апытанняў, усе супрацоўнікі МУС пераканаўся, што калі яны здзейсняць злачынства, то рана ці позна яно абавязкова будзе выяўлена. Усё таму, што працэс падрыхтоўкі кадраў зараз таксама не такі, як раней. На спецыяльных псіхалагічных трэнінгах у Акадэміі вядуцца, напрыклад, размовы па тэме «дастойна — не дастойна паводзін міліцыянера».

Асноўныя функцыі прадстаўнікоў аховы правапарадку зводзяцца, як вядома, да кантролю за гэтым самым парадкам, прыцягненнем да адказнасці яго парушальнікаў і аказанню дапамогі грамадзянам. Паводле слоў старшыні праваахоўнай грамадскай арганізацыі «Беларускі Хельсінкскі камітэт» Алега ГУЛАКА, аналіз скаргаў, якія паступаюць ад грамадзян на адрас МУС, паказвае, што сапраўды нярэдка размова ідзе аб «прафесійных скаржніках», аднак у шэрагу выпадкаў «мы бачым, што дыму без агню не бывае... Здараецца, што на першым месцы аказваецца абарона гонару мундзіра, а не інтарэсаў грамадзян».

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПЫТАННЕ АБ ПАВЕЛІЧЭННІ ПЕНСІЙНАГА ЎЗРОСТУ Ў ЛІТВЕ АДКЛАДЗЕНА ДА ВЯСНЫ

Праект кіруючых кансерватараў аб павелічэнні пенсійнага ўзросту ў Літве да 65 гадоў часова адкладзены з-за адсутнасці кансэнсусу з апазіцыяй у парламенце, паведамляе БЕЛТА.

Літоўскія кіруючыя прапанавалі пачаць паступовае павелічэнне пенсійнага ўзросту ўжо з наступнага, 2011 года, штогод прыбаўляючы да пенсійнага ўзросту па 2-3 месяцы, каб да 2026 года ўсе людзі ў Літве выходзілі на пенсію ў 65 гадоў.

Пакуль у Літве ўзрост выхаду на пенсію для жанчын складае 60 гадоў, для мужчын — 62 гады і 6 месяцаў. Пры гэтым ён адзін з самых нізкіх у Еўрасаюзе, бо ў большасці краін — старажылаў ЕС гэты паказчык складае 64—67 гадоў. Аднак паводле даных Дэпартамента статыстыкі, у Літве працягласць жыцця жанчын на 11,3 года больш, чым у мужчын, і гэта самая вялікая розніца ў Еўрасаюзе. Паводле даных за 2008 год, сярэдняя працягласць жыцця жанчын у Літве была 77,6, а мужчын 66,3 года, у той час як у ЕС у сярэднім жанчыны жывуць да 82, а мужчыны — да 75,8 года.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ И ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ОБСЛУЖИВАНИЯ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Лот № 1 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальные строения инв. № 430/С-19812, инв. № 430/С-19813, инв. № 430/С-19814, инв. № 430/С-19833, инв. № 430/С-19834, инв. № 430/С-19836, инв. № 430/С-27800, инв. № 430/С-27798, инв. № 430/С-27799, инв. № 430/С-19837, инв. № 430/С-19838, инв. № 430/С-19912, многолетние насаждения, расположенные по адресу: Гродненская обл., Новогрудский р-н, вблизи г. Новогрудка, военный городок № 3, и право заключения договора аренды земельного участка площадью 3,5702 га сроком на 50 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 1 002 173 245 руб., сумма задатка – 100 217 000 руб.
	Продавец недвижимого имущества: Государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных Сил»
Лот № 2 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальные строения инв. № 440/С-9569, инв. № 440/С-9570, инв. № 440/С-9571, инв. № 440/С-9572, инв. № 440/С-9573, инв. № 440/С-9574, инв. № 440/С-9575, расположенные по адресу: Гродненская обл., г. Ошмяны, ул. Советская, д. 201, и право заключения договора аренды земельного участка площадью 1,0676 га сроком на 50 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 240 898 527 руб., сумма задатка – 24 089 000 руб.
	Продавец недвижимого имущества: Республиканское унитарное предприятие автомобильных дорог «Гродноавтодор»

Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82; www.region.grodno.by, www.gki.gov.by

1. Аукцион состоится **21 октября 2010 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

7 кастрычніка 2010 г. № 34 (228)

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

ЦЁПЛЫ ПРЫЁМ

Народны абраннік у разуменні Піліпа Богуша — той, хто і выслухае, і растлумачыць, і дапаможа, і прымірыць

Прыёмы ў дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Піліпа БОГУША, нягледзячы на цёплы прыём, аншлагаў звычайна не збіраюць. І для сябе народны абраннік расшыфроўвае такі сігнал адназначна: значыць, сур'ёзных, сапраўды глабальных праблем у акрузе няма.

— А можа на дэпутата проста не спадзяюцца? — правакую я суразмоўцу, каб выклікаць на дыскусію.

— Ды што вы, наадварот, да дэпутата людзі ідуць з большай ахвотай і больш шчыра расказваюць пра сваю праблему. Як народнаму абранніку. І ведаеце, гэта ж не проста прыгожая назва, а насамрэч так. Роля адначасова і вельмі пачэсная, і вельмі адказная. Часам дзеляцца настолькі асабістым... Днямі вось жанчына прыходзіла з вачамі, поўнымі слёз: муж, кажа, да другой сышоў! Ну што ты будзеш рабіць? Не варажбой жа займацца! *(Смяецца)*. Даведаўся, што працуюць яны на адным прадпрыемстве. Кіраўніка папрасіў паспрабаваць іх прымірыць. А калі не, дык трэба ўсё па-людску зрабіць — скасаваць шлюб, падзяліць маёмасць, аформіць аліменты. Жонку, напэўна, я зразумею, турбуе менавіта матэрыяльны аспект.

— О, дык вы хутка зможаце аб'явы пра прыём даваць накшталт «Вяртаю мужоў!» — вось калі аншлагі пачнуцца! Калі вам такое пад сілу, то ўсе жыллёва-камунальныя нелады, з якімі часцей за ўсё звяртаюцца выбаршчыкі, нагул на раз-два, відаць, вырашаеце?

— Бытавых пытанняў сапраўды абсалютная большасць. І часам, калі пачынаеш унікаць, разбірацца ў справе, становіцца незразумела, чаму такая дробязь дагэтуль не была зроблена.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ФОРС-МАЖОР

ІНФРАСТРУКТУРА НЕ ПАСПЯВАЕ ЗА ДЭМАГРАФІЯЙ

Адсутнасць дзіцячага садка і затрымка аплаты камунальных паслуг... узаемазвязаныя

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У Оршы мікрараён «Задняпроўе-3»— гэта гмахі высотных дамоў, дзе іх нумарацыя перавысіла сотню. Мікрараён нядаўна пабудаваны, і жывуць там пераважна маладыя сем'і, якія маюць па двое і больш дзяцей. Але маці скардзяцца, што кватэры купілі, пытанне з жыллём быццам бы адпала, ды толькі ёсць праблема: адсутнасць дзіцячага садка.

Падчас сустрэчы маладыя маці наперабой распавядаюць, што дзяцей у дзіцячы садок даводзіцца вазіць з аднаго канца горада ў іншы (аж да чыгуначнага вакзала). Дарога ў садок, а затым на працу адбірае шмат часу. Ды і ў іншым садку не ўсім дзецям знайшлося месца. Таму некаторыя маці вымушаныя сядзець дома. Яно і няблага, здавалася б. Але ж на адзін заробак мужа не вельмі разжывешся. Трэба пракарміцца і апрануцца, ды кожны месяц за камунальныя паслугі заплаціць. Дарэчы, сем'і, дзе мужчына працуе, а жонка з дзіцем дома сядзіць, нярэдка затрымліваюць выплаты за камунальныя паслугі. Асабліва гэта датычыцца мнагадзетных сем'яў.

Зразумела, што ўлады павінны стварыць умовы для таго, каб жанчына мела магчымасць працаваць. Ды і нараджальнасць пры адпаведным клопаце будзе расці, аб чым увесь час гаворыцца на дзяржаўным узроўні.

Але на зварот жыхароў «Задняпроўя-3» у гарвыканкам адказалі: у горада пакуль што не хапае сродкаў, каб распачаць будаўніцтва дзіцячага садка ў мікрараёне. На думку ўладаў, гэта першачарговы аб'ект, таму сродкі павінны знайсціся.

Жыхары «Задняпроўя-3» звярталіся з гэтай праблемай і да дэпутата сваёй выбарчай акругі Святланы Рыжыкавай.

— Гэта шчыльна заселеная тэрыторыя, дзе жывуць пераважна маладыя сем'і, — кажа дэпутат. — Сярод іх — значны працэнт мнагадзетных, якім прадастаўлена сацыяльнае жыллё. Выбаршчыкі актыўна выступалі за тое, каб я дабівалася тэрміновага распачынання будаўніцтва дзіцячага садка. Я рабіла гэта ў запытах і зваротах да гарадскіх уладаў. Аб'ект знаходзіўся ў праекце на працягу апошніх гадоў, але на яго рэалізацыю не хапіла грошай у бюджэце. Так, ва ўсялякім выпадку, гаварылі першыя асобы гарвыканкама на сесіях гарадскога Савета дэпутатаў. Тым часам праблема абвастраецца, бо ўжо ідзе забудова мікрараёна «Задняпроўе-4», дзе зноў набываюць кватэры маладыя сем'і з дзецьмі. Відавочна і тое, што перагружаная адзіная ў гэтым мікрараёне школа. Бацькі ўжо пішуць пісьмы ды дасылаюць запыты адносна будаўніцтва новай школы альбо рэканструкцыі бліжэйшай СШ № 8.

Хутка адбудзецца чарговая сесія дэпутатаў Аршанскага гарадскога Савета. Святлана Рыжыкава зноў збіраецца агучыць чарговы запыт жыхароў мікрараёна наконт будаўніцтва дзіцячага садка. Ці будзе ён пачуты?

Вольга ШУТАВА.

ЗНАЙСЦІ І НАВУЧЫЦЬ

Беларусь даўно і цалкам выканала сваю нацыянальную праграму харчовай бяспекі. Здолела задаволіць не толькі свае патрэбы, але і прадаць лішкі за мяжу. Бягучы год мы завершым з аб'ёмам экспарту прадуктаў харчавання на суму 3 млрд долараў, а ў наступнай пяцігодцы плануем выйсці на 7—10 млрд долараў.

Пра гэта паведаміў старшыням Саветаў дэпутатаў пярвічнага ўзроўню падчас сустрэчы ў межах курсаў павышэння кваліфікацыі ў Інстытуце дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Вадзім ПАПОЎ.

Ён нагадаў слухачам, што пасля развалу Савецкага Саюза наша краіна апынулася ў вельмі няпростай сітуацыі, калі парушыліся ранейшыя трывалыя эканамічныя сувязі, магутныя прадпрыемствы-вытворцы страцілі аб'ёмы заказаў, а ў межах рэспублікі столькі прадукцыі машынабудавання аказалася не патрэбна. Прамысловы комплекс застаўся без грошай — асноўнага плацежнага сродку, і ў краіне распачалася эпапея бартарных аперацый, што прывяло да моцнай дэградацыі нацыянальнай эканомікі.

Сітуацыю ўскладнялі скаардынаваныя, добра спланаваныя і адпаведным чынам прафінансаваныя дзеянні заходніх кампаній супраць рэспублік былога СССР. У галіне аграрнага сектара іх задачай, паводле слоў выступоўцы, было пазбаўленне вытворцаў сродкаў вытворчасці. Першы «ўдар» — вельмі кваліфікаваны, граматны і на 100 працэнтаў дзейсны — быў нанесены па сельскагаспадарчым машынабудаванні. Яно было разваленае на ўсёй постсавецкай прасторы. У той час актыўна насаджалася ідэя, што фермер накорміць краіну.

Вадзім Папоў падкрэсліў, што Беларусь не пайшла на рэарганізацыю буйнатаварнай вытворчасці ў дробнатаварную. Мы мадэрнізавалі сваю прамысловасць і сёння цалкам забяспечаныя тэхнікай і абсталяваннем для патрэбаў свайго аграрнага сектара. Працягваем нарошчваць аб'ёмы экспарту.

Свой станоўчы эфект дала і Дзяржаўная праграма адраджэння вёскі. Паводле слоў Вадзіма Папова, першапачаткова яе кошт быў вызначаны ў памеры 82 трлн рублёў, а рэальна на гэтую праграму ўжо выкарыстана 120 трлн рублёў.

— Ці ўсё там зроблена? — звярнуўся ён да прысутных. — Вы ж добра ведаеце, што не ўсё. Абуладкаванне і сацыяльныя стандарты прасунуліся. А пытанні вытворчасці? Неабходна даць людзям, якія там пражываюць, магчымасць атрымліваць дастойную заработную плату. Заробак жа даць дырэктывай нельга.

Вадзім Папоў патлумачыў, што наша краіна па магчымасці адмаўляецца ад продажу сыравіны, як было раней, і цяпер у асноўным прадае гатовую прадукцыю. На гэтым фоне ў нас і ўзніклі летась «малочныя войны» з Расіяй, бо расійскія прыватныя кампаніі-перапрацоўшчыкі зацікаўленыя ў нашай сыравіне, але не ў гатовым канкурэнтаздольным беларускім прадукце на сваім рынку. Тым не менш, цяпер і яны вымушаныя прызнаваць права нашых вытворцаў дыктаваць свае ўмовы.

— Што дала нам «малочная вайна»? За адзін год беларускія вытворцы знайшлі новыя рынкі збыту ў 66 краінах свету, — адзначыў Вадзім Папоў. — Парадаксальная рэч: малаком, сметанковым маслам і цукрам мы сёння кормім Украіну, якая раней сама мела ўсё гэта з лішкам. Парадоксы, невытлумачальныя з пункта гледжання цвярозага розуму, але цалкам зразумелыя з пункта гледжання эканомікі.

Выступоўца пацвердзіў, што Беларусь здолела захаваць усе формы навучання: вышэйшую, сярэднюю і масавую прафесійную адукацыю. Да нас сёння паступае шмат заяў на спецыялістаў масавых прафесій, бо праблема такіх кадраў актуальная літаральна ва ўсіх былых саюзных рэспубліках. Мы рэарганізавалі і захавалі Акадэмію навук, якую нам таксама прапаноўвалі ліквідаваць. Сёння Нацыянальная акадэмія вырашае значныя для краіны пытанні, галіновая навука ўшчыльную займаецца насенняводствам збожжавых культур, бульбы, гародніны, рапсу і г.д.

Раней Беларусь набывала да мільёна тон пшаніцы. Сёння мы імпартуем у разы менш і толькі — цвёрдыя гатункі (для вырабу макароны, кандытарскіх вырабаў і інш.). Асноўны аб'ём — і на харчовыя мэты, і на фураж — вырошчваем самі.

Колькі год таму мы трацілі валюту на набыццё бялкова-вітаміннай сыравіны, без якой не атрымаць ні мяса, ні малака, ні яек; закуплялі алей, цукар, бо самі вырабляліе вельмі невялікія аб'ёмы. З дапамогай вучоных мы выйшлі на новыя тэхналогіі вытворчасці і адпаведна — на новыя аб'ёмы. Сёння збіраем да 4 мільёнаў тон цукровых буракоў (пры ранейшых 1-1,1 мільёна). Некалі марай беларускіх аграрнікаў было атрымаць 50 тысяч тон рапсу. Сёлета ўбралі паўмільёна тон і ў наступнай пяцігодцы павялічым гэты паказчык удвая. Навучыліся самі вырошчваць кукурузу на зерне для атрымання бялкова-вітаміннай сыравіны. Прычым палова плошчаў была засеяная ўласным насеннем. У перспектыве выйдзем на 100 працэнтаў.

Усё гэта дае нам рэальную магчымасць выйсці на вытворчасць 8 мільёнаў тон малака, 2,5 мільёна тон мяса ўсіх відаў, падсумаваў Вадзім Папоў. Ужо распрацаваныя адпаведныя праграмы, якія зараз праходзяць дашліфоўку. У краіне актыўна ўзводзяцца новыя малочнатаварныя фермы, так званыя «фермы будучыні».

— І ў такіх умовах галоўная задача — падбіраць і вучыць людзей, каб на новых тэхналогіях працавалі дасведчаныя спецыялісты, — падкрэсліў Вадзім Папоў. — Гэта агульная вялікая праграма, якую нам трэба асвоіць, і якая павінна прынесці добры эканамічны вынік. Тут — шырокае поле дзейнасці для вас, кіраўнікі мясцовых Саветаў. Ваша задача — разам са старшынямі гаспадарак прадумаць, дзе знайсці людзей, як і дзе іх навучыць.

Інга МІНДАЛЁВА.

ТЭМА ДНЯ: ЗВАРОТЫ ГРАМАДЗЯН

ПРОСТЫЯ ІСЦІНЫ

У раённых і гарадскіх выканкамах, а таксама ў структурных падраздзяленнях Мінскага аблвыканкама да дысцыплінарнай адказнасці сёлета прыцягнутыя 123 службовыя асобы.

Дырэктыва Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 2 «Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарата» на прававым узроўні замацавала асноўныя патрабаванні ў дачыненні да работы з грамадзянамі: недапушчэнне праяў фармалізму, валакіты, абыякавасці. Пра тое, як рэалізуюцца на практыцы вызначаныя падыходы, ішла размова на чарговай сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў.

— Асноўнай складовай працы з насельніцтвам па-ранейшаму застаецца разгляд зваротаў грамадзян. Сёння гэта самая дакладная крыніца інфармацыі аб настроі людзей, — адзначыла **начальнік аддзела пісьмаў і арганізацыі прыёму грамадзян упраўлення справамі Мінскага аблвыканкама Алена МЕЛЯШКЕВІЧ**.

Простая ісціна: чым больш праблем вырашаецца на нізавым узроўні, тым менш зваротаў і скаргаў паступае з месцаў у вышэйшыя інстанцыі. Аднак за дзевяць месяцаў гэтага года ў Мінскі аблвыканкам паступіла на 23 працэнты зваротаў больш, чым за аналагічны леташні перыяд — а менавіта 3,5 тысячы. Часцей пачалі звяртацца жыхары вобласці ў Адміністрацыю Прэзідэнта, у Камітэт дзяржкантролю. Пры гэтым акрэслілася тэндэнцыя змяншэння колькасці зваротаў, накіраваных грамадзянамі ў раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя выканкамы.

— Рост колькасці зваротаў у вышэйшыя інстанцыі, а не на адрас выканкамаў базавага і пярвічнага ўзроўняў, сведчыць аб недастатковай увазе мясцовых органаў улады да вырашэння галоўных пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва, — заўважыла Алена Меляшкевіч. — Прычына недаверу мясцовым органам улады крыецца ў адказах-абяцаннях, якія накіроўваюць заяўнікам службовыя асобы замест вырашэння пытанняў, а часам — і ўвогуле ў невыкананні гэтых абяцанняў. Толькі ў 8 раёнах вобласці знізілася колькасць зваротаў грамадзян у вышэйшыя інстанцыі. Ва ўсіх іншых раёнах назіраецца павелічэнне гэтай колькасці. Асаблівую занепакоенасць выклікае сітуацыя са зваротамі ў Смалявіцкім і Дзяржынскім раёнах.

Якія ж праблемы хвалююць жыхароў вобласці? 30 працэнтаў зваротаў — гэта просьбы пра рамонт інжынерных сетак і камунікацый, паляпшэнне якасці дарожнага пакрыцця, 20 працэнтаў зваротаў закранаюць пытанні землекарыстання, нявырашаныя канфліктныя сітуацыі паміж суседзямі. Кожны 4-ы зварот мае непасрэднае дачыненне да рамонту жылля і паляпшэння жыллёвых умоў.

Павялічылася і колькасць калектыўных зваротаў. У пераважнай большасці такія звароты інфармуюць пра неабходнасць правядзення капітальнага рамонту дарог, газіфікацыі населеных пунктаў, стварэння інфраструктуры на тэрыторыі новых жылых мікрараёнаў. Інакш кажучы, людзі ўсё часцей узнімаюць пытанні, якія патрабуюць вялікіх аб'ёмаў фінансавання, а таму не могуць быць вырашаныя ў аптымальна кароткія тэрміны (як хацелася б заяўнікам). Паводле меркавання Алены Меляшкевіч, гэты працэс можа быць спынены толькі шляхам шырокага інфармавання насельніцтва. Напрыклад, інфармацыяй пра тэрміны правядзення рамонту дарог на наступныя 3—5 гадоў павінен валодаць не толькі намеснік старшыні райвыканкама па жыллёва-камунальнай гаспадарцы, а і кожны зацікаўлены старшыня сельскага Савета, а таксама дэпутаты — каб падчас выездаў на месцы прадметна і пераканаўча размаўляць са сваімі выбаршчыкамі.

— Як правіла, рамонт аднаго шматкватэрнага дома пабуджае жыхароў суседніх, неадрамантаваных, дамоў актывізоўвацца і накіроўваць калектыўныя звароты ў высокія інстанцыі — з патрабаваннем такога ж рамонту. Таму інфармаванне людзей пра тэрміны рамонтных работ павінна мець папераджальны характар.

Падчас планавага і аператыўнага кантролю за працай са зваротамі грамадзян не абышлося без пакаранняў. У раённых і гарадскіх выканкамах, а таксама ў структурных падраздзяленнях аблвыканкама да дысцыплінарнай адказнасці сёлета прыцягнутыя 123 службовыя асобы, якія парушылі заканадаўства ў гэтай частцы. Каб надалей звесці колькасць зваротаў «наверх» да мінімуму, неабходна, лічыць Алена Меляшкевіч, усе асноўныя пытанні жыццядзейнасці вырашаць на пярвічным узроўні (на ўзроўні сельскіх Саветаў дэпутатаў і выканкамаў).

Скажам, у адпаведнасці з Указам № 21 водаправодныя сеткі і дарогі перададзеныя сёння на баланс спецыялізаваных службаў. Але часам старшыня сельскага Савета, перадрасаваўшы заяўку грамадзяніна ў тую ці іншую службу, «забывае» прасачыць за яе выкананнем. Неабходна, каб раённыя службы інфармавалі сельвыканкамы аб выніках працы па кожным накіраваным на іх адрас звароце грамадзян, а сельвыканкамы не здымалі пытанне з кантролю да яго канчатковага вырашэння.

— Старшыні сельскіх Саветаў, дэпутаты пярвічнага і базавага ўзроўняў не павінны заставацца пабочнымі назіральнікамі, — сказала Алена Меляшкевіч. — Іх задача — вырашаць пытанні на першапачатковай стадыі, не даводзячы сітуацыю да судоў і зваротаў у іншыя інстанцыі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Самакіраванне на паперы?

«Прачытаў неяк інфармацыю пра тое, што старшыня сельскага Савета прысвоіў грошы, якія прызначаліся для выплаты (у якасці ўзнагароджання) старастам вёскі. Падумалася: а чаму ён так зрабіў? Напэўна, таму што старастам не было за што плаціць. На мой погляд, гэта выдуманая «пасада», бо насамрэч старасты практычна нічога не робяць, а старшыні сельскіх Саветаў складаюць справаздачы пра так званае грамадскае самакіраванне і сачыняюць казкі пра тое, што зрабілі старасты. Калі верыць справаздачам, атрымліваецца, што менавіта старасты дамагліся, каб і вуліцу ў вёсцы добраўпарадкавалі, і краму адрамантавалі, і агароджы новыя паставілі... Часам чытаю і думаю: дык, можа, там ужо і старшыня сельвыканкама непатрэбны? Навошта выдумляць усё гэта? Бо «зверху» патрабуюць, каб дзейнічала мясцовае самакіраванне. Не дасі справаздачу пра тое, як добра старасты працуюць, будзе наганяй. Упэўнены, што ў большасці сваёй старастаў нават не выбіраюць на сходах, таму што іх прызначае той самы старшыня, а потым афармляе паперку пра тое, што адбыўся сход.

Можа, і не трэба нам гэтыя старасты, калі ёсць дэпутаты, якіх выбіраў народ? Яны і павінны працаваць са сваімі выбаршчыкамі. А то старастам яшчэ і грошы плацяць. За што?

Вось і вы пішаце, як усё добра ў гэтай справе. А ўзялі б інфармацыю не ў старшыні сельвыканкама, а ў насельніцтва, тады і даведаліся б, хто і што робіць насамрэч.

З павагай, ваш чытач».

Спачатку мы не збіраліся друкаваць гэты ліст, паколькі дасланы ён быў не ў якасці канкрэтнай скаргі, а, паводле выказвання аўтара, «як інфармацыя для роздуму журналістам», каб не прыхарошвалі рэчаіснасць і не складалі «оды» мясцоваму самакіраванню (тым больш, грамадскаму), якога насамрэч не існуе. Дакладней, яно існуе, але ўсяго толькі на паперы...

Аддаючы даніну павагі аўтару ліста за ўважлівае прачытанне нашых публікацый, усё ж дазволім сабе выказаць крыху іншы пункт гледжання: кожная тэрыторыя (вёска, сельсавет, горад) мае такі ўзровень самакіравання і такіх яго прадстаўнікоў (старастаў, членаў дамавых, вулічных, сельскіх камітэтаў), якіх сама заслугоўвае. Грамадскае самакіраванне нельга «навязаць» зверху — яно або ёсць, або яго няма. Ды і які ў навязванні сэнс? Потым старшыні сельскага Савета самому давядзецца працаваць з «навязанай» ім жа кандыдатурай. І калі «вылучэнец» не мае рэальнага аўтарытэту ў сваім населеным пункце, яго ніхто з вяскоўцаў і слухаць не захоча — не то што падпарадкоўвацца. Так што ў «фіктыўных», «намінатыўных» старастах ніводзін адэкватны кіраўнік сельвыканкама не зацікаўлены. Інакш давядзецца яму самому і падваровы абход у населеных пунктах рабіць, і тлумачальную працу з несвядомымі грамадзянамі праводзіць, і добраахвотныя ўнёскі збіраць.

Цяпер наконт аплаты. Выкананне абавязкаў старасты ці старэйшыны — гэта грамадская нагрузка, якая ў пераважнай большасці выпадкаў ніяк не аплачваецца, тым больш штомесячна. У многіх раёнах існуе практыка маральнага і матэрыяльнага заахвочвання старастаў па вынікаў работы за год (радзей — за квартал) — лепшых з іх узнагароджваюць граматамі і падарункамі або сціплымі грашовымі сумамі. «Нашым старастам ніхто нічога не плаціць за іх грамадскую працу, — сказалі мне ў Жыткавіцкім раённым Савеце дэпутатаў. — Толькі раз на год мы прэміруем некалькіх самых лепшых з іх. Але сумы невялікія, максімум 100 тысяч рублёў — мізэр у параўнанні з тым, якую карысць прыносяць гэтыя людзі. Збоку асуджаць іх лёгка. А паспрабуй падняць вяскоўцаў на вырашэнне якой-небудзь праблемы — тую ж звалку прыбраць ці агароджы прыстойныя паставіць, або грошы на добраўпарадкаванне могілак здаць — такога часам наслухаешся!..»

У Бешанковіцкім раёне абраныя 125 старастаў і 4 сельскія камітэты. Гэта непасрэдныя і самыя першыя памочнікі сельвыканкамаў, якія сёння не могуць пахваліцца вялікімі штатамі — там працуюць у асноўным старшыня, сакратар (кіраўнік справамі) і бухгалтар. Кожны дзень у вёсцы, асабліва аддаленыя, не наездзішся. Дэпутата таксама выбіраюць аднаго ад некалькіх населеных пунктаў... А староста ў кожнай вёсцы свой, у яго і радыётэлефон на руках, і непасрэдная, дарэчы, неабмежаваная сувязь са старшынёй сельскага Савета. Ледзь што не так — лямпачка вонкавага асвятлення перагарэла, аўтакрама выбілася з графіка ці прывезла няякасныя прадукты, дарогу размыла або занесла снегам, суседзі пасварыліся з-за зямельнай мяжы — староста адразу сігналізуе ў сельвыканкам. Але ў вопытнага «вясковага мэра» звычайна наладжаны сувязі не толькі са старшынёй сельскага Савета, але і з раённымі службамі — зямельнымі, камунальнымі, дарожнымі.

«У нашай вёсцы няма асфальту, таму з дарогай перыядычна ўзнікаюць праблемы. Але я, калі трэба, магу напрамую, не турбуючы старшыню сельскага Савета, звязацца з раённай дарожнай службай, і яны зробяць рамонт», — расказала староста вёскі Сакаўка Смалявіцкага раёна Тамара Пратасевіч. Дарэчы, людзі давяраюць ёй гэту «пасаду» ўжо сёмы год запар, а сёлета выбралі яшчэ і дэпутатам сельскага Савета. Тамары Мікалаеўне 45 гадоў, яе асноўнае месца працы — брыгадзір паляводаў на мясцовай птушкафабрыцы, да якой нядаўна далучылі чатыры сельгаспрадпрыемствы. «Праца цяжкая, падчас уборачнай з дому раніцай выходжу а палове сёмай, а вяртаюся ў гадзіну ночы, — кажа Тамара Пратасевіч. — Калі б не муж і дачушка, не ведаю, як бы справілася з уласнай падсобнай гаспадаркай. А гэта парасяты, куры, індыкі, ды яшчэ 60 сотак пад зерневымі і бульбай».

Дзякуючы Тамары Мікалаеўне ў Сакаўцы з'явілася, нарэшце, дзіцячая спартыўная пляцоўка (на месцы ранейшай стыхійнай звалкі). Прычым да ладу яе давялі самі жыхары вёскі з дапамогай работнікаў птушкафабрыкі. Да старасты звяртаюцца і па зямельных пытаннях, і па сямейных... Вынікам яе стараняў («змагаліся амаль год!») у вёску ходзіць цяпер сучасная аўтакрама з новым абсталяваннем і, адпаведна, асартыментам... Але галоўным сваім дасягненнем Тамара Мікалаеўна лічыць поўную і канчатковую перамогу над гандлем самагонкай — няхай сабе і ў адным, асобна ўзятым, населеным пункце. Кажа, што ёй нават пагражалі... «Але я нікога не баюся, а крыўдзіцелям адказваю, што абарону знайду ў дзяржавы», — усміхаецца староста. Дарэчы, у пазамінулым годзе яе заахвоцілі невялікай грашовай прэміяй — першы раз за сем гадоў.

Безумоўна, не кожны населены пункт можа пахваліцца такім «мэрам». Але ж для таго і праводзяцца сходы грамадзян, каб разам, супольна выбіраць у мясцовае «начальства» самых вартых. Тых, хто будзе не толькі абараняць «сваіх», але і патрабаваць з іх. Кожны вясковец можа прыйсці на такі сход і выказаць сваё меркаванне — «за» ці «супраць». І пажадана, каб прыйшоў, выказаў. Тады і не прыйдзецца наракаць на адсутнасць у нас мясцовага самакіравання. А таксама на тое, што старастаў не выбіраюць, а прызначаюць.

Наталля УЛАДЗІМІРАВА.

ЗНІЖКІ НА ТРАНЗІТНЫЯ ПЕРАВОЗКІ

Беларуская чыгунка ўстанавіла паніжальныя каэфіцыенты на транзітныя перавозкі шэрагу найменняў грузаў. Зніжкі будуць дзейнічаць з 1 кастрычніка па 31 снежня. Яны ўстаноўленыя з мэтай прыцягнення дадатковых аб'ёмаў перавозак транзітных грузаў па беларускай магістралі.

Напрыклад, на 35 працэнтаў знізіцца кошт транзітных перавозак шэрагу найменняў машын, механізмаў, абсталявання і іх частак; пракату каляровых металаў; шкла тэхнічнага і будаўнічага; чарапіцы і шыферу. Зніжка на 30 працэнтаў будзе таксама на транзітныя перавозкі зерня кукурузы; вырабаў з каляровых металаў вытворчага прызначэння. Зніжка ў 20 працэнтаў распаўсюдзіцца на транзіт матэрыялаў, цепла- і гукаізаляцыйных вырабаў; прадукцыі крухмальна-патачнай прамысловасці і інш.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЦЁПЛЫ ПРЫЁМ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Толькі дзіву даешся. Вунь сцяна цякла ў жыхароў дома, прамучыліся з ёю некалькі гадоў, а выправіць усё атрымалася літаральна за месяц. У кагосьці супрацьлеглая праблема — вада наогул не цячэ, бо водаправоду папросту няма. Таксама разбіраемся, уладжваем. Так што часам работа дэпутата заключаецца літаральна ў тым, каб быць сігнальным агнём — прыцягваць увагу да праблемнай зоны. Ці, калі хочаце, служыць каталізатарам — паскарацца усе працэсы. Не толькі жыллёва-камунальныя. Дапамагчы ўладкавацца ў інтэрнат, напрыклад, ці адшукаць працоўнае месца. Часта найлепшая дапамога, якая патрабуецца ад дэпутата, — усяго толькі ўважліва выслухаць. Так што мы яшчэ крышку і псіхолагі. Асветнікі таксама. Нярэдка проста трэба патлумачыць чалавеку, чаму прадугледжаны менавіта такі парадак, а не які-небудзь іншы, раскласці для яго ўсё па палічках. Больш за ўсё тлумачэнняў даводзіцца даваць па крытэрыях пастаноўкі на чаргу тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і па крэдытах. Ну і ў рэшце рэшт мы выступаем трацейскімі суддзямі: часам нават у «вайне» суседзяў, якія паўжыцця не могуць падзяліць павець.

— А даводзіцца самому трымаць «удар», выслухоўваць крытыку ад выбаршчыкаў?

— Куды ж без гэтага! Бываюць і раз'юшаныя. Вунь нядаўна выбаршчык абураўся: «Што вы там нагаласавалі? Чаму я павінен камуналку па сабекошце аплачваць?!». Пачынаем разбірацца, высвятляецца, што ў яго дом плошчай 419 квадратных метраў. Вы ўяўляеце сабе? 419! У мяне, напрыклад, 85! Вы, кажу, нашто такую махіну збудавалі? «Колькі пліт бетонных было, столькі і збудаваў!» — шчыра адказвае мне ён. І смех, і грэх. На жаль, выключэнняў ніякіх тут зрабіць нельга, якая б сітуацыя ні была. Указ ёсць указ, а ў хуткім часе яго палажэнні будуць адлюстраваныя і ў новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса. Сітуацыя насамрэч няпростая. Тым, у каго грошай на ўтрыманне такіх буйных дамоў не хопіць, прапануюць перасяляцца ў іншыя месцы. Я супраць такога падыходу: ну куды адзінокаму старому пераязджаць? Ён тут да ўсяго прызвычаіўся, усё яшчэ правёў, і раптам перасяляцца. Нашто? Я разумею, закон ёсць закон. Аднак нельга ўсіх агулам, у каго аказалася лішняя плошча, перасяляць. Можа, устанавіць нейкі ліміт спажывання таго ж газу, напрыклад...

— Ці ёсць нейкія глабальныя рэалізаваныя праекты, што выклікаюць у вас дэпутацкі гонар? Ці наадварот нерэалізаваныя, за якія больш за ўсё душа баліць?

— І тыя, і іншыя ёсць. Цешыць больш за ўсё добраўпарадкаванне вуліц, асфальтаванне дарог. Прыемна, калі населеныя пункты развіваюцца, ператвараюцца на тваіх вачах, насычаюцца сучасным каларытам. У Навагрудку, напрыклад, гэта вуліца Мінская, з ёю праблема вырашаная. Зробленая і цэнтральная вуліца ў гарадскім пасёлку Карэлічы. Такое навядзенне парадку патрабуе не аднаго дня і нават не аднаго года. А бюджэт абмежаваны. Таму калі задуманае атрымліваецца здзейсніць, гэта асабліва радуе! А засмучае вось якая рэч. Прапрацоўвалі мы пытанне будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплексу ў Карэлічах. З-за фінансавых цяжкасцяў не была своечасова падрыхтаваная дакументацыя, таму будаўніцтва адкладзенае. Што, вядома ж, вельмі крыўдна. Усе ж пытанні былі адпрацаваныя, і ініцыятыва выканкама была...

— Наколькі шчыльна супрацоўнічаеце з мясцовай уладай?

— Вельмі цесна! Там, дзе ёсць узаемаразуменне і з вертыкаллю ўлады, і з мясцовымі Саветамі, праблемы вырашаюцца хутчэй. Мы ж перадаём інфармацыю бы па ланцужку. Многія праблемы ніколі не былі б вырашаныя, калі б імі займаліся толькі на лакальным узроўні. Часта сітуацыя разрульваецца выключна дзякуючы таму, што ў нас ёсць выхад на міністэрствы і ведамствы. Калі справа вартая, праблема сапраўды сур'ёзная, заўжды падстаўлю плячо, буду адстойваць да канца, да Урада дайду, калі спатрэбіцца. Для дэпутацкай дзейнасці работа ў акрузе вельмі важная. Аднак толькі ў звязцы з дзейнасцю заканадаўчай. Я заўжды падтрымаю законы, якія сапраўды будуць садзейнічаць паляпшэнню жыцця маіх выбаршчыкаў.

— Якія прававыя змены для іх сёння самыя чаканыя?

— Мы цяпер актыўна працуем над праектам закона аб сельскагаспадарчай вытворчасці (спадар Богуш у парламенце задзейнічаны ў рабоце пастаяннай камісіі па аграрным пытаннях, а за плячыма ў яго — салідны стаж работы ў гэтым сектары. — **Аўт.**). Яго на месцах вельмі чакаюць, і мы будзем яго падрабязна абмяркоўваць у акрузе. Многія пытанні ўзнімаюцца ўжо зараз. Ён толькі паступіў у камісію, таму часу на дасканалае яго вывучэнне і дэталёвае абмеркаванне шмат. Не спыняецца вось гэтая асветніцкая, тлумачальная работа і пасля прыняцця законаў. Жыхароў акругі трэба пастаянна трымаць у курсе пра змены ў заканадаўстве. Адстойваць прынятыя рашэнні. Абгрунтоўваць, чаму абраныя такія падыходы, а не іншыя. Тлумачыць, што менавіта ён зменіць да лепшага.

Зоя ВАРАНЦОВА.

ПРОСТЫЯ ІСЦІНЫ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Старшыня Мінскага аблвыканкама Барыс БАТУРА, які прысутнічаў на сесіі, пацікавіўся: як можа сёння сельвыканкам рэальна вырашыць тое ці іншае пытанне на сваёй тэрыторыі? Ці ёсць у яго адпаведныя рычагі і рэсурсы для гэтага? Чаму райвыканкамы не могуць (ці не хочуць) перадаць на нізавы ўзровень дадатковыя фінансавыя сродкі для вырашэння хоць бы самых надзённых пытанняў тэрыторый, каб насельніцтва бачыла, што дзяржава сапраўды зацікаўленая ў выпраўленні сітуацыі на месцах?

— Атрымліваецца, што фармальна сістэма працы са скаргамі і заявамі ў нас нібыта ёсць: вызначаны час для прыёму грамадзян, створана «адно акно»... А насамрэч сістэмы няма, таму што яна не падмацаваная матэрыяльна — ні на пярвічным узроўні ўлады, ні на ўзроўні раённых спецыялізаваных службаў, той жа жыллёва-камунальнай, — сказаў Барыс Батура. — Можна колькі заўгодна абяцаць чалавеку, што, маўляў, зробім тое і тое. Але калі не ўказваць канкрэтныя тэрміны, то гэтыя абяцанкі нічога не будуць вартыя. Сказалі, што зробіце, — дык зрабіце своечасова, у той тэрмін, у які паабяцалі. Хоць праз год, хоць праз два. Але не падманвайце людзей, не дасылайце ім адпіскі, абы на нейкі час пазбавіцца ад «галаўнога болю». Для гэтага ў адпаведных службах, уладных структурах павінны быць на руках праграмы — па добраўпарадкаванні, газіфікацыі, будаўніцтве... Каб прадстаўнікі ўлады самі ведалі, калі і што будзе ў іх пабудавана, на якіх тэрыторыях, і маглі патлумачыць гэта людзям.

Між тым, сёння на ўзроўні некаторых сельсаветаў і раёнаў прымаюцца такія рашэнні, наступствы якіх потым даводзіцца «разрульваць» як мінімум на ўзроўні вобласці. У шэрагу сельсаветаў Мінскага раёна людзям выдзелілі зямельныя ўчасткі пад будаўніцтва на тэрыторыях, дзе праходзіў газаправод, пралягалі «сеткі». Сёння шэраг службовых асоб прыцягнуты за гэта да адказнасці. Аднак пакаранне чыноўнікаў — не самамэта.

— Пярвічнаму ўзроўню ўлады неабходна больш шчыльна працаваць з раённымі службамі і, зразумела, мець схемы інжынерных сетак на сваёй тэрыторыі, — звярнулася да прысутных **старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Святлана ГЕРАСІМОВІЧ**. — А чаму ўвогуле не паставіць у вёсках інфармацыйныя шчыты з указаннем нумароў тэлефонаў усіх неабходных службаў: дарожнікаў, газавікоў, электрыкаў, земляўпарадчыкаў? Не ва ўсіх жа ёсць дома даведнікі... Крыўдна, калі праблемы ўзнікаюць з нічога, на роўным месцы, і мы ўзвальваем дадатковую нагрузку на Адміністрацыю Прэзідэнта.

Формаў працы з насельніцтвам сёння сапраўды шмат, пагадзілася Святлана Герасімовіч. Але рэч не толькі ў форме, але і ў якасці гэтай працы. Таму што за кожным зваротам стаіць чалавек. І яго праблему неабходна вырашаць усімі даступнымі спосабамі.

Наталля КАРПЕНКА.

РАСІЙСКІ ШКОЛЬНІК ЗБЕГ У БЕЛАРУСЬ

На віцебскім чыгуначным вакзале а адзінаццатай гадзіне ночы міліцыянеры затрымалі падлетка, які, як высветлілася, знаходзіцца ў вышуку Упраўленнем унутраных спраў па горадзе Смаленску як зніклы без вестак.

Супрацоўнікі Віцебскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце ўстанавілі, што гэты 15-гадовы грамадзянін Расіі вучыцца ў сярэдняй школе ў Смаленску. У размове з міліцыянерамі хлопец растлумачыў, што пасварыўся ўвечар з бацькам і пайшоў з дому... Потым увогуле вырашыў не вяртацца і паехаў у Віцебск на бліжэйшай электрычцы, бо ў Беларусі жыве яго мама. На чыгуначным вакзале школьнік чакаў дызель-цягнік. Міліцыянеры звязаліся з ёй і «перадалі» сына.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МАГІЛЁЎСКІ «ЭКСПЕРЫМЕНТ»

Адсутнасць кантролю з боку бацькоў, абыякавасць навакольных, кепскія кампаніі ці імкненне быць падобнымі на «суперкрутых» тэлегерояў — прычын можа быць шмат. Што ж да наступстваў, то часта яны несуцяшальныя — значная частка падлеткаў мае праблемы з законам. Статыстыка сведчыць, што абсалютная большасць рэцыдывістаў атрымалі першую судзімасць ужо ў падлеткавым узросце. Іх шлях уніз распачаўся менавіта тады.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На «выпрабавальны тэрмін»

Здзяйсненне падлеткамі забойстваў ці згвалтаванняў — на жаль, таксама рэалій. І ўсё ж гэта варта разглядаць менавіта як выключэнне, нашмат часцей падлеткавая злачыннасць мае крыху іншую афарбоўку. Адзін без невядомай прычыны зламаў плот, другі «пазычыў» мабільнік, трэці пакавпіўся на больш стыльную вопратку аднакласніка, чацвёрты разбіў шкло легкавіка, каб сцягнуць аўтамагнітолу ці калонкі. Нібыта ўсё гэта дробязі. Аднак за імі стаіць суд. І крымінальная адказнасць.

— Заканадаўства вызначае, што пакараннем у такіх сітуацыях можа быць нават пазбаўленне волі, — распавядае старшыня суда Магілёўскага раёна Вольга Клякоўкіна. — Аднак ці не кожнаму зразумела: прысудзіць падлетку тэрмін — значыць зламаць яму лёс. Таму мы імкнёмся, каб няпоўнагадовыя не патрапілі ні за краты, ні нават у спецыяльную школу ці спецыяльнае прафтэхвучылішча, бо там таксама свае «традыцыі» і законы.

Стаўка робіцца на іншае — умоўнае асуджэнне або прысуд з адтэрміноўкай пакарання. Падобныя варыянты сапраўды выглядаюць больш мяккімі. І разам з тым зразумела: падлеткі атрымліваюць своеасаблівы «выпрабавальны» тэрмін, які, дарэчы, калі-нікалі можа працягвацца да трох гадоў. Прычым любы «зрыў» тут прывядзе да непапраўнай бяды.

Папалохаць. І прылашчыць

Практыка кантролю за падлеткамі, якія здзейснілі злачынствы, існуе ў некаторых краінах Еўропы. Аднак таксама не сакрэт, што некалі штосьці падобнае рабілася і ў нас — прафілактыкай актыўна займаліся народныя засядацелі. Уласна кажучы, менавіта «ўзгадка» пра гэта і аказалася галоўнай. Таму сёлета ў Магілёўскім раёне распачаўся невялікі «эксперымент» — была створаная грамадская камісія па куратарстве за няпоўнагадовымі, якія былі асуджаныя да мераў пакарання, не звязаных з пазбаўленнем волі. У склад камісіі ўвайшлі прадстаўнікі суда, адукацыі, інспекцыі па справах няпоўнагадовых, сельскіх Саветаў, сельгаспрадпрыемстваў, а таксама святар.

— Сапраўды, з кожным няпоўнагадовым, які мае праблемы з законам, працуе сацыяльны педагог і супрацоўнік міліцыі, але гэтага ўсё ж недастаткова — апроч таго, дадатковае шэфства за маладымі людзьмі вырашылі ўзяць мы, — адзначае старшыня грамадскай камісіі Надзея Труханава. — Бо кантакты з тым жа чалавекам у пагонах падлетак успрымае далёка не заўсёды адэкватна. І часам большы плён дае звычайная «нефармальная» размова. Не трэба забываць, што, нягледзячы на свае злачынствы, усе яны — яшчэ дзеці.

Сёння грамадская камісія працуе з 11 хлопцамі і дзяўчатамі раёна ва ўзросце ад 15 да 18 гадоў. У іх розныя, прычым не толькі «праблемныя», сем'і. І, вядома, вельмі розныя характары. Пэўна, таму якіх-небудзь універсальных рэцэптаў тут не існуе. Калі аднаго трэба папалохаць, то іншага — і прылашчыць.

— Наша камісія праводзіць сустрэчы ў школах, улетку мы выязджалі ў палатачны лагер для вучняў, якія знаходзяцца на ўліку ў інспекцыі па справах няпоўнагадовых, на ўнутрышкольным кантролі ці якія апынуліся ў сацыяльна небяспечным становішчы, — кажа Надзея Труханава. — І, безумоўна, распавесці пра магчымыя наступствы неабдуманых учынкаў перад такой аўдыторыяй важна. Але не менш важна папрацаваць з праблемным падлеткам індывідуальна, адсачыць, як ён праводзіць свой вольны час, паразмаўляць з яго бацькамі і настаўнікамі. Прычым час ад часу мы практыкуем запрашэнне няпоўнагадовых, якія здзейснілі злачынства, непасрэдна ў суд. Так, яны ўжо ведаюць, што гэта такое, некаторыя нават прайшлі праз следчы ізалятар. І ўсё ж нагадаць пра непрыемны факт з мінулага бывае зусім не лішнім.

Аднак прафілактыка — толькі адзін з кірункаў. Не менш неабходнай прызнаная задача — дапамагчы падлеткам трывала стаць на ногі. І перш-наперш атрымаць прафесію. У выпадку неабходнасці грамадская камісія выходзіць з хадайніцтвамі да кіраўнікоў прафесійна-тэхнічных устаноў, каледжаў, ліцэяў, прычым практыка сведчыць: падобныя звароты не застаюцца без адказу.

Грошы — не галоўнае

Рабіць канчатковыя высновы крыху заўчасна — у рэшце рэшт, грамадская камісія працуе даволі непрацяглы час. Аднак варта заўважыць, што са студзеня ніводны з яе «падшэфных» не здзейсніў паўторнага злачынства і фактычна здолеў пазбегнуць турмы. Ёсць і больш цікавы факт: адзначаецца агульнае зніжэнне паказчыкаў падлеткавай злачыннасці ў раёне. Прычым гэта — задача асноўная. Нездарма тут ужо думаюць ісці далей: ёсць прапановы браць пад кантроль не толькі няпоўнагадовых, якія маюць судзімасць, але і тых, хто патэнцыяльна можа пераступіць небяспечную мяжу ў будучым.

— Наша камісія з'яўляецца грамадскай, інакш кажучы, ніводны з яе членаў ніякіх грошай не атрымлівае. І тым не менш ніхто не кажа, што «гэта не мая работа», мы ніколі не чулі, каб ад супрацоўніцтва з камісіяй адмаўляліся школы ці сельскія Саветы, — адзначае Надзея Труханава. — Бо ўсе разумеюць, што гаворка ідзе пра агульную справу. І што запішучыць вочы на такіх падлеткаў сёння — значыць атрымаць сапраўдных злачынцаў заўтра.

Сяргей ГРЫБ.

Мінск—Магілёў.

СПРАВА Ў ПОШЛІНАХ

З сямі маршрутаў, якія выстаўляліся на тэндар ГУ «Сталічны транспарт і сувязь», толькі тры набылі новых або дадатковых «гаспадароў».

Права працы на кожным з гэтых кірункаў даецца па заявачным прынцыпе, паколькі на іх прэтэндавала па адным перавозчыку. Яшчэ на чатыры маршруты ўвогуле кандыдатаў не знайшлося. На думку начальніка аддзела ГУ «Сталічны транспарт і сувязь» Валерыя Сасіноўскага, адной з прычын зніжэння актыўнасці патэнцыяльных перавозчыкаў з'яўляецца павелічэнне мытных пошлін на мікрааўтобусы, што ўвозяцца з Заходняй Еўропы.

Магда КРЭПАК, «Мінск-Навіны».

ШУКАЕМ БРЭНД

У абласным цэнтры прайшоў конкурс «Магілёў — горад унікальны».

Магілёўцы ўжо шукалі адметную ідэю брэнда свайго горада, аднак пакуль не вельмі ўдала. Таму конкурс працягнецца да 15 снежня, і любы чалавек альбо ўстанова могуць даслаць свае 5-7 слоў на рускай альбо беларускай мове на адрас Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Карла Маркса ў Магілёве. Прыдуманы слоган павінен устойліва асацыявацца з Магілёвам і адлюстроўваць яго ўнікальнасць, геаграфічныя, культурныя, гістарычныя асаблівасці. Пераможца конкурсу пад Новы 2011 год атрымае ноўтбук.

Ілона ІВАНОВА.

«ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ»

ПРЫБІРАЛЬНЯ НА ВУЛІЦЫ, СТАЛОВАЙ НЯМА...

На Віцебшчыне адказныя асобы пры дапамозе «гарачай лініі» вырашылі высветліць, якія праблемы існуюць у сістэме адукацыі. Лінію арганізавалі, каб пачуць «сігналы з месцаў». Наш карэспандэнт таксама «патрымаў руку «на пульсе» адукацыйнай сістэмы Віцебскай вобласці.

Некаторыя «сігналы» бацькоў не могуць не здзіўляць. Нават самі кіраўнікі ўпраўлення адукацыі аблвыканкама здзівіліся, калі маці хлопчыка з Віцебска паведаміла, што ў канкрэтна ўзятай сярэдняй школе (№ 23) Першамайскага раёна ў адным з класаў вучацца толькі дзяўчынкі, а ў «паралельным» — толькі хлопчыкі. Паабяцалі жанчыне, якая папрасіла захаваць ананімнасць, абавязкова з гэтым разабрацца. Тым больш, не магла не ўразіць наступная інфармацыя: калі маці звярнулася да кіраўніцтва школы з просьбай перавесці дзіця ў дзявочы клас (бо хлопчык сціплы, ціхі), у адказ пачула: «Няма чаго нараджаць хлопчыкаў!»

Іншая жанчына паскардзілася на тое, што ў пасёлку Лужасна (пад Віцебскам) у аграрным каледжы не дзейнічае сталовая: «А прывозіць ежу ў тэрмасах забараніла санстанцыя», — агучыла падрабязнасці жанчына...

У Полацкім дзяржаўным універсітэце студэнтцы чацвёртага курса, якая вучыцца на бюджэтным аддзяленні, прапанавалі развітацца з інтэрнатам, бо там не хапае месцаў для першакурснікаў. Пра гэта паведаміла яе маці.

У Віцебскім будаўнічым ліцэі ўжо другі год запар не могуць атрымаць новыя падручнікі па матэматыцы...

Былі і такія «сігналы». У в. Суйкава Віцебскага раёна школьная прыбіральня знаходзіцца на вуліцы! У раёне новабудоўляў Білева, што ў Віцебску, катастрафічна не хапае дзіцячых садкоў. Першы яшчэ не ўведзены ў эксплуатацыю (на момант падрыхтоўкі артыкула. — **А.П.**). Дарэчы, на ўзроўні кіраўніцтва аблвыканкама даручана больш актыўна вырашаць гэтую праблему. Плануецца, доўга не зацягваючы, пабудаваць у гэтым мікрараёне як мінімум тры садкі. Настаўніца інфарматыкі, таксама з абласнога цэнтра, паскардзілася на недахоп у сярэдняй школе, дзе яна выкладае, сучаснай тэхнікі. Ва ўпраўленні адукацыі паабяцалі выйсці з прапановай да кіраўніцтва вобласці, каб на будучы год запланаваць адпаведнае фінансаванне на ўзроўні 1,5 мільярда рублёў.

Як адзначылі начальнік упраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама Іван Шчурок і яго першы намеснік Леанід Сцяпанаў, усе звароты, і ананімныя таксама, будуць пільна вывучаныя і ўзятыя на кантроль. Мяркуем, што і дэпутаты розных узроўняў падключацца да зняцця праблемных пытанняў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МОЖНА «ДАКУРЫЦЦА» ДА КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ

Аператыўнікі УКДБ па Гродзенскай вобласці выкрылі сетку наркадылераў і пастаўшчыкоў з Мінска, Бабруйска і Гродна, якія мелі дачыненне да распаўсюджвання ў розных гарадах Беларусі курыльных сумесяў, у склад якіх уваходзіць асабліва небяспечнае псіхатропнае рэчыва JWH-250.

Групе асоб ва ўзросце ад 24 да 33 гадоў не дапамаглі ні даволі складаная схема распаўсюджвання забароненых сумесяў, ні меры канспірацыі. У выніку заведзена восем крымінальных спраў па ч. 3 арт. 328 Крымінальнага кодэкса Беларусі («незаконны абарот наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і прэкурсораў»), які прадугледжвае ад 8 да 13 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Маладыя людзі, якія набываюць і захоўваюць падобныя курыльныя сумесі з мэтай асабістага карыстання, таксама рызыкуюць быць прыцягнутымі да крымінальнай адказнасці па ч.1 арт. 328 Крымінальнага кодэкса, папярэджвае прэс-служба УКДБ па Гродзенскай вобласці. Санкцыя — да пяці гадоў пазбаўлення волі. Акрамя таго, такія «аматары» трапляюць на ўлік у наркалагічны дыспансэр, што потым абмяжоўвае іх магчымасці пры працаўладкаванні, а таксама з атрыманнем вадзіцельскіх правоў і іншых спецыяльных дазволаў. І, бадай, галоўная небяспека ў тым, што ўжыванне курыльных сумесяў можа нанесці істотную шкоду здароўю. Бо яны выклікаюць яшчэ большую залежнасць, чым іх натуральны аналаг — марыхуана і гашыш.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В г. ОРШЕ

№ п/п	Месторасположение и площадь земельного участка	Начальная цена продажи (руб.)	Условия заключения договора аренды	Инженерное обеспечение участка	Сумма задатка (руб.)
1.	Земельный участок по ул. Ленина в торговом ряду «Северный» в г. Орше площадью 0,0024 га. Кадастровый номер 242400000001011567	141 997	Срок договора – 5 лет. Целевое использование – под торговый киоск. Получение разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработка архитектурно-строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года. Начало строительства объекта в течение 6 месяцев со дня утверждения архитектурно-строительного проекта и осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	В квартале застройки по ул. Ленина в торговом ряду «Северный», где находится земельный участок, имеются сети водоснабжения и канализации, электрической и телефонной связи, теплосеть, с возможностью подключения к ним предполагаемого объекта. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: централизованное газоснабжение – отсутствует, централизованное теплоснабжение – имеется, электроснабжение – имеется, наличие асфальтированного подъезда – имеется, центральное водоснабжение – имеется, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – имеется.	14 190

Примечание:

1. Аукцион состоится **в 11.00 9 ноября 2010 г.** в г. Орше в здании Оршанского горисполкома по ул. Островского, 2.

2. Для участия в аукционе необходимо подать заявление. К заявлению прилагаются заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % от начальной цены продажи, а также:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

3. Победитель аукциона обязан:

- подписать протокол аукциона в день его проведения;
- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;
- возместить расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, в течение 10-ти рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка победителю аукциона;
- заключить с Оршанским горисполкомом договор аренды земельного участка;
- в двухмесячный срок со дня заключения договора аренды земельного участка осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него.

4. Задаток вносится на расчетный счет Оршанского горисполкома № 3642304000494 в ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801647, УНП 300053911.

5. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Орша, ул. Островского, 2, кабинет 18, сектор по управлению госимуществом и приватизации управления экономики Оршанского горисполкома **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по 5 ноября 2010 года включительно.**

Контактные телефоны в г. Орше: (8 0216) 21 13 14, 21 12 42.
Предварительное ознакомление с объектом торгов – контактный телефон в г. Орше: 24 40 32.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.

Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, дэпутат Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Мінскай вобласці

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

Краіна здароўя

Выпуск № 52 (221)

Трайны падход

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА. г. Хойнікі

АДКРЫТЫ ПУНКТ САЦЫЯЛЬНАГА СУПРАВАДЖЭННЯ ДЛЯ СПАЖЫЎЦОЎ ІН'ЕКЦЫЙНЫХ НАРКОТЫКАЎ І ЛЮДЗЕЙ З ВІЧ, ЯКІЯ ВЫЗВАЛІЛІСЯ З ТУРМАЎ

У Мінску адбылося афіцыйнае адкрыццё гэтага пункта, на якім прысутнічалі прадстаўнікі ААН, праваслаўнай і каталіцкай цэркваў, Міністэрства ўнутраных спраў.

Праект арганізаваны Міжканфесіянальнай місіяй «Хрысціянскае сацыяльнае служэнне» пры Аддзеле па ўзаемадзеянні Беларускага Экзархата з МУС краіны. Падтрымку справе аказвае ААН у рамках рэалізацыі гранта Глабальнага фонда для барацьбы са СНІДам, сухотамі і малярыяй. «Я ўпэўнены, што супрацоўніцтва паміж беларускай Царквою, беларускім кіраўніцтвам і ААН паспрыяе павышэнню якасці жыцця сацыяльна неабароненых груп насельніцтва і зруйнуе сацыяльныя прымхі ў дачыненні да ВІЧ-інфіцыяваных», — гаворыць прадстаўнік ААН у Рэспубліцы Беларусь Антоніус Брук.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Пераходны перыяд

Вялікая дэпрэсія з-за выхаду на пенсію

Ці патрэбна рыхтавацца да выхаду на пенсію?

— Амаль заўсёды людзі не гатовыя да падобных змен ні псіхалагічна, ні па ўзроўні ведаў і навыкаў жыцця ў новым статусе пенсіянера, — кажа каардынатар праграм Фонду ААН у галіне народанасельніцтва Таццяна ГАПЛІЧНІК. — Я лічу неспраўдлівым той факт, што існуюць курсы паступлення ў школу, падрыхтоўкі да ўступлення ў шлюб і нараджэння дзіцяці, курсы па адаптацыі да жыцця ў новай краіне, але няма ніякай магчымасці падрыхтавацца да выхаду на пенсію, каб гэтая важная змена жыццёвых этапаў адбылася максімальна камфортна для кожнага чалавека і стварыла перадумовы для дастойнай якасці жыцця на пенсіі...

Доля насельніцтва ў Беларусі ва ўзросце пасля 60 гадоў складае каля 18 працэнтаў, а паводле прагнозаў, да 2050 года гэты працэнт дасягне 35-і. Такі якасна новы этап у жыцці чалавека, як выхад на пенсію, для кожнага праходзіць па-свойму — у залежнасці ад галіны дзейнасці, працоўнага калектыву, сямейных і асабістых абставінаў. Многія даследчыкі вывучалі псіхалагічны стан людзей, якія рыхтуюцца да выхаду на пенсію і ўласна пенсіянераў. Было высветлена, што каля 30-40 працэнтаў людзей лічаць, што іх чакае дэпрэсіўны стан у сувязі з выхадам на пенсію, паколькі гэта звязана са зніжэннем або стратай даходу, уплыву, статусу, улады, не гаворачы ўжо аб прафесійных якасцях. Думкі аб адсутнасці працы, аб уласным здароўі і пытаннях узаемаадносінаў сапраўды могуць выклікаць дэпрэсію ў таго, хто выйшаў на пенсію.

Вучоныя рэкамендуюць арганізоўваць перадпенсійнае навучанне, якое б прадастаўляла інфармацыю аб тым, як адаптавацца ў новых умовах, эфектыўна выкарыстоўваць вольны час, працягваць быць карысным грамадству, рэалізоўваць свае здольнасці і таленты.

Святлана БАРЫСЕНКА.

АКНО З ЕЎРОПЫ

НОВЫМІ вокнамі глядзяць на свет яшчэ тры навучальныя ўстановы адукацыі на так званых чарнобыльскіх тэрыторыях Гомельскай вобласці. Ва ўсіх іх скарысталіся грантамі, якія дазволілі правесці рамонт у межах праекта Еўрапейскага Саюза і Праграмы развіцця ААН «Мінімізацыя наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь». Аднак адной з галоўных умоў рэалізацыі такіх ініцыятыў стаў удзел не толькі мясцовых улад у сумесным фінансаванні, але і шырокае прыцягненне грамадскасці да ўсіх спраў. Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь таксама не засталося ў баку ад дапамогі, якая аказваецца на землях, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай станцыі 24 з паловай гады таму.

Сумесныя намаганні прынеслі плён, пра які сёння з удзячнасцю гавораць тыя, для каго было ўсё прызначана. Маленькай Кацярыне Данец крыху больш за два гады, і сама выказаць падзяку яна не можа. Яе маці, Ірыне Данец, якая прыносіць сваё хворае дзіця ў Хойніцкі цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, сказаць ёсць што:

— Дзяўчынка спачатку не ўмела размаўляць, а цяпер я бачу, што пакрыху пачынае. Настаўнікі ўсю душу аддаюць нашым дзецям. З намі і псіхолаг, і дэфектолаг займаюцца... Маёй дачцэ тут вельмі падабаецца. Тым больш што нас забіраюць з дому і прывозяць назад.

— Зрухі ёсць, калі з дзіцем займаешся — не сядзець жа дома, — лічыць маці 10-гадовага Улада Аксана Куртава. — Як ты сам у грамадства сваё дзіця сацыялізуеш, так і грамадства будзе ставіцца да яго. Тут нельга саромецца. Мы імкнемся, каб сын вёў актыўны лад жыцця, нягледзячы на хваробу: ходзім у гурткі, дома вучымся. Таму мы рады за сваіх дзяцей, у іх цяпер больш магчымасцяў для развіцця.

У Хойніцкім цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання не толькі з'явіліся новыя вокны, што абароніць дзяцей ад магчымых прастуд, але і закупленае спецыяльнае абсталяванне, якое паспрыяе іх развіццю. Агульная сума фінансавання склала каля 20 тысяч долараў ЗША. Усім гасцям свята далі магчымасць паўдзельнічаць і ў майстар-класах. Госці наведалі дэманстрацыйныя заняткі на новым рэабілітацыйным абсталяванні і ўбачылі ў дзеянні разнастайныя методыкі для развіцця дзяцей.

— Я рады бачыць, як узаемадзеянне Праграмы развіцця ААН, Еўрапейскага Саюза, МНС, мясцовай улады, а галоўнае бацькоў і настаўнікаў прыводзіць да такога добрага выніку, — адзначыў прадстаўнік ААН/ПРААН у Беларусі Антоніус Брук. — Гэта кранула маё сэрца.

Самыя маленькія жыхары горада Веткі віталі гасцей у мясцовым дзіцячым садку №3. Дзеці ва ўзросце ад года да пяці паказалі мюзікл «Мой садок самы лепшы!». Што прыемна, яны спявалі і беларускія песні, выконвалі нацыянальныя танцы. Між тым, ініцыятыва гэтай вучэбна-выхаваўчай установы была накіраваная на стварэнне цёплага будынка для дзяцей, сярод якіх многія маюць хранічныя захворванні, расказала загадчыца Веткаўскага дзіцячага садка №3 Ірына Вадапоенка:

— У нас 3 санаторныя групы з 46 дзецьмі, якія часта хварэюць. Гэты праект прыцягнуў да ўдзелу шмат народу: не толькі супрацоўнікаў, але і бацькоў. Палепшылі матэрыяльна-тэхнічную базу: памянялі ўсе вокны, правялі рамонт у кабінетах, часткова аднавілі гульнявыя пляцоўкі, набылі фізіятэрапеўтычнае абсталяванне.

Сума фінансавання з боку праекта ЕС/ПРААН склала каля 30 тысяч долараў ЗША.

— Выдзеленыя сродкі інвеставаны ў нашу будучыню — у нашых дзяцей, — адзначыў часовы павераны ў справах Еўрасаюзу ў Беларусі Жан-Эрык Хольцапфель. — Я спадзяюся, што ўтульныя сцены гэтага садка дапамогуць выхаваць і захаваць здароўе дзяцей у рэгіёне, пацярпелым ад Чарнобыльскай аварыі.

Пыханская базавая агульнаадукацыйная школа ў Веткаўскім раёне, дзе выкладанне вядзецца на беларускай мове, была пераабсталяваная ў межах праекта Еўрапейскага Саюза і Праграмы развіцця ААН «Мінімізацыя наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» дзякуючы намаганням не толькі 20 супрацоўнікаў, але і 30 вучняў і іх бацькоў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЧАМУ ПАКУТУЕ МАЛОЧНАЯ ЗАЛОЗА?

36,6°

ЗАХВАРАЛЬНАСЦЬ жанчын на рак малочнай залозы ў Еўропе, ЗША і Канадзе расце. Такая тэндэнцыя назіраецца і ў Беларусі. Гадоў трыццаць таму ў нашай краіне рэгістравалася 800 выпадкаў захворвання ў год, цяпер — 3,5 тысячы. Мяркуючы па ўсім, наўрад ці ў бліжэйшы час ўдасца паўплываць на захваральнасць, а значыць, і на гэтую тэндэнцыю. Спецыялісты робяць стаўку на іншае — ранняе выяўленне захворвання. Дабіцца значных зрухаў там, дзе існуе страхавая медыцына, вядома ж, прасцей і тым не менш, дзякуючы велізарнай асветніцкай рабоце ў Беларусі таксама становіцца ўсё менш запушчаных выпадкаў.

Італія ставіць перад сабой мэту дабіцца з дапамогай мамаграфічнага скрынінгу (скрынінг — адбор жанчын для паглыбленага даследавання) выяўлення пухлін памерам да 5 мм у 75 працэнтах выпадкаў! Паводле слоў **загадчыка аддзела онкамамалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, доктара медыцынскіх навук Леаніда ПУТЫРСКАГА,** у нас сёння на 1-2 стадыях выяўляецца 78 працэнтаў раку малочнай залозы. Гэта лепшы вынік на постсавецкай прасторы. Хоць наша першая стадыя — пухліна крыху іншых памераў, 1,5-2 см. Тым не менш, у ранняй дыягностыцы гэтага віду раку краіна зрабіла за апошнія пятнаццаць гадоў не проста значны крок, а вялікі рывок наперад.

Сапраўды, для паляпшэння выяўлення раку малочнай залозы на ранніх стадыях у шэрагу краін стаўка робіцца на масавае абследаванне жаночага насельніцтва на такім апараце, як мамограф. Наогул такое даследаванне паказана для жанчын ва ўзросце ад 50 да 69 гадоў і ад 40 да 50-і ў пэўных групах рызыкі. Для скрынінгу патрабуецца як мінімум тры важныя рэчы пэўная колькасць мамографаў, спецыялістаў, якія ўмеюць працаваць на гэтых апаратах, а таксама прыхільнасць пацыентак праходзіць абследаванне кожныя два гады. Толькі пры такім раскладзе можна атрымаць пэўныя вынікі, зрабіць нейкія высновы...

У рэспубліцы сёння 10 мамографаў. Апараты ёсць, зразумела, ва ўсіх абласцях. Праўда, для правядзення нацыянальнага мамаграфічнага скрынінгу патрэбны 50 мамографаў. Кошт укаранення штогадовага мамаграфічнага скрынінгу ў Беларусі і аднаго года работы складае каля 200 млрд рублёў, без уліку сродкаў, неабходных для падрыхтоўкі кабінетаў да ўстаноўкі стацыянарных мамографаў, і ўсіх затрат, звязаных з пошукам, падрыхтоўкай медыцынскага персаналу. Рыхтаваць, напэўна, давядзецца і нашых жанчын. Успамінаецца, як некалькі гадоў таму на адным буйным айчынным прадпрыемстве мамолагі спрабавалі праводзіць сярод яго работніц штогадовыя абследаванні малочнай залозы. Аднак калі на першы раз з'явіліся 5 тысяч добраахвотніц, то праз пяць гадоў засталіся ўсяго... 300. А без прыхільнасці пацыентак абследаванню асабліва сэнсу ў скрынінгу няма.

З аднаго боку, павелічэнне выяўляльнасці ранняга раку малочнай залозы сведчыць аб тым, што суайчыннікі больш уважліва пачынаюць ставіцца да свайго здароўя. З другога боку, прыгадаем Італію і падумаем пра тое, што нам яшчэ ёсць да чаго імкнуцца. Стаўку ў такой справе нельга рабіць выключна на развіццё медыцыны. Якімі б дыягнастычнымі і лячэбнымі магчымасцямі ні валодала краіна, галоўным застаецца адно: каб жанчына прыйшла да ўрача. Калі нічога не непакоіць, то раз у год на прафілактычны агляд. Калі нешта пачало непакоіць, значыць, трэба адкласці ўсё справы і бегчы па кансультацыю тэрмінова. Неабавязкова нават адразу шукаць мамолага. Дастаткова звярнуцца да тэрапеўта ці гінеколага. Дарэчы, нават пры звароце да гэтых спецыялістаў па іншых прычынах заўсёды прасіце доктара агледзець і малочную залозу, калі па нейкіх прычынах ён не зрабіў гэтага па ўласнай ініцыятыве.

Паміж візітамі да ўрача штомесяц рабіце самаагляд. Не думайце, што выявіць праблему можна толькі з дапамогай спецыяльнай апаратуры. У той жа Італіі 80 працэнтаў ранняга раку малочнай залозы ў жанчын выяўляюць... мужчыны! Нашы жанчыны, на жаль, не могуць пахваліцца нечым падобным... Значыць, наша малочная залоза — у нашых руках! Рабіце самаагляд, і калі выявілі нейкую гарошынку, нейкае ўшчыльненне, не страчвайце раўнавагу. Майце на ўвазе, што толькі ў 5-6 працэнтах выпадкаў праблем з малочнай залозай сапраўды мае быць злаякаснае ўтварэнне. Ва ўсіх іншых — дабраякасныя захворванні, якія добра лечацца і тым самым прафілактуюць развіццё злаякасных новаўтварэнняў. Так што не хвалюйцеся, калі намацалі пад пальцамі тое, чаго раней не было. Але і не падсілкоўвайце сваю ляноту. Тэрмінова ідзіце да ўрача! Калі тэрапеўт або гінеколаг выявіць у вас змяненні ў малочнай залозе, ён адразу накіруе для даабследавання ў анкалагічны дыспансер па месцы жыхарства або ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі. Раннія стадыі раку добра лечацца, выконваюцца нават аперацыі з захаваннем органа. Пры выдаленні ж малочнай залозы выконваюцца аперацыі рэканструктыўныя, аднаўленчыя, кажа **загадчык онкамамалагічнага аддзялення РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава Генадзь БЫЛІНСКІ.**

Навуковы супрацоўнік аддзела онкагінекалогіі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава Галіна КАСЦЕВІЧ:

— Малочная залоза — частка комплексу органаў рэпрадуктыўнай сістэмы жанчыны. Цела маткі, шыйка маткі, яечнікі ўплываюць на стан здароўя малочнай залозы. Наогул праблемы ў рэпрадуктыўнай сістэме не ўзнікаюць спантанна. Стан малочнай залозы яшчэ можна ацаніць самастойна. У дачыненні да палавых органаў гэта проста немагчыма. Не чакайце болю. Доўгі час пухліна не баліць, такі сімптом з'яўляецца толькі на позніх стадыях. Каб не ўпусціць каштоўны час, хадзіце да гінеколага штогод, добраахвотна і з задавальненнем. Гінеколаг здольны ацаніць здароўе ўсёй рэпрадуктыўнай сістэмы. Не забывайцеся, калі трэба, нагадаць спецыялісту пра агляд малочнай залозы. Ніколі не пакідайце без увагі любыя змены ў працы рэпрадуктыўнай сістэмы і не піце гарманальныя прэпараты па падказцы сябровак...

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПРАЯВІЦЕ САМАПАВАГУ

22 кастрычніка ў рэспубліцы будзе праходзіць акцыя, прысвечаная малочнай залозе. У гэты дзень ва ўстановах аховы здароўя можна будзе атрымаць адпаведную інфармацыю, трапіць на прыём да спецыялістаў з мэтай агляду малочнай залозы. Аднак спецыялісты (тэрапеўты, гінеколагі, мамолагі, анколагі) будуць рады бачыць вас і ў любыя іншыя дні. Не адкладвайце візіт.

ПРАВЯДЗІЦЕ САМААГЛЯД

Агляд малочных залозаў праводзіцца ў першай палове менструальнага цыкла (на 7-10 дзень). Самаагляд не адмяняе штогадовага візіту да ўрача з той жа мэтай. Жанчынам пасля 40 гадоў неабходна рабіць мамаграфію. Паміж 40 і 49 гадамі мамаграфія робіцца раз у два гады, калі ўрач не рэкамендуе іншую схему, а пасля 50 гадоў — штогод.

Мамаграфічнае абследаванне можна прайсці ў кожным онкадыспансеры. У Мінску — у РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, 8-й гарадской клінічнай бальніцы, 19-й паліклініцы, абласным раддоме, гарадскім онкадыспансеры.

ЗВЯДЗІЦЕ ДА МІНІМУМУ

З мноства разнастайных фактараў рызыкі ўзнікнення раку малочнай залозы вылучаюць асноўныя:

1. Узрост. Часцей за ўсё рак выяўляецца ва ўзросце ад 40 да 60 гадоў, аднак сачыць за малочнай залозай трэба ў любым узросце, нават у маладым, паколькі рак маладзее.

2. Спадчыннасць. Толькі 5 працэнтаў выпадкаў раку малочнай залозы перадаецца з пакалення ў пакаленне, часцей перадаецца ў спадчыну толькі схільнасць.

3. Фізічныя траўмы. Працэнт «посттраўматычнага» раку малочнай залозы вагаецца ад 4 да 44. Неабходна берагчы малочную залозу ад траўмаў.

4. Псіхічныя траўмы. Працяглыя раздражненні цэнтральнай нервовай сістэмы рознымі фактарамі прыводзяць да яе функцыянальнага знясілення і тым самым парушаюць нармальны абмен у арганізме, што спрыяе развіццю злаякасных новаўтварэнняў.

5. Харчаванне. Лішак ужывання жывёльных тлушчаў, высокакаларыйнай ежы, недахват вітамінаў, асабліва А, Е, С, атлусценне таксама павышаюць рызыку захворэць на анкалогію.

6. Дзетародная функцыя. Ранні, да 12 гадоў, пачатак менструацый і позні, пасля 53-55 гадоў, клімакс, познія, пасля 26 гадоў, першыя роды, роды пасля 40 гадоў, малая колькасць родаў, кароткачасовасць груднога выкормлівання, частыя аборты, запаленне прыдаткаў маткі, паніжаная палавая ўзбуджальнасць (фрыгіднасць), пярвічная бясплоднасць, нерэгулярнасць і позні пачатак палавога жыцця, перанесеныя мастыты і інш.

7. Парушэнне функцыі печані, шчытападобнай залозы, яечнікаў.

8. Дрэнная якасць паветра і вады.

9. Павышаная іанізуючая радыяцыя. Вывучалі выпадкі раку малочнай залозы пасля атамнай бамбардзіроўкі ў Японіі. Аказалася, што частата пухлін значна вышэйшая ў тых, хто падвергся радыеактыўнаму абпраменьванню. Найбольш моцнае анкагеннае дзеянне радыяцыі праявілася ў тых, хто падвергся ёй ва ўзросце 10-19 гадоў, слабейшае — пасля 35 гадоў.

Менш за 1 працэнт выпадкаў раку малочнай залозы можна аднесці на кошт агульных дыягнастычных (радыялагічных) працэдур. Таму большасці жанчын робяць мамаграфію пасля 40 гадоў, калі рызыка раку малочнай залозы ад гэтага абпраменьвання нязначная.

Што да Чарнобыльскай аварыі, то ў 1995-1996 гадах адзначаны больш высокі тэмп росту раку малочнай залозы ў Гомельскай вобласці.

10. Яркае святло. Было паказана, што жанчыны, якія працуюць з яркім святлом, маюць павышаную рызыку з'яўлення раку малочнай залозы (павялічваецца выпрацоўка мелатаніну, затым эстрагенаў і пралакціну).

11. Дэфіцыт вітаміну Д. Гэты вітамін і яго метабаліты могуць зніжаць рызыку раку малочнай залозы, аднак даследаванні працягваюцца.

12. Гіпадынамія. Было адзначана, што недахват фізічнай актыўнасці павышае рызыку раку малочнай залозы.

Каб знізіць рызыку з'яўлення раку малочнай залозы, трэба імкнуцца звесці колькасць вышэйадзначаных фактараў да мінімуму.

Здароўе на талерцы

І ЗНОЎ ПРА КАВУ

ПАД УПЛЫВАМ КАФЕІНУ ЛЮДЗЬМІ МОЖНА МАНІПУЛЯВАЦЬ

Кава можа быць выкарыстаная для маніпулявання людзьмі, даказалі вучоныя аўстралійскага ўніверсітэта.

Для даследавання на дыскусію аб важных сацыяльных пытаннях, такіх, як пакаранне смерцю, тэрарызм, аборты, было запрошана 140 добраахвотнікаў. Першая група людзей падчас абмеркавання піла каву, другая піла гарбату або зусім адмаўлялася ад напояў. Першая група добраахвотнікаў ужо пасля другога кубка кавы, пачуўшы контраргументы апанента, ад свайго меркавання адмаўлялася, прымаючы часцей супрацьлеглую пазіцыю. Другая група, якая не піла каву, працягвала адстойваць сваё меркаванне, як і раней.

Як тлумачаць спецыялісты, вялікія дозы кафеіну выклікаюць адчуванне эйфарыі, якое, разам з выкідам адрэналіну, садзейнічае таму, што чалавеку складана сканцэнтравацца, і ён становіцца больш згаворлівым.

БАДЗЁРАСЦЬ АД КАВЫ — ІЛЮЗІЯ

Прыліў бадзёрасці, які прыпісваюць дзеянню кафеіну, хутчэй за ўсё, узнікае ў сувязі з «эфектам адмены» ў выпадках устрымання ад кавы, лічаць вучоныя Брыстальскага ўніверсітэта ў Вялікабрытаніі.

Кафеін вядомы як стымулятар і можа выклікаць стан неспакою. Аднак у людзей, якія пастаянна п'юць каву, узнікае прывыканне (талерантнасць) да яе эфектаў.

Аўтары эксперыменту адзначаюць: «Даследаванне даказвае, што мы не атрымліваем карысці ад ужывання кафеіну. Нягледзячы на тое, што мы суб'ектыўна адчуваем прыліў бадзёрасці, гэта не больш чым наступства «эфекту адмены». Кафеін усяго толькі вяртае нас у нармальны стан. З іншага боку, кафеін узмацняе трывогу, але ў сувязі з развіццём талерантнасці для большасці гэты эфект нязначны».

КАФЕІН УМАЦОЎВАЕ ПАМЯЦЬ

Два кубкі кавы ў дзень дапамагаюць умацаваць памяць, паведамляюць вучоныя з універсітэта штата Паўднёвая Фларыда (ЗША).

Падчас даследаванняў ім удалося даказаць, што кафеін здольны аднаўляць нервовыя клеткі, пашкоджаныя хваробай Альцгеймера. Пры гэтым штодзённае ўжыванне эквіваленту 2 кубкаў кавы ў суткі не толькі палепшыла ў захварэлых мышэй работу мозга, але і знізіла ў крыві канцэнтрацыю бялку амілоіду, які адкладваецца ў нервовых клетках пры хваробе Альцгеймера. Паводле меркавання вучоных, кава паляпшае работу нервовых клетак і ў здаровых людзей. У хуткім часе пачнецца распрацоўка лекавага прэпарату, які ўтрымлівае кафеін.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о возобновлении проведения открытого аукциона по продаже имущества, обращенного в доход государства у Иностранного частного унитарного производственного предприятия «БУГАЛЮКС» фирмы «БУГАЛЮКС, ДЕНМАРК А/С»

Продавец: Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Октябрьского района Витебска.

- Капитальное строение (пошивочный цех № 1) с инв. № 200/С-33103 общ. пл. 1794 кв.м, по адресу: Витебск, ул. Гагарина, 11, начальная цена продажи **614 700 000** руб., сумма задатка **61 470 000 руб.** Для обслуживания недвижимого имущества выделен земельный участок пл. 0,1914 га.

Аукцион состоится **8 ноября 2010 года в 10.00** по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по 05.11.2010 (включительно) по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация 08.11.2010 с 9.30 до 10.00 по месту проведения аукциона. Официальное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.06.2010 г. № 115. Порядок участия и проведения аукциона опубликован на сайте www.Ocenka.by.

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (0212) 435 435; 8 (029) 591 00 02; эл. почта: Vit.in@tut.by

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже права заключения договора аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности

№ лота	Наименование объекта аренды, его характеристика (год постройки, общая площадь, коммунальные услуги при наличии)	Адрес объекта аренды, контактный телефон для осмотра объекта	Арендуемая площадь, кв.м	Начальная цена права заключения договора аренды с НДС (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
1	390 – «Дом военной одежды», 1987 г., 5078 м², э/энергия, центр. отопление, в/снабжение, 3 эт., комн. 310	г. Минск, ул. Калинина, 30а, тел. 280 25 28, 287 37 62	16,2 кв.м	170100	7000

Организатор аукциона – **РУП «Торгово-производственное управление при Министерстве обороны»**, адрес: 220012, г. Минск, ул. Калинина, 30а. Аукцион состоится **08 ноября 2010 года в 11.00** по адресу: **г. Минск, ул. Калинина, 30а, 5 (пятый) этаж.** К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы в соответствии с законодательством Республики Беларусь, иметь в банке открытый счет. Юридические лица представляют необходимый пакет документов, установленный законодательством Республики Беларусь. Порядок и сроки осмотра объекта согласовываются с организаторами аукциона. Заявления на участие в аукционе принимаются со дня опубликования и до **17.00 01 ноября 2010 г.** включительно по адресу: г. Минск, ул. Калинина, 30а, 5 (пятый) этаж, комн. 525. Время работы: понед.–пятн. 9.00–13.00, 14.00–18.00. Справки по тел. (017) 280 25 28. Участник аукциона, выигравший аукцион, после окончания аукциона должен подписать протокол о результатах аукциона. Право на заключение договора аренды возникает у победителя аукциона с момента перечисления им организатору аукциона определенной в ходе аукциона цены. Срок заключения договора аренды – 3 года. Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет РУП «Торгово-производственное управление при Министерстве обороны» 3811224139004 в специализированном управлении Национального банка Республики Беларусь БИК 153006024, ул. Калиновского, 72а, 220114, г. Минск, УНП 190562963. Победитель аукциона заключает договор на аренду зданий, сооружений и помещений в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. В случае уклонения или отказа от заключения договора аренды, уклонения или отказа от оплаты стоимости приобретенного права на заключение договора аренды задаток победителю аукциона не возвращается. Оплата стоимости приобретенного права на заключение договора аренды осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 3 (трех) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона с победителем аукциона.

ИЗВЕЩЕНИЕ

ВЕРХНЕДВИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
проводит открытый аукцион на право заключения договора аренды земельного участка, который состоится 11 ноября 2010 г. в 15.00 в здании Верхнедвинского райисполкома по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1 (малый зал заседаний, 2-й этаж)

На аукцион будет выставлен: земельный участок с кадастровым номером 221050100001001972, расположенный по адресу: Витебская область, город Верхнедвинск, улица Карла Маркса, д. 1 площадью 0,1205 га, для строительства и обслуживания здания магазина, срок аренды – 99 лет, начальная цена предмета аукциона – 18 614 720 рублей, размер задатка – 1 861 470 рублей.

Условия продажи: внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; заключение победителем аукциона с Верхнедвинским районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и обращение в двухмесячный срок со дня получения решения (выписки из решения) о предоставлении ему земельного участка в установленном порядке за государственной регистрацией права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица (далее – участники). Участнику необходимо подать заявление на участие в аукционе, заверенную копию платежного поручения о внесении задатка. Кроме того, в комиссию **представляются**:

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

- представителям гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв с 13.00 до 14.00) с 8 октября по 8 ноября 2010 г. (включительно) по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1, кабинет 64. Заключительная регистрация участников 11 ноября 2010 г. с 14.00 до 14.45 по тому же адресу. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Сумма задатка перечисляется на р/счет 3641313000610 в ЦБУ № 206 филиала № 214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцка, МФО 660. Получатель – Верхнедвинский райисполком. УНП 300063038. Назначение платежа 04002.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

Инженерные коммуникации на земельном участке отсутствуют.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за предмет аукциона, возместить расходы по размещению настоящего извещения в СМИ.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

Контактный телефон в г. Верхнедвинске: 8 (02151) 5 28 97.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь извещает о проведении открытого аукциона по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций открытого акционерного общества «Витебский областной техно-торговый центр «Гарант».

Аукцион состоится **9 декабря 2010 г. в 10.00** по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12.

Продавец – Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12.

Для участия в аукционе в срок до 16.00 23 ноября 2010 г. по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный,12, каб. 401 необходимо представить документы, полный перечень которых размещен на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (www.gki.gov.by).

Контактные телефоны:

Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу (017) 284 85 62.

Департамент ценовой политики Министерства экономики Республики Беларусь (017) 2006845, 2226717.

Полное и сокращенное наименования открытого акционерного общества, его адрес	Уставный фонд, шт. акций	Номинальная стоимость акции, рублей	Доля государства в уставном фонде		Предлагается для реализации		Начальная цена		Задаток*, рублей	Информация о владельцах крупных пакетов акций (5 и более процентов уставного фонда)	Земельные участки, зарегистрированные за обществом
			кол-во акций, шт.	в % к УФ	кол-во акций,	в % к УФ	акции, рублей	пакета акций, рублей			
Открытое акционерное общество «Витебский областной техно-торговый центр «Гарант» (ОАО «ВОТТЦ «Гарант»), г. Витебск, пр-т Московский, 66.	101 924	1 000	39 682	38,9	39 682	38,9	66 151	2 625 003 982	262 500 398	Пять физических лиц (7,75 % УФ; 7,82 % УФ; 7,92 % УФ; 7,82 % УФ; 5,55 % УФ)	в г. Витебске и Витебской области общей площадью – 1,1003 га

* – Задаток уплачивается не позднее 2 декабря 2010 г. на счет № 3642974000028 в филиале № 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 720; получатель платежа – Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, УНП 102314789.

белагропромбанк
традиции будущего

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»
с 11 октября 2010 г.*

Сумма депозита, ед. валюты	Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100	200	300	500	1 000	2 000	3 000	Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100	200	300	500	1 000	2 000
Белорусские рубли													
1 – 1 000 000	13,50	14,50	15,50	16,00	16,50	17,00	17,50	8,50	9,10	9,70	10,30	10,90	11,50
1 000 001 – 10 000 000	14,00	15,00	15,75	16,25	16,75	17,25	17,75	8,70	9,30	9,90	10,50	11,10	11,70
10 000 001 и более	14,50	15,50	16,00	16,50	17,00	17,50	18,00	8,90	9,50	10,10	10,70	11,30	11,90
Доллары США													
1 – 500	4,25	5,75	6,25	6,75	7,25	7,55	7,85	2,50	3,50	5,00	5,50	6,00	6,50
501 – 5 000	4,75	6,00	6,50	7,00	7,40	7,70	8,00	3,00	4,00	5,25	5,75	6,25	6,75
5 001 и более	5,25	6,25	6,75	7,25	7,55	7,85	8,25	3,50	4,50	5,50	6,00	6,50	7,00
Евро													
1 – 500	4,25	5,75	6,25	6,75	7,25	7,55	7,85	2,50	3,50	5,00	5,50	6,00	6,50
501 – 5 000	4,75	6,00	6,50	7,00	7,40	7,70	8,00	3,00	4,00	5,25	5,75	6,25	6,75
5 001 и более	5,25	6,25	6,75	7,25	7,55	7,85	8,25	3,50	4,50	5,50	6,00	6,50	7,00
Российские рубли													
1 – 15 000	6,50	7,00	7,50	8,00	8,50	9,00	9,50	4,00	4,50	5,00	5,50	6,00	7,00
15 001 – 150 000	6,75	7,25	7,75	8,25	8,75	9,25	9,75	4,25	4,75	5,25	5,75	6,50	7,50
150 001 и более	7,00	7,50	8,00	8,50	9,00	9,50	10,00	4,50	5,00	5,50	6,00	7,00	8,00

* Настоящие ставки применяются:
- для договоров срочного банковского вклада (депозита) с плавающей процентной ставкой, заключенных в период с 06.03.2006 до 11.10.2010 – с 11.11.2010;
- для договоров срочного банковского вклада (депозита) с плавающей процентной ставкой и фиксированной процентной ставкой, заключаемых с 11.10.2010 – с 11.10.2010.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

Подробные условия вклада «Линия роста» в газетах: «Советская Белоруссия» № 49 от 16.03.2006, «Звязда» № 50 от 04.03.2006, на сайте банка в сети интернет – www.belapb.by и в офисах ОАО «Белагропромбанк». Полная сохранность и возврат денежных средств физических лиц, размещенных в ОАО «Белагропромбанк», гарантируются государством и осуществляются в соответствии с законодательством РБ.
Информация о размере процентов, выплаченных по вкладам в течение последнего финансового года, – в офисах и на сайте банка – www.belapb.by.
Сведения о выплаченных процентах по срочным вкладам (депозитам) ОАО «Белагропромбанк» в 2009 году в эквиваленте, млн бел. рублей:

январь	февраль	март	апрель	май	июнь	июль	август	сентябрь	октябрь	ноябрь	декабрь	итого
17 034,9	18 992,1	22 929,6	22 257,7	20 483,6	21 032,6	20 270,5	20 059,1	19 557,1	20 205	21 320,3	22 134,4	246 277

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Блізкая ўлада

ДА ЛЮДЗЕЙ — ПА-ЛЮДСКУ

ТЫДНЁВАГА РАМОНТУ ЧАКАЛІ 9 ГАДОЎ

У мінулыя выхадныя ў Шаткоўскіх з вёскі Мазалава Мсціслаўскага раёна было свята: сям'я нарэшце засялілася ў сваю кватэру. Таццяне Уладзіміраўне 38 гадоў, яна працуе вартаўніком у дзіцячым садку. Муж Віктар Уладзіміравіч — жывёлавод. У іх двое дзяцей: хлопчыку цяпер 14 гадоў, а дзяўчынцы — 12.

— Калі дачка была маленькая, то аднойчы ёй на галаву ледзь не ўпала люстра — муж неяк паспеў падхапіць, — узгадвае Таццяна Уладзіміраўна падзеі 2001 года. — Мы з таго часу заўважылі, што на столі з'явіліся расколіны, пліта стала правісаць, зверху падалі нейкія кавалкі. Мы звярнуліся ў жылкамунгас, і з-за аварыйнай сітуацыі нас выселілі з нашай 3-пакаёвай кватэры ў 2-пакаёвую па суседстве. За тым часам казалі, што гэта на два тыдні, максімум на месяц, пакуль разбяруцца і зробяць рамонт.

У чаканні прайшлі доўгія гады. Гаспадыня спачатку чакала, потым прасіла. Але ёй тлумачылі, што грошай няма, зноў прасілі патрываць і пачакаць. І яна трывала, пакуль яе ўласную кватэру не пераўтварылі ў інтэрнат для будаўнікоў, якія рабілі ў вёсцы газаправод. Таццяна Уладзіміраўна спрабавала перашкодзіць засяленню, патрабавала парадку, спрабавала не даць ключы. Але ўсё дарэмна: каля дзясятка мужчын жылі некалькі месяцаў у кватэры.

«У выніку стан кватэры яшчэ больш пагоршыўся: шпалеры абарваныя, плітка ў прыбіральні і ваннай выламаная, у адным з пакояў на падлозе дзірка, на балконе — сметнік,» — гаворыцца ў матэрыялах Камітэта дзяржаўнага кантролю Магілёўскай вобласці.

— Я прадбачыла, што яны мне ўсё разбураць, і не ведала, дзе шукаць справядлівасці, — прызнаецца Шаткоўская.

Апошняй надзеяй для Таццяны Уладзіміраўны стала аб'ява пра прыём людзей у межах маніторынгу стану спраў на месцах па арганізацыі работы з грамадзянамі.

— Не дарма схадзіла, — пацвердзіла жанчына. — Таму што неўзабаве высветлілася, што нашай кватэры няправільна паставілі «дыягназ».

Пасля ўмяшання ў сітуацыю КДК на наступны ж дзень у кватэры Шаткоўскіх з'явіліся спецыялісты інстытута «Магілёўграмадзянпраект». Яны знайшлі, што пліта не з'яўляецца аварыйнай, а была пры будаўніцтве няправільна змацаваная. Для выпраўлення дэфекту патрабуецца максімум некалькі тыдняў.

— Нам зрабілі рамонт, і мы нарэшце дома, — пацвердзіла Таццяна Уладзіміраўна. — Асабліва радуюцца дзеці, якія атрымалі асобны пакой. Дзякуй усім людзям, якія з разуменнем паставіліся да нашай праблемы.

У Камітэце дзяржкантролю вырашылі, што жанчына гадамі чакала вырашэння дробязнай праблемы з-за бяздзейнасці службовых асобаў. Цяпер вінаватыя ў 9-гадовых пакутах вясковай сям'і прыцягнутыя да дысцыплінарнай адказнасці. Начальнік участка Мсціслаўскага жылкамунгаса вёскі Мазалава вызвалены ад займаемай пасады.

«УЗРУШЭННЕ» ВОБЛАСЦІ

Як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, улетку ў Магілёўскай вобласці прайшоў маніторынг стану спраў па арганізацыі працы з грамадзянамі, разгляду іх зваротаў і вырашэнні надзённых праблем. Узначаліў магілёўскую групу **намеснік старшыні Камітэта дзяржкантролю Аляксандр АГЕЕЎ.**

Тры этапы маніторынгу ахапілі ледзь не палову вобласці: прыёмы прайшлі ў Магілёўскім і Бабруйскім гарвыканкамах, у Магілёўскім, Асіповіцкім, Клімавіцкім, Горацкім і Мсціслаўскім раёнах.

Народу было шмат: на прыёмы трапілі 274 чалавекі. На «гарачыя» тэлефонныя лініі патэлефанавалі 166 чалавек. Паралельна працоўная група рабіла маніторынг устаноў, куды часта звяртаюцца грамадзяне, і вывучала меркаванне насельніцтва пра мясцовыя ўлады шляхам анкетавання.

— Вобласць атрымала пэўнае «ўзрушэнне»: многія пытанні па сутнасці вырашыліся яшчэ ў той перыяд, калі працавала рабочая група, — пракаментаваў **начальнік аддзела зваротаў грамадзян і арганізацыйнай работы КДК Магілёўскай вобласці Алег КАРАБАН.** — Але таксама важна, што падчас маніторынгу выявіліся службовыя асобы, якія, працуючы са зваротамі грамадзян, знаходзілі «лепшы» шлях не вырашаць і не рабіць — гэта проста адмахнуцца ад чалавека і яго праблем. І ў дачыненні да іх зробленыя пэўныя высновы. Таму што трэба, каб на гэтых пасадах працавалі кваліфікаваныя, кампетэнтныя супрацоўнікі. Нічога звышнатуральнага ад іх не патрабуецца: толькі выконваць свае службовыя абавязкі.

У выніку маніторынгу 79 службовых асобаў прыцягнутыя да дысцыплінарнай адказнасці. З іх 8 чалавек — да адміністрацыйнай, з грашовымі спагнаннямі.

У Камітэце дзяржкантролю не ўтойваюць, што частка людзей звярталася падчас маніторынгу з праблемамі, вырашэнне якіх супярэчыць заканадаўству. Часам здараецца, што скаржнікі патрабуюць проста немагчымага альбо іх проста цікавіць не столькі вынік візіту, колькі працэс стасункаў з кіраўніцтвам. «Але большасць пытанняў задаваліся па тэме», — запэўніў Алег Карабан.

«ЗРАБІЛІ ЎСЁ, І НАВАТ БОЛЕЙ»

— Я хачу падзякаваць Аляксандру Агееву, Ліліі Чыгір (старшыня КДК Магілёўскай вобласці), Прэзідэнту, — не хавае эмоцый **выхавацелька дзіцячага дома сямейнага тыпу ў Клімавічах Ірына МОЦНАЯ.** — Нізкі паклон гэтым людзям за ўсё, што яны зрабілі для нас і дзяцей.

Праблему гэтай жанчыны, якая прыйшла на прыём Аляксандра Агеева падчас маніторынгу, у Камітэце дзяржкантролю называюць «абуральным фактам абыякавасці чыноўнікаў да лёсу шматдзетнай сям'і».

Ірына Моцная — педагог, яе муж — майстар па рамонце гадзіннікаў. Любоў да дзяцей прывяла гэтую сям'ю, якая выхоўвае дваіх сваіх дзяцей, да стварэння дзіцячага дома сямейнага тыпу. Цяпер тут жыве 7 дзяцей, узрост якіх ад 7 да 15 гадоў. Яшчэ нядаўна іх было 8, але старэйшы выхаванец цяпер пайшоў на свой хлеб, хоць і застаецца членам іх вялікай і дружнай сям'і.

Два гады таму для дзіцячага дома быў гатовы будынак, грошы на які ў асноўным выдаткаваў рэспубліканскі бюджэт. Аднак ужо першы халодны сезон выявіў праблемы: холад і сырасць — вынік няякаснага будаўніцтва.

У матэрыялах КДК гаворыцца: «Выяўлены шматлікія дэфекты пры ўстройстве даху, сляды ад працёкаў на верандзе і ў жылых пакоях, сырасць у кацельнай, расколіны на знешніх сценах дома, адсутнасць прадугледжаных праектам агароджаў на лесвіцы на другі паверх, дзе месціцца дзіцячыя пакоі. Як выявілася, за два гады будаўнічая арганізацыя толькі пагоршыла сітуацыю...»

— Я была ў разгубленасці і асцерагалася, каб не зрабіць горш, — прызнаецца цяпер жанчына. — Але размова ішла пра дзяцей і іх здароўе. Дзве зімы яны спалі апранутыя, мерзлі, часта хварэлі. Хто, калі не я, пра іх паклапоціцца? Таму вырашыла ісці за іх да канца.

Цяпер, пасля візіту Моцнай на прыём да Аляксандра Агеева, усе праблемы вырашаныя. На гэта спатрэбілася не так шмат часу — крыху больш за месяц. Будаўнікі, у прыватнасці, поўнасцю перакрылі дах.

— Нам не проста ліквідавалі будаўнічыя дэфекты, а яшчэ зрабілі і больш, каб сям'і было зручна жыць у доме, — гаворыць Ірына Уладзіміраўна. — І я шчаслівая, што ў нашай дзяржаве можна знайсці справядлівасць.

Вінаватыя ў тым, што Ірына Моцная так доўга яе шукала, пакараныя.

— Я хачу заўважыць, што выхавацелька, па сутнасці, клапацілася пра дзяржаўную ўласнасць на тэрыторыі раёна, — сказаў Алег Карабан. — Гэты будынак для дзіцячага дома ніколі не будзе належаць ёй асабіста. Таму пра тое, што ў ім непарадак, павінна была клапаціцца не сям'я, а менавіта прадстаўнікі ўлады. А яны бяздзейнічалі.

Гэты выпадак стаў адной з прычын адстаўкі старшыні Клімавіцкага райвыканкама.

УВАГА НА ЖКГ

— Нам многім удалося дапамагчы, — так ацэньвае вынікі маніторынгу начальнік аддзела зваротаў грамадзян КДК Магілёўскай вобласці. — Можна нават сказаць, што паспрыялі ўсім, хто звярнуўся да працоўнай групы і чые пытанні не супярэчылі заканадаўству. Хоць, безумоўна, шэраг пытанняў, якія патрабуюць выдаткавання значных грошай для іх вырашэння альбо часу для выканання нейкіх работ, застаўся ў нас на кантролі.

Зробленыя вывады з апытання людзей. Урны для анкет стаялі на першых этапах маніторынгу ў людных месцах, і грамадзяне мелі магчымасць выказаць усе свае прэтэнзіі.

— Большасць ставіцца да ўлады станоўча, — сказаў Алег Карабан. — Але трэба адзначыць, што больш за ўсё людзі скардзяцца на працу жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Гэтая сфера патрабуе ўвагі.

Патрабуе значных сродкаў рамонт старога жылля, падтрыманне яго ў належным стане. Напрыклад, у Клімавічах ёсць жылыя дамы ў некалькі паверхаў, пабудаваныя яшчэ ў савецкі час, шмат гадоў таму.

— Паблізу парку ў раённым цэнтры, дзе праходзіць міжнародны фестываль дзіцячай творчасці, жыллё прыведзенае ў парадак, — расказвае Алег Карабан. — Але далей углыб — трухлявыя дамы, пафарбаваныя толькі з фасадаў. Гэта камуфляж, а насамрэч там без выгодаў жывуць у асноўным старыя людзі. І ніякай праграмы па рамонце гэтага жыллёвага фонду няма. Працёк дах — падлаталі, і нехай далей стаіць. А выйсце заўсёды ёсць, гэтым трэба займацца.

У Камітэце дзяржкантролю лічаць, што прайшоўшы маніторынг дае чыноўнікам урок на будучае. Вядома, часам здараюцца памылкі з-за розных абставінаў. Але галоўнае — каб яны не сталі стылем працы. Гэта выснова найперш датычыцца самых нізавых інстанцый: напрыклад — ад майстра ЖЭУ, да якога прыйшлі з праблемай жыхары. І калі гэты майстар вырашыць яе і зробіць належным чынам сваю працу, то людзі не будуць звяртацца да органаў улады са сваімі скаргамі.

Ілона ІВАНОВА.

АМНІСЦІРАВАНЫ МАХЛЯР ЗНОЎ УЗЯЎСЯ ЗА СВАЁ

Асуджаны махляр, які займаўся падманам грамадзян — жыхароў Мінска і Віцебска, якія жадалі прадаць або памяняць свае кватэры. Зарабіў на даверлівасці людзей больш за 560 мільёнаў рублёў.

Махляр (назавём яго Віталь) пачаў свой непрацоўны шлях у 1992 годзе, калі было яму ўсяго 24. Тады ён быў асуджаны ў Віцебску за ўчыненне крадзяжоў маёмасці на 5 гадоў і 6 месяцаў з канфіскацыяй маёмасці. Вызваліўся з папраўчай калоніі і заняўся зноў старым «промыслам». У 2001 годзе зноў быў асуджаны за карысныя злачынствы — ужо на 11 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Дзяржава спрабавала даць шанц гэтаму чалавеку выправіцца. Прэзідыум Віцебскага абласнога суда пры разглядзе крымінальнай справы ў парадку нагляду панізіў яму тэрмін да 9 гадоў, па законе «Аб амністыі» гэты тэрмін быў скарочаны яшчэ на 2 гады. А суд Барысаўскага раёна (па месцы адбывання пакарання) замяніў яму яшчэ не адбыты тэрмін пазбаўлення волі (больш за год) на папраўчыя работы. Але ж міласць дзяржавы Віталь не ацаніў. Ужо праз два месяцы пасля выхаду з калоніі зноў узяўся за прывычныя справы.

Як было ўстаноўлена падчас папярэдняга расследавання і судовага разбіральніцтва, у 2006 — 2009 гадах Віталь знаёміўся з рознымі грамадзянамі — жыхарамі Мінска і Віцебска, якія жадалі прадаць ці абмяняць свае кватэры. Уваходзіў да іх у давер, а пасля продажу кватэр або абмену іх з даплатай выманьваў атрыманыя грошы. Тлумачыў, што яны патрэбныя, каб укласці ў сумесны бізнэс. Потым раптам знікаў — або надоўга, або назаўсёды. А было і так: пазычыў грошы, а людзі яму верылі, што абавязкова верне.

За час сваёй крымінальнай дзейнасці злодзей скраў у грамадзян больш за 560 мільёнаў рублёў. І нічога так і не вярнуў.

Як паведаміў «Звяздзе» Уладзімір Белавус — намеснік начальніка аддзела па барацьбе з карупцыяй і арганізаваній злачыннасцю пракуратуры Віцебскай вобласці, на гэты раз прыгаворам суда Чыгуначнага раёна горада Віцебска махляр асуджаны на 8 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах строгага рэжыму, а таксама абавязаны кампенсаваць падманутым ім людзям матэрыяльную і маральную страту.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Дакрануцца да Астролага

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА. г. Магілёў

Прэм'ера рубрыкі

ПАШТОВАЯ СКРЫНЯ

На нашым сайце zvjazda.by з'явілася новая рубрыка «Паштовая скрыня». Там можна падзяліцца навіной, паведаміць пра праблему, паскардзіцца, задаць пытанне. Чакаем вашых паведамленняў. Найбольш цікавыя з іх будуць надрукаваныя на старонках «Звязды».

Мае дзеці жывуць у сталіцы, а я ў вёсцы ў Ашмянскім раёне. У іх грэчка каштуе менш за 5000 рублёў за кілаграм, а ў нашай вясковай краме больш за 7000. Чаму? Хіба ў вясковых людзей больш грошай? Ці ў нашых гандляроў выдаткі большыя? Ці гэта далікатэс, без якога вяскоўцы могуць і абысціся, калі грошай няма?

Валянціна.

Адна мая суседка ўжо тры дні не выключае духоўку ў газавай пліце, другая — абагравальнік, бо інакш у кватэры немагчыма жыць. Няўжо эканамічна гэта больш выгадна, чым уключыць ацяпленне ў дамах, і не выпрабоўваць людзей штогод? І, між іншым, аплачваць іх бальнічныя лісты.

Наталля

Мой сын пайшоў у трэці клас. Не магу знайсці для яго працоўны сшытак па англійскай мове. Настаўнікі патрабуюць, а дзе купіць, ніхто не ведае. Кажуць, у Мінску ёсць. А як даехаць у той Мінск, калі да яго тры сотні кіламетраў? Чаму б раённаму аддзелу адукацыі ці кіраўніцтву школы не дамовіцца пра цэнтралізаваную закупку гэтых сшыткаў, каб хапіла ўсім вучням. А то прыватныя прадпрымальнікі прывозяць, а на ўсіх не хапае. І вось зараз, хто не змог купіць, шукай дзе хочаш...

Маці

Хто каго?

«БАЛАБОНІЎ БАЛАМУТ: А НА ЧОРТА МНЕ ХАМУТ?..»

У школах некалі казалі, што ў жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу.

Жарту, між іншым, таксама.

Сумняваецеся? Ну тады, што называецца, убачце. Горад. Кватэра. Гаспадыня па кухні топчацца. Чуе — нехта ў шыбу стукае. Азіраецца. Бачыць — за акном яе муж. На пальцах паказвае — дзверы адамкні, маўляў, я ключы забыўся. Гэта бывае, думае жонка, ідзе адчыняць... Але ж крокаў праз колькі спыняецца, бялее тварам, хапаецца за сэрца, азіраецца назад, на акно — бачыць: за ім сапраўды мужык, ніякія не галюнікі. І бразь аб падлогу — і прытомнасць страціла...

Было ад чаго, скажу вам: бо кватэра ў іх на... шостым паверсе, і за акном — гладкая, стромкая сцяна без ніякіх карнізаў!.. Гаспадыня гэта дакладна ведала.

Чаго яна не ведала, дык таго, што непадалёк нейкі манцёр з аўтамабільнай вышкі мяняў лямпу ў вулічным ліхтары. І яе мужык (а гэта быў «заслужаны гумарыст Савецкага Саюза» Мікіта Багаслоўскі) за пяць ранейшых рублёў наняў тую вышку, каб паглядзець, што там робіць жонка, каб пастукаць ёй у акно, каб... пацешыць яе, любімую.

Ці ўсё ж сябе? І потым расказаць, што і як атрымалася, ды людзей пасмяшыць?!

Акурат тое самае маюць на мэце і нашы чытачы, удзельнікі конкурсу на лепшы подпіс да здымка. «Атрымаўшы свежы нумар газеты, адразу гляджу, ці ёсць там рубрыка «Хто каго?», — паведамляе, дарэчы, Валерый Гаўрыш з Чавусаў. — І ўжо тады... Задавальненне ад россыпу «перлаў», ад дыяпазону ідэй, знаходак проста каласальнае! Шкада толькі, што не адразу, як правіла, з'яўляецца натхненне, каб напісаць, не заўсёды знаходзіцца час».

Відаць, таму першыя варыянты чытацкіх подпісаў да здымка прыходзяць па электроннай пошце і ў той жа дзень, апошнія — месяцаў праз пяць (так-так!) пасля чарговага агляду.

Зрэшты, не так важна **калі** яны прыходзяць (абы своечасова!), важна, **якія**. Таму яшчэ раз зірніце на верхні здымак і чытайце: найперш подпіс ад Раісы Васільевай з Гомеля:

Даўно калісь адзін дзівак
Купляў сабе рагулю так:
Прыдбаў даёнку і вяроўку,
А потым — таргаваў каровку...
Пятрок наш гэтак жа зрабіў:
Сукенку шлюбную набыў.
А зараз пільна пазірае:
Нявесту пад яе шукае.

Якую? З «габарытамі», як быццам, усё зразумела, а вось з усім астатнім... Ёсць, як кажуць пытанне...

А, значыць, ёсць і адказ:

Перабраў Ясь многа «цёлак»,
А чакае — удавы,
Бо ў тых пустых свісцёлак
Ані рук, ні галавы,

піша да здымка А. Молчан з Маладзечна.

І, між іншым, не толькі ён (ці яна?). «Убачце»:

Строй ў дзеўкі... А пастава...
З ёй не меней, чым на Вы...
А як толькі рот адкрыла, —
Далібог без галавы!
...Хлопец, бедны,
так спужаўся, —
Без штаноў ажно застаўся! —

заўважыла Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны.

Пра тое ж (не нарадзіся прыгожай, а то ў першым класе партфелямі галаву адаб'юць) даслалі радкі і ўдзельнікі гуртка «Юны журналіст» з АСШ № 3 г. Вілейкі. Што цікава, па іх меркаванні безгалоўе — гэта зусім не тое, што патэнцыйныя жаніхі могуць заўважыць. Прынамсі, хутка:

У кралі грудзі, шыя, а ўжо талія...
З такой адразу ажаніцца б мог!..
Але... чагосьці, людцы,
не хапае ёй?
Не разбяруся — галавы?
Ці ног?

Нага, як быццам, ёсць? Праўда, адна... А што не жаночая і босая, дык мо і сапраўды мае рацыю спадар Шымко з Гродна:

Голы-босы Ясь застаўся, —
На сукенку расстараўся.

Што ж — рэч гэта і сапраўды не танная. А таму —

Ясь жаніўся б... Як багаты...
Ды шкадуе маму з татам:
Каб вяселле адгуляць
Трэба сем кароў прадаць, —

піша пра героя здымка спадар Дубовік з вёскі Арэшкавічы Бярэзінскага раёна. І добра ж, калі ў бацькоў свой статак, калі сам жаніх недзе ў міліцыі працуе ці ў банку, а калі...

Сын Вальдэмары Шышко з вёскі Навасёлкі-1, што на Пастаўшчыне, іншую справу абраў. І цяпер... Пра яго, не пра яго матуля піша:

З тога веку хлопец Коля
Шлюб узяць збіраецца...
Ды настаўнічае ў школе —
Кашалёк зліпаецца:
Як купіў дзяўчыне кветкі,
Дык сабе — хіба шкарпэткі...
А сукенку каб прыдбаць,
Трэба з вучняў хабар браць.

Кажаце, што ім, настаўнікам яго, як быццам, не даюць яшчэ?

Так, гучных крымінальных спраў пакуль не чуваць, але ж (свят-свят-свят!), калі з'явіцца попыт... Бо аднаму памяраць — яшчэ куды ні ішло, а вось жыць — Божа барані! Значыць, трэба жаніцца, стварацца сям'ю...

Хоць, як піша спадар Гаўрыш з Чавусаў, разумеюць гэта не ўсе. Прынамсі, адразу:

Гэта модна —
Ты свабодны,
Шлюб? Ды віртуальны...
Дзень пры дні
Сядзіш адзін
Ноч пры ночы...
Цяжка, блін!
Трэба —
Шлюб рэальны!

З кім? На гэтую тэму досыць удалыя радкі склаліся ў спадарыні Янучок з вёскі Нагорнае Клецкага раёна. Гледзячы на здымак, Зоя Пятроўна піша:

Дзеліць Бог не роўна! Бачу:
Пецю — Маша, Колю — Света,
Анжаліка — Агурбашу,
А камусьці — міс Сусвету...
Ала к Галкіну прыпала,
Нехта — да Сафі Ларэн...
А Барысу дзевак мала, —
Яму толькі манекен.

Хоць, мяркуючы па творы, і хацелася б іншага.

Чаго? Здагадка ад мінчан сужэнцаў Астроўскіх:

Хлопцу гэтаму, напэўна,
Ужо абрыдла з манекенам...
Ды жыццё такое стала,
Што царэўнаў зараз мала
Вось і думае хлапчына,
Дзе ж яна, яго дзяўчына?!
...Будзе час, прыйсці павінна!

Дай Бог! Але ж тут у тэму, як кажуць, перапеў — ад спадарыні Тарасік:

«Замуж выйсці трэба знаць,
Позна легчы, рана ўстаць...»
Ясь ахвотных выглядае, —
Аніводнай не відаць!

Можа, прычына ў дзеўках? Не хочуць клопатаў, турбот, няўдзячнай працы... А можа, і ў тым, што

Сёння Янка не багаты
Другі раз прыйшоў у сваты
Дзеля будучае жонкі
Купіў строі і пярсцёнкі.
Ды застаўся сам ізноў
Без кашулі і штаноў, —

піша пра хлопца спадар Старых з Гомеля, узгадаўшы песню з рэпертуару ансамбля «Бяседа» «Што ж ты, дзеўка, робіш?».

Не тое нешта... У дзеўкі. Як і ў хлопца (на думку спадарыні Кусянковай):

Падбірае жонку Генка
Пад вясельную сукенку:
Ды штось дзеўкі не клююць:
Міма босага ідуць...
Прад'яві кватэру, Генка,
А пасля ўжо сукенку.

Дарэчы, у тым, што дзеўкі праходзяць міма, можа быць і іншая прычына:

Балабоніў баламут:
А на чорта мне хамут?..
І які ў жаніцьбе сэнс,
Калі ў модзе вольны сэкс?..
А як сталасць падышла,
Нават баба не пайшла.

А ўгаворваў жа, як піша спадарыня Чыгрынава з Вілейшчыны! Ды што там — нават сукенку купіў.

А яшчэ ў апошнія хвіліны магло здарыцца вось што:

Нявеста збегла з-пад вянца?
Усялякае бывае...
Давесці справу да канца
Жаніх гэты жадае.
Чакаюць госці за сталом.
Дзяўчаты, не зявайце,
Хутчэй сюды, сукенка ёсць,
Свой шанц не ўпускайце! —

заклікае спадарыня Запрудская з в. Жукоўшчына Шаркаўшчынскага раёна. Прычым — усіх дзяўчат. Спадарыня ж Пажога з Глыбоччыны — тую, адну-адзіную, якой хлопец цяпер шэпча:

Дзе ты, лёсам наканаваная?
Выбрана шлюбнае ўбранне...
Прылятай жа, галубка жаданая,
Сэрца гарыць у чаканні.
Светлае, палкае, вернае
Будзе наша каханне!

Хай Бог дае! Але ж чытачы ўбачылі на здымку не толькі яго (у розных праявах), але і спробы прадпрымальніцтва:

Ёсць люстэрка і ўслон?
Значыць, гэта ўжо салон.
Як тых рэчаў нестае,
То сукенка з атэлье, —

паведамляе Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны, каб пакупнікі ведалі, што кошт тавару ў першым выпадку будзе вышэйшым. Наконт якасці бабка надвое казала. А ўжо абслугоўванне...

Ці то спаў з манекенам,
Ці што дрэннае з'еў:
Позірк быццам бязменам
Пакупнічак агрэў...
Як адчулі, што нялюбы,
Яны цягу з той «Галубы»...
Калі хочаш справу зладзіць,
Думай, чым людзей прывабіць, —

раіць прадпрымальніку спадар Гаўрыш з Чавусаў. Спадарыня ж Чыгрынава лічыць што думаць трэба было раней — пра тое, які (канкрэтна) адкрываць бізнэс, а які — не мае сэнсу:

Дзе ўжо вёсцы да тых шлюбаў:
Прагарыць твая «Галуба»!
Адчыніўшы «Рытуал», —
Век бы горачка не знаў!

(Ад яе ж, ад Любові Міхайлаўны:

І куды палез ты, братка?
Тут жа трэба хітрасць, хватка...
А з такою мінай, Жора,
Табе толькі ў рэвізоры).

У любым выпадку і без сумневу мае рацыю спадар Дубовік з Бярэзіншчыны:

Хлопцы, грошы зарабляйце!
Й па сакрэту вам скажу:
Дзевак ля сябе трымайце,
А то з'едуць за мяжу!

Каб што лепшае, бо попыт на іх заўсёды ёсць...

Як ёсць і яшчэ адзін, варты ўвагі, подпіс — ад будучых калег з гуртка «Юны журналіст»:

Выйшаў з крамы Ясь
у задуменні:
Як жанчынам цяжка ў жыцці:
Ён сукенку, мо,
яшчэ й адзеў бы, —
На абцасах —
з ганка не сысці.

А яны — галу́бкі — бегаюць і нават лётаюць. У пошуках шчасця — таксама. То ўдачы кожнай з іх! І вялікай...

Што да маленькай, то яна ў выглядзе перамогі ў конкурсе на мінулым этапе (на здымку спячая прыгажуня была), на думку вялікага чытацкага журы, усміхнулася спадарыні Тарасік з Мінска, спадарам Нефідовічу з Лунінеччыны, Гаўрышу з Чавусаў і Анатолю Гарачову, з чым пагадзілася і маленькае журы — рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на першы квартал 2011 года на дарагую сэрцу газету накіроўваецца ў вёску Даўнары Іўеўскага раёна. Хочаце, каб да вас? Пішыце! Здымак, як заўжды, дадаецца. Умовы ранейшыя: коратка (не больш за 8 радкоў), дасціпна і... «Паглядзеўшы на мінулы здымак і ўбачыўшы там жанчыну, якая спіць пад плотам, мы рашылі, — паведамляюць сужэнцы Астроўскія з Мінска, — што прапусцім гэты этап, бо ўсе ж будуць пісаць пра бамжоў і алкаголікаў. Як высвятляецца, — не, людзі ўбачылі зусім іншае!»...

А таму, напэўна, варта нагадаць, што на здымак трэба глядзець доўга. І думаць доўга. Тады і ўбачыцца нешта незвычайнае... І зрыфмуецца... І надрукуецца. Ды што там — нават пераможа!

Валянціна ДОЎНАР.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дэпутацкая трыбуна

Дыпламаваны беспрацоўны ці рабочы?..

ЗНАЧНАСЦЬ сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі для Рэспублікі Беларусь вызначаецца прафесійна-кваліфікацыйнай структурай занятага насельніцтва, у якой рабочыя традыцыйна складаюць каля 58%. На постсавецкай прасторы наша краіна амаль адзіная, якой удалося захаваць сістэму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, і не толькі захаваць. Пастаянная дзяржаўная падтрымка ўстаноў прафэхадукацыі дазволіла забяспечыць высокую канкурэнтнасць гэтага ўзроўню адукацыі ў параўнанні з падобнай пачатковай прафесійнай падрыхтоўкай іншых дзяржаў. І таму не дзіўна, што да нас едуць пераймаць вопыт суседзі, якія імкнуцца адбудаваць разбураную пасля распаду СССР сістэму падрыхтоўкі рабочых кадраў.

На пачатак 2010/2011 навучальнага года ў Беларусі дзейнічае 221 прафесійна-тэхнічная навучальная ўстанова, у іх навучаецца больш за 100 тыс. чалавек па 285 прафесіях.

За апошнія гады ў рэгіёнах рэспублікі ўдалося ўстанавіць добрыя сувязі паміж установамі прафэхадукацыі і арганізацыямі-заказчыкамі кадраў. Аб'ёмы дагаворнай падрыхтоўкі павялічыліся амаль да 90 % адносна прыёму, сталі стабільнымі прыём і выпуск навучэнцаў. Інтарэс нашай моладзі да навучання ва ўстановах прафэхадукацыі захоўваецца і таму, што каля 98 % выпускнікоў ПТВ атрымоўваюць накіраванне на працу, ды і ў службах занятасці доля рабочых вакансій складае каля 80 %. Павышае мабільнасць выпускнікоў ПТВ на рынку працы магчымасць атрымаць за час вучобы некалькі прафесій у межах адной спецыяльнасці. Таму колькасць выпускнікоў ПТВ сярод зарэгістраваных беспрацоўных за апошнія 15 гадоў панізілася ў 8 разоў і складае ўсяго каля 2 % (дарэчы, гэты паказчык сярод выпускнікоў ВНУ павялічыўся ў 2,5 раза).

Роля прафесійна-тэхнічнай адукацыі будзе ўзрастаць, паколькі з развіццём сацыяльна-эканамічнага комплексу краіны павышаецца патрэбнасць у падрыхтоўцы кваліфікаваных рабочых кадраў. Зараз асноўнай задачай для развіцця прафесійна-тэхнічнай адукацыі з'яўляецца падрыхтоўка па новых прафесіях на аснове аналізу патрэб рынка працы, бо да гэтага часу некаторыя ПТВ вядуць падрыхтоўку малазапатрабаваных рэгіянальнымі рынкамі працы ткачоў, кухараў, швачак-матарыстак, цырульнікаў, у той час як назіраецца недахоп аператараў сельгасвытворчасці, будаўнікоў, машыністаў бульдозера і экскаватара, сантэхнікаў і інш. Але, на мой погляд, нават гэта не самае галоўнае. Неабходна змяненне як унутранага зместу рабочых прафесій, так і патрабаванняў да іх. Пераважным тыпам рабочага павінен стаць высокакваліфікаваны чалавек, як мінімум з агульнай сярэдняй адукацыяй, які валодае некалькімі сумежнымі прафесіямі. Сучаснаму бізнэсу патрэбны «шматстаночнікі». Калі гэта будаўнік, то ён павінен умець рабіць амаль усё на будоўлі: выконваць і плотніцкія работы, і бетонныя, умець арматуру звязваць і электрападагрэў бетону ажыццяўляць. І нават гэтага ўжо мала. Многія наймальнікі патрабуюць рабочых не толькі з высокім прафесіяналізмам, але і адпаведнымі чалавечымі якасцямі, шырокім далягляднам, імкненнем да самаўдасканалення. Вось словы аднаго са знаёмых бізнэсменаў: «Калі я прымаю на працу сакратара-машыністку, то абавязкова з веданнем дакументаабароту, заканадаўства, адной-дзвюх замежных моў, ды каб прыгожая была. Бо яна — твар фірмы. І за гэта я не шкадую плаціць вялікія грошы».

У савецкія гады рабочых і радавых служачых з дыпломам ВНУ на ўвесь велізарны СССР былі лічаныя адзінкі. Зараз ад агульнай колькасці рабочых ужо каля 3 %, а ад звычайных служачых (сакратаркі, загадчыкі капіравальных бюро, кладаўшчыкі і г.д.) — каля 18 % маюць вышэйшую адукацыю (напрыклад, у Германіі іх толькі 1 %). І гэты паказчык павялічваецца. Сустракаецца ўсё больш выпадкаў, калі чалавек з дыпломам юрыста ці эканаміста прыносіць у ПТВ заяву з просьбай навучыць яго прафесіі бармена ці кухара. Так, у групе аднаго з мінскіх вучылішчаў у мінулым вучэбным годзе навучаліся майстэрству абклейвання сцен пліткай 70 % навучэнцаў з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй, прычым некаторыя з іх мелі вышэйшую будаўнічую адукацыю. Такую тэндэнцыю можна было б разглядаць як негатыўную, але на самай справе яе патрэбна ўсяляк вітаць, бо, згодна са звесткамі статыстыкі, ужо зараз каля 3 % рабочых месцаў павінны быць занятыя кадрамі менавіта з вышэйшай адукацыяй. Нават традыцыйныя будаўнічыя прафесіі пачынаюць весці пераарыентацыю на выкарыстанне сучасных матэрыялаў (вадкія шпалеры, герметыкі, новыя дахавыя і сценавыя матэрыялы). Сантэхніка па складанасці супастаўная з касмічным караблём, не гаворачы ўжо пра сучасную зернеўборачную тэхніку. Усё гэта патрабуе ад рабочых больш высокага ўзроўню адукацыі.

Разам з тым у Рэспубліцы Беларусь назіраецца сур'ёзная дыспрапорцыя ў падрыхтоўцы рабочых кадраў і спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Так, у мінулым годзе ў ПТВ навучалася ўсяго толькі каля 16 % маладых людзей ад усіх, хто атрымоўваў прафесійную адукацыю ў ПТВ, ССНУ і ВНУ. Рашыць праблему «перавыторчасці» дыпламаваных спецыялістаў пры адначасовым недахопе на рынку працы рабочых рук можна было б даволі проста: замацаваць законам абмежаванні на прыём у ВНУ і ССНУ і перанакіраваць плынь абітурыентаў ва ўстановы прафэхадукацыі. Але ж гэта было б няправільна. Па-першае, таму, што ў Беларусі пабудавана грамадства свабоднага выбару, у якім малады чалавек мае права самому вырашаць, дзе яму вучыцца і на якіх умовах. А па-другое, чым вышэйшая адукацыя ў насельніцтва, тым лепш дзяржаве: высокія дасягненні ў эканоміцы, высокі ўзровень культуры, стабільнасць у грамадстве. І наогул, як казалі раней, «веды за плячамі не носяць».

Дык што ж рабіць, як знайсці такое аптымальнае рашэнне, каб і ўзровень адукаванасці насельніцтва не знізіць, а, наадварот, павысіць і адначасова забяспечыць занятасць рабочых месцаў?..

Выйсце можа быць вельмі простае. Мы прызвычаіліся думаць аб тым, што бесперапыннасць атрымання адукацыі звязаная толькі з такімі паслядоўнымі ланцужкамі, як «школа-ВНУ», «школа-ССНУ-ВНУ» або «школа-ПТВ-ССНУ-ВНУ». Псіхалагічна не ўспрымаем працу па рабочай прафесіі, калі атрымаем вышэйшую адукацыю. Але ж з пункту гледжання матэрыяльнай забяспечанасці, дасягнення поспеху ў жыцці, калі выбраць шлях «школа-ПТВ-ВНУ» або «школа-ССНУ-ПТВ», то ў шэрагу выпадкаў можна атрымаць значна большыя перавагі. Таму правільна робяць тыя, хто, не знайшоўшы працы па атрыманай у ВНУ спецыяльнасці, шукае сябе ў рабочых прафесіях, а не «сядзіць на шыі» сваякоў ці дзяржавы. Да ведама: рабочымі на Мінскім трактарным заводзе працуюць і эканамісты, і юрысты з універсітэцкімі дыпломамі і не лічаць гэта абразлівым.

Выказаная думка ў поўнай меры тычыцца і сталых людзей з дыпломамі. Хаця сярэдні ўзрост беларускага рабочага захоўваецца ў раёне 40 (дарэчы, расійскага дасягнуў 53—54 гады), але з-за дэмаграфічнай сітуацыі і на беларускі рынак працы стала паступаць меней маладых рабочых. А гэта вымушае дзяржаву больш поўна выкарыстоўваць патэнцыял насельніцтва сярэдняга і старэйшага ўзросту, асабліва тых, хто з-за розных прычын згубіў працу (закрыццё прадпрыемства, скарачэнне штатаў, пераезд у іншую мясцовасць, сямейныя абставіны і інш.). Атрымаць другую вышэйшую адукацыю дорага і доўга (мінімум 3 гады). А ў ПТВ тэрмін навучання складае адзін год. Акрамя таго, пасля ВНУ і ССНУ за атрыманне адукацыі ў ПТВ грошы плаціць не трэба. Бясплатнае навучанне гарантавана Канстытуцыяй. Дарэчы, чым больш высокі ўзровень адукацыі, тым карацей тэрмін атрымання наступнага тарыфнага разраду. Таму патрэбна вітаць атрыманне адукацыі больш высокага ўзроўню і адначасова адкрываць вочы на тое, што ў спалучэнні з атрыманнем звычайнай рабочай прафесіі можна дасягнуць большага поспеху ў жыцці і заўсёды мець сродкі для існавання. Цікавая інфармацыя: спецыялісты сцвярджаюць, што каб зразумець усю раскройную справу і быць сапраўдным майстрам, неабходны не 2-3 месяцы курсаў, а вышэйшая адукацыя і ўменне шыць, набытае ў вучылішчы, вядома плюс некалькі год практыкі.

Арганізацыйна ў ПТВ даўно ўжо неабходна адкрываць спецыяльныя групы для асоб з вышэйшай адукацыяй, якія жадаюць асвоіць прафесію рабочага ці служачага. У гэтыя групы набіраць людзей з улікам асаблівасцяў атрыманай імі раней адукацыі і займацца з імі па асобных праграмах. Але гэта яшчэ не ўсё. Павінна быць матэрыяльная зацікаўленасць былых студэнтаў у выбары такога шляху. Інакш навошта было вучыцца, калі заробак будзе як у іншых?.. У некаторых арганізацыях дзейнічаюць стымулюючыя надбаўкі да заробку, якія ўстанаўліваюцца наймальнікамі за ўзровень этычнасці ўзаемаадносін у калектыве, за ўменне працаваць на камп'ютары, за ўзровень адукацыі. Гэта добра, але не ў асобных, а ва ўсіх арганізацыях даплаты за ўзровень адукацыі (базавай, агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, а не толькі за вучоную ступень ці званне) павінны быць устаноўлены кожнаму працаўніку: ад прыбыральшчыка да міністра. Думаю, ад гэтага істотна выйгралі б і людзі, і дзяржава. Не кажу ад відавочных пры гэтым росце адукаванасці насельніцтва, павышэнні якасці тавараў і паслуг. Але, напрыклад, калі б у краме ў дзіцячым аддзеле працаваў прадавец-педагог або прадавец-псіхолаг, у аддзеле электроннай апаратуры — прадавец-радыёфізік і г.д., то пагадзіцеся, што нават такая сур'ёзная праблема, як рэалізацыя тавараў насельніцтву, паступова б знікла. Ды і нам, спажыўцам, з такімі прадаўцамі было б больш прыемна ладзіць узаемаадносіны.

Наогул нам, беларусам, патрэбна часцей ставіць перад сабой пытанне: «Што лепей: з дыпломам ВНУ быць беспрацоўным, калі не знайшоў працу па спецыяльнасці ці калі не прадоўжылі кантракт; працаваць у НДІ і не мець здольнасцяў да навукі; вучыць дзяцей, калі «ногі ў школу не ідуць», ці дадаткова праз сістэму прафэхадукацыі атрымаць прафесію рабочага і стаць лідарам, перадавіком на будоўлі, у сельскай гаспадарцы, у рамонтнай майстэрні, выкарыстоўваючы вышэйшую адукацыю як перавагу над іншымі занятымі ў гэтай прафесіі?..». Адказ на яго відавочны. А дзяржаве патрэбна яшчэ больш увагі ўдзяляць сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі, арыентаваць яе не толькі на ўчарашніх школьнікаў, але і на выпускнікоў ССНУ і ВНУ. А пры дапамозе СМІ як мага хутчэй пачаць разбураць негатыўны стэрэатып: «з дыпломам ВНУ — у рабочыя, значыць — крыж на кар'еры і асабістым жыцці».

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе У.М. ЗДАНОВІЧ.

Здароўе нацыі

ЧЫМ «АДГУКНЕЦЦА» ВОДНАЯ БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ?

Беларусь рызыкуе застацца без запасаў пітной вады



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ВАДА — самае распаўсюджанае рэчыва на Зямлі. Яна пакрывае дзве трэція паверхні планеты, аднак, на жаль, далёка не ўся прыдатная для спажывання. Прэсная вада складае толькі 2,5-3 працэнты ад усіх водных запасаў, прычым 70 яе працэнтаў сканцэнтравана ў ледавіковых шапках, каля 30 — схаваныя пад зямлёй. У выніку чалавецтва мае прамы доступ менш чым да 1 працэнта запасаў пітной вады. Ды і тая размеркаваная вельмі нераўнамерна. Яшчэ ў канцы 2006 года 80 дзяржаў, на тэрыторыі якіх пражывае 40 працэнтаў насельніцтва планеты, заявілі, што адчуваюць дэфіцыт вады. У многіх рэгіёнах Азіі і Афрыкі чыстая вада літаральна на вагу золата. Становішча ўскладняецца з-за глабальных змяненняў клімату — штогод каля 6 млн гектараў зямлі ператвараюцца ў пустыню.

Вычэрпванне прыродных запасаў водных рэсурсаў паступова, але няўхільна ператвараецца ў пагрозу глабальнай бяспецы. Яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя дальнабачныя палітолагі, эканамісты і навукоўцы прадракалі ў XXI стагоддзі эпоху «водных войнаў». Як у такіх абставінах адчувае сябе наша краіна? Які ў нас водны патэнцыял? І ці можам мы заяўляць пра сваю нацыянальную водную бяспеку? Па каментарыі мы звярнуліся да доктара геолага-мінералагічных навук, члена-карэспандэнта НАН Беларусі Анатоля КУДЗЕЛЬСКАГА.

УВЕСЬ МІНСК — НА ПАДЗЕМНЫЯ ВОДЫ

— У сувязі з кліматычнымі тэмпературнымі зрухамі і ўзмацненнем антрапагеннага ўздзеяння на прыроду праблема чыстай вады на зямным шары стала адной з самых вострых і па сваёй важнасці значна апераджае энергетычныя праблемы, — пацвердзіў навуковец. — Асабліва цяжкая сітуацыя склалася ў раёнах арыднага клімату, дзе аб'ём выпарэнняў у шмат разоў перавышае аб'ём ападкаў, ці дзе апошнія ўвогуле адсутнічаюць. Гэта Поўнач Афрыкі, Цэнтральная Азія.

На неарыдных тэрыторыях з гумідным кліматам (а гэта ўся Паўночная Еўропа, да якой адносіцца і наша краіна), дзе аб'ёмы ападкаў перавышаюць аб'ёмы выпарэнняў, з вадой — за рэдкім выключэннем — праблем няма. Аднак і ў нас сітуацыя далёкая ад ідэальнай, адзначыў навуковец. Напрыклад, «дзякуючы» чалавечай неахайнасці ўсе рэкі Беларусі сёння непрыдатныя для піцця. А сталічная Свіслач увогуле з'яўляецца адной з самых забруджаных рэк Еўропы.

— Гэта ўжо зусім не рака, а проста труба, якая адводзіць сцёкі жыццядзейнасці мегаполіса, — дадаў гідрагеолаг. — Наша рачная вада на пэўных сезонных этапах можа быць чыстай, але нават тады ўсе донныя ападкі, уся рачная фаўна застаюцца забруджанымі небяспечнымі для здароўя металамі, складанымі арганічнымі злучэннямі і г.д.

Выправіць становішча можна. Станоўчыя прыклады ў свеце ёсць. У свой час страшна забруджаным быў Рэйн, які тады называлі «сцёкавай канавай Еўропы». Германія затраціла каласальныя сумы, але ачысціла раку да такога стану, што ваду з яе можна піць без шкоды для здароўя. У не менш жудасным стане знаходзіліся і Вялікія Азёры Паўночнай Амерыкі. На ачыстку там былі расходаваныя мільярды долараў, затое сёння ў мясцовага насельніцтва няма ніякіх праблем з водазабеспячэннем. Аднак ачыстка паверхневых вод — выключна дарагое задавальненне, на якое ў нашай краіны пакуль няма сродкаў.

Асноўная крыніца пітнога водазабеспячэння беларусаў — падземныя воды. 95 працэнтаў аб'ёмаў водазабеспячэння ў рэспубліцы ідзе менавіта за кошт падземных ваданосных гарызонтаў. Аднак ёсць гарады, напрыклад, Мінск і Гомель, у якіх водазабеспячэнне насельніцтва яшчэ і сёння часткова ажыццяўляецца за кошт рачнога стоку. Па сваіх паказчыках гэта значна горшая вада, чым яе «падземны аналаг», таму камунальныя службы вымушаныя праводзіць хларыраванне.

— Многія вучоныя і медыкі даўно заяўляюць, што хларыраваная вада не прыдатная для піцця, — падкрэсліў Анатоль Кудзельскі. — Дзеля справядлівасці трэба дадаць, што і падземныя воды ў шэрагу выпадкаў неабходна хларыраваць, бо вада падаецца па трубах, дзе можа быць нейкая расліннасць, бактэрыі. Але гэта ўжо зусім іншыя, значна меншыя дазіроўкі.

Паводле слоў навукоўца, прамысловыя прадпрыемствы Мінска **для тэхнічных патрэб** у суткі спажываюць 90 тысяч кубаметраў **прэсных падземных вод**, у той час, як **для пітных мэтаў** насельніцтва горада ў суткі выкарыстоўвае 180 тысяч кубаметраў **паверхневых вод** з Вілейска-Мінскай воднай сістэмы, якая мае значна больш нізкую якасць. Такая сітуацыя сведчыць аб яўна нерацыянальнай арганізацыі сістэмы водазабеспячэння сталіцы і даўно патрабуе перагляду на карысць жыхароў, лічыць гідрагеолаг. Цалкам перавесці Мінск на спажыванне падземных вод вельмі дорага, сцвярджаюць чыноўнікі. Усё ж такі пад націскам беларускіх вучоных камунальнымі службамі была распрацаваная адпаведная праграма, рэалізацыя якой запланавана на 2020 год. Будзем спадзявацца, што яна не застанецца толькі на паперы...

ЛІНІЯ ПАСТАЯННАГА ЗАБРУДЖВАННЯ

Падземныя пітныя воды ў нас выдатныя ад прыроды, падкрэсліў гідрагеолаг. Гэта, як правіла, гідракарбанатна-кальцыевыя і гідракарбанатна-натрыевыя воды з мінералізацыяй ад 200 да 600 міліграмаў на літр. Цудоўная вада. Адзіны яе недахоп — высокая канцэнтрацыя жалеза, радзей — марганцу і бору. Гэтыя металы — прыродныя забруджвальнікі, якія патрапілі да нас разам з галечнікамі і абломкамі горных парод, прыцягнутых з Поўначы ледавікамі.

— Высокая канцэнтрацыя такіх металаў — адзіны недахоп, які адрознівае нашы выдатныя падземныя прыродныя воды. Рэсурсы гэтых вод дастатковыя для забеспячэння беларусаў і сёння, і на перспектыву.

Гідрагеолагі высветлілі, што аб'ём вады, якую можна эксплуатаваць і падаваць у сеткі водазабеспячэння, у нашай краіне складае каля 2005 кубаметраў у год на аднаго чалавека. Гэта нашы рэсурсы. А паводле ацэнак ААН, нармальная жыццядзейнасць чалавека магчыма пры спажыванні ім не менш за 1000 кубоў у год. Такім чынам, мы па паказчыку забяспечанасці пітной вадой удвая перавышаем сусветную крытычную мяжу.

Запасы падземных вод пад Мінскам дазваляюць выбіраць каля 800 тысяч кубоў у суткі, хоць на практыцы сталіца сёння расходуе 400-500 тысяч кубоў. І апошнім часам аб'ёмы расходу вады яшчэ скараціліся — беларусы вучацца эканоміць.

Чыстай вады ў нас пакуль дастаткова. Галоўная праблема ў тым, што мы вельмі інтэнсіўна забруджваем падземныя воды — з-за адсутнасці эфектыўных сістэм ачысткі адходаў. Забруджванне адбываецца па многіх кампанентах, асобая бяда — нітраты. Крыніцамі забруджвання нітратамі з'яўляюцца арганічныя ўгнаенні, выгарбаныя ямы, жывёлаводчыя комплексы, птушкафабрыкі з іх спецыфічнымі адходамі, калійная вытворчасць з велічэзнымі .тэрыконамі і інш.

— Усе забруджванні трапляюць у грунтовую ваду, — патлумачыў Анатоль Кудзельскі, — яна апускаецца ніжэй, і мы потым «ловім» іх у свідравінах, з якіх п'ём ваду. Падкрэслю: сітуацыя яшчэ не катастрафічная, але лінія пастаяннага забруджвання існуе ў нас многія дзесяцігоддзі і будзе прасочвацца і далей, бо мы не можам спыніць гэтыя працэсы з-за выкарыстання **экалагапрымальных тэхналогій вытворчасці і спажывання**. У рэспубліцы адсутнічае інфраструктура абыходжання з адходамі — і вытворчымі, і камунальна-бытавымі. Гэта значыць, што на большасці прадпрыемстваў няма эфектыўнай сістэмы ачысткі спецыфічных адходаў канкрэтнай вытворчасці. Заводы і фабрыкі не могуць перадаць свае адходы перапрацоўчым прадпрыемствам (па прычыне адсутнасці інфраструктуры абыходжання з вытворчымі адходамі), таму вымушаны неяк самастойна ад іх пазбаўляцца (выкідваць у лес, зліваць у рэкі, закопваць). Бяда нашай пакуль што эканамічна небагатай краіны ў тым, што ў нас з часоў Савецкага Саюза ніколі не ўзводзіліся нармальныя ачышчальныя збудаванні.

Усе камунальна-бытавыя адходы звозяцца на звалкі, так званыя палігоны. Мы, спецыялісты Акадэміі навук, стварылі геахімічны партрэт тыповай мінскай звалкі і ўстанавілі, што туды звозяцца не толькі харчовыя бытавыя адходы, але і адходы будаўніцтва (у тым ліку і дарожнага), медпрэпараты, іншыя атрутныя рэчывы. Нашы палігоны з'яўляюцца ачагамі вельмі сур'ёзнага забруджвання падземных вод, якое часам дасягае сістэм цэнтралізаванага водазабеспячэння. Панікаваць рана. Але сляды забруджвання мы ўжо знайшлі.

Як патлумачыў навуковец, у ідэале ў любой краіне павінна існаваць (і ўжо існуе, напрыклад, у Італіі, Францыі, Вялікабрытаніі, Іспаніі і інш.) дакладная інфраструктура абарачэння з адходамі. Першы яе этап — раздзельны збор смецця. Для нас арганізацыя дыферэнцыраванага збору адходаў — усё яшчэ праблема, і не толькі адміністрацыйная, але і менталітэту. Большасць беларускіх грамадзян пакуль што не ўсвядоміла ні машабаў экалагічных праблем, ні сваёй ролі ў іх вырашэнні, таму ўсе тыпы смецця па-старому скідваюцца разам, без сарціроўкі.

Другі элемент інфраструктуры абарачэння з адходамі — спецыялізацыя звалак (для арганікі і неарганікі). У нас такой «профільнасці» няма. Усё звальваецца ў адну кучу. І менавіта па гэтай прычыне немагчыма эксплуатаваць беларускія палігоны на прадмет атрымання біягазу.

— Мы, акадэмічныя даследчыкі, 20 гадоў б'ёмся над гэтай праблемай, заклікаем камунальныя службы наладзіць раздзельны збор смецця і стварыць спецыялізаваныя звалкі, — падзяліўся навуковец. — Адвесці асобныя кар'еры, абсталяваць іх сістэмамі збору газу (зрабіць, нарэшце, тое, што даўно ёсць ва ўсіх развітых краінах). Але зрухаў у гэтым кірунку няма.

Трэці элемент інфраструктуры абарачэння з адходамі — сарціровачныя заводы, дзе можна аддзяляць другасную сыравіну (паперу, рыззё) ад таксічных рэчываў. Апошняе, але не менш важнае за астатнія, звяно ланцужка «раздзельны збор адходаў — сарціроўка — спецыялізаваныя звалкі» — высокатэмпературныя смеццеспальнікі, дзе пад уздзеяннем высокіх тэмператур у 1000 — 1300 градусаў Цэльсія адбываецца распад малекул ядавітых рэчываў.

— Я не хачу залішне нагнятаць абстаноўку, — дадаў гідрагеолаг. — Ёсць у нас і сёння раёны — лясныя масівы, аддаленыя ад гарадоў тэрыторыі, дзе вада яшчэ цудоўная, чыстая, але я не гарантую ў ёй адсутнасць высокай канцэнтрацыі жалеза.

ВАДА НА ЭКСПАРТ

Улічваючы значныя водныя запасы Беларусі, у СМІ неаднаразова агучваліся прапановы наладзіць экспарт вады, аднак беларускія вучоныя ставяцца да такой ідэі даволі скептычна.

— Па-першае, яе трэба ачышчаць (хаця б ад таго ж жалеза), — патлумачыў Анатоль Кудзельскі. — Па-другое, трубаправоды, якія маглі б скласці інфраструктуру такога гандлю, прыйдзецца пракладаць праз вялікія тэрыторыі, дзе ёсць Карпаты, Татры, Альпы, са сваімі заснежанымі верхавінамі, з ледавікамі, з цудоўнай вадой...

У завяршэнні размовы навуковец падкрэсліў, што перспектыўнымі для выкарыстання могуць быць толькі тыя рэсурсы, якасць якіх адпавядае беларускім і міжнародным санітарна-гігіенічным стандартам. Распаўсюджванне забруджвальнікаў як тэхнагеннага, так і прыроднага паходжання можна кантраляваць і папярэджваць метадамі гідрагеалагічнага рэгулявання аб'ёмаў і месцаў адцягвання падземных вод, што патрабуе пастаяннага аўтарскага маніторынгу за эксплуатацыяй радовішчаў падземных вод спецыялістамі геалагічнай службы. Таго, што робіцца сёння, абсалютна недастаткова. Акрамя таго, наспела неабходнасць узмацнення гідрагеалагічнай службы краіны, забеспячэння яе высокапрафесіянальнымі спецыялістамі-гідрагеолагамі і больш мэтаскіраванае падключэнне да гэтай праблемы ўстаноў вышэйшай школы.

Інга МІНДАЛЁВА.

У суд Рагачоўскага р-на Гомельскай воб. паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **Зазерскай Веранікі Аляксандраўны**, 8 ліпеня 1978 года нараджэння, ураджэнкі г. Рагачова, апошняе вядомае месца жыхарства якой г. Рагачоў, вул. Мічурына, д. 1, кв. 1, якая паехала ў г. Маскву на заробкі. Просім грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Зазерскую Вераніку Аляксандраўну, паведаміць іх суду Рагачоўскага р-на на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

У суд Гомельскага р-на Гомельскай вобл. паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **Яўменавай (Евменовой) Наталлі Барысаўны**, 27 жніўня 1966 года нараджэння, ураджэнкі в. Ст. Журавічы Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл, апошняе вядомае месца жыхарства якой Гомельскі р-н, в. Бярозкі, д. 20, кв. 5. Просім грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Яўменаву Наталлю Барысаўну, паведаміць іх суду Гомельскага р-на на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі на адрас: г. Гомель, вул. Шаўчэнкі, д. 7А.

ПРЕДЛАГАЕМ В АРЕНДУ
в п/у Колядичи
офисные и складские помещения.
Тел.:
8 029 679 24 79.
УНП 690306997.

Занатоўкі мастака

РАЙСКАЯ САДАВІНА

Калі табе ў Мінску зробіцца млосна і цяжка, сходзі на Камароўку. Я так і раблю. Там ёсць сакавітасць жыцця, слодыч цяперашняга імгнення, пругкасць, сіла і водар будычыні. Там такія жанчыны... Ёсць жанчыны-яблыкі, жанчыны-грушы, а ёсць і залатыя грушы — салодкія, як тыя жанчыны.

Яблыкамі і грушамі я люблю ўпрыгожваць сваё мастакоўскае атэлье. Нехта ўпрыгожвае жытло кветкамі, нехта любіць, каб інтэр'ер напаўнялі творы мастацтва, а я люблю, каб у мяне ў майстэрні была свежая садавіна.

Каб кветкі можна было есці, я б упрыгожваў майстэрню кветкамі, але як ты з'ясі гладыёлус? Хіба ператворышся ў казачнага героя, які харчуецца выключна белымі гладыёлусамі. Такі казачны Глёбус з белым гладыёлусам на срэбным сподзе... Але казка казкаю, а жыццё жыццём.

Камароўка — тое месца ў сталіцы, дзе казачнасць амаль выходзіць на паверхню рэальнасці. Таму менавіта на Камароўцы збіраюцца самыя жывыя і зыркія колеры. Там самая казачная каляровасць, самы каляровы свет... У Мінску толькі на Камароўцы можна ўбачыць водбліскі з райскага саду — таго праўдзіва райскага з Адамам і Еваю, з дрэвам ведаў пра дабро і зло, з анёлам , які вынайшаў меч...

Там, на Камароўцы, я бачу і сваё далёкае дзяцінства, калі цэлую суботу я з дзедам Бронікам збіраў белыя і чырвоныя парэчкі. Мы іх збіралі вельмі акуратна і асцярожна складалі ў кашы. Тыя кашы ставіліся ў люльку матацыкла К-750, на якім мы ехалі са станцыі Койданава ў Мінск, дзе на Камароўцы я тую парэчку прадаваў па 15 капеек за шклянку. Я крыху пабойваўся, што мяне — другакласніка 73-й мінскай школы — убачыць наша настаўніца Ганна Іванаўна Соладава. Што яна спытае, чаму гэта я тут стаю за прылаўкам са шклянкамі белых і чырвоных парэчак? Сустракацца і гаварыць з настаўніцаю мне зусім не хацелася, таму я апускаў кошт да 12 капеек і хуценька распрадаваў свае кашы. Вядома, за апусканне кошту на парэчку можна было і па галаве атрымаць, ад якой злыдушнай цёткі-гандляркі, але я не атрымліваў кухталёў за сваю ініцыятыву, бо малы, бо стаяць за прылаўкам цяжка, бо камароўскім цёткам-гандляркам я падабаўся.

Я і цяпер падабаюся камароўскім прадавачкам. Схадзіў жа і праверыў. Падабаюся! І яны мне падабаюцца і падабаліся заўжды!

У Камароўкі ёсць адна цікавая здатнасць, яна ўвесь час змяняецца ў лепшы бок. Звычайна месцы, людзі, рэчы мяняюцца ў горшы бок. Старэюць, псуюцца, ломяцца, руйнуюцца, а Камароўка штонядзелю ўваскрасае па-сапраўднаму, і красуе, і зіхаціць...

Камароўка цешыла, цешыць і будзе цешыць мяне, і цябе, спадзяюся, сваёй амаль што райскай садавіною.

Адам ГЛОБУС.

Прэс-тур

АД ІНТЭРНАТА ДА СВАЁЙ КВАТЭРЫ

Упэўнай ступені праблемы са здароўем мае ці не кожнае дзіця, аднак усё ў гэтым свеце — вельмі адносна. Бо адна справа — схільнасць да звычайных прастудных захворванняў, і зусім іншая — цяжкія парушэнні псіхікі. Прычым у апошнім выпадку, па сутнасці, медыцына бяссільная. А «стандартным» варыянтам выйсця тут часта становіцца дом-інтэрнат.

Са спазненнем на гады

Скідваць з рахункаў прыроджаныя генетычныя адхіленні ні ў якім разе нельга — існуе вялікая верагоднасць, што «праблемныя» дзеці з'явяцца ў бацькоў-алкаголікаў, наркаманаў, псіхічна хворых людзей. Але гэта прычына не адзіная. Калі-нікалі ўсё вырашаюць заўчасныя роды, ускладненні пасля менінгіту, энцэфаліту ці нават клінічная смерць. Што ж да наступстваў, то часта яны страшныя — разумовая адсталасць. Дзеці з парушэннямі псіхікі пачынаюць сталець не ў 12, а ў 18 гадоў. І становяцца дарослымі толькі ў 25.

— У нас жыве больш за 150 дзяцей, прычым, у дадатак да разумовых парушэнняў, усе яны маюць масу фізічных недахопаў — на кожнага прыпадае не менш чым па дзесяць самых розных захворванняў, — распавядае дырэктар Веснаўскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця Вячаслаў Клімовіч. — І з гэтым трэба лічыцца. Так, змяніць штосьці кардынальна цяжка, але заплюшчваць вочы на аслаблены імунітэт таксама нельга. Ім неабходна займацца лячэбнай фізкультурай, працаваць на трэнажорах, проста паплаваць у басейне з шарыкамі. Прычым мы прыйшлі да высновы — тут неабходна шукаць нетрадыцыйныя падыходы.



Адным з апошніх удалых праектаў стала абсталяванне невялікага ўласнага стадыёна — з турнікамі, полем для міні-футбола, валейбольнай пляцоўкай, баскетбольнымі шчытамі. Сапраўды, гуляць у баскетбол тут можа далёка не кожны. Але пакідаць у кошык мяч — задача цалкам рэальная. І вынікам яе становіцца развіццё карэкцыі рухаў. А ўдзел у спаборніцтвах па футболе ці лёгкай атлетыцы — гэта яшчэ станоўчыя эмоцыі і лепшае самаадчуванне. Тое ж даюць і паходы на возера — з купаннем, рыбалкай, грыбным супам.

— Настрой — справа ніколі не лішняя, — заўважае Вячаслаў Клімовіч. — Таму з вясны мы пачалі практыкаваць іпатэрапію. Бо пакатацца на кані без сядла — значыць адчуць цяпло жывёлы і разняволіцца. А плюс да ўсяго гэта — і натуральны масаж.

Поспех — палічыць да дзесяці

Меркаванне пра тое, што ёсць дзеці, якіх немагчыма навучыць, ужо засталося ў мінулым. Пэўныя поспехі можа мець кожны. Праўда, у кожнага яны свае. Напрыклад, дасягненнем для адных будзе разуменне, што запаленая свечка ці іншы адкрыты агонь — гэта горача. Аднак другія маюць шанцы навучыцца лічыць да дзесяці, вязаць, рабіць кошыкі, маляваць. А некаму нават удаецца крыху асвоіць англійскую мову і камп'ютар. Галоўнае — мець мэту і працаваць.

— Любы занятак — гэта развіццё, — падкрэслівае Вячаслаў Клімовіч. — Таму па магчымасці яны павінны даглядаць сябе, займацца ўборкай тэрыторыі. У інтэрнаце ёсць свойская жывёла, вытворчыя майстэрні, мы маем градкі — вырошчваем бульбу і агародніну. Таксама было вырашана стварыць дадатковую кухню. У ёй выхаванцы інтэрната вучацца гатаваць бульбу, дранікі, печыва, тарты і іншыя стравы і тым самым — фактычна рыхтуюцца да самастойнага жыцця. Дарэчы, думка, што ім нічога не патрэбна, адназначна памылковая. Гэтыя дзеці шмат у чым падобныя на сваіх аднагодкаў. На частку пенсіі па інваліднасці, што выдаецца на рукі, многія старэйшыя дзяўчынкі просяць набываць духі і дарагі шампунь, а старэйшыя хлопчыкі — добрыя, «такія як у рэкламе», станкі для галення.

Еўрапейскі вопыт, наш менталітэт...

Большасць выхаванцаў дома-інтэрната паходзяць з так званых «праблемных» сем'яў, прычым пра некаторых бацькоў няма ўвогуле аніякіх звестак. І ўсё ж гэта — бацькі. Іх тут чакаюць заўсёды.

— Няма такога дзіцяці, якое б не хацела дадому, — адзначае Вячаслаў Клімовіч. — Сёйтой з бацькоў адмаўляецца аддаваць сваіх дзяцей у інтэрнат увогуле. І, я лічу, што гэта правільна. Як бы ні было тут добра, але з роднымі заўсёды лепш. Вось чаму мы распачалі ладзіць «бацькоў

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



Светлавы сігнал спецаўтамабіля — міліцэйскага, МНС, хуткай дапамогі і г.д.

		4			2			
9	8		6	7				1
5				9			6	
	2			5				8
1				2	4		5	6
			9			4		
		9						7
7	5			6			8	4
8						6		

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетак, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

Усміхнемся

ПРЫМЕТЫ <u>ЖАНОЧАГА</u> АЎТО

Машынка чысценькая, памытая, уся такая лапачка, але не едзе, а стаіць у левым радзе...

Люстэрка задняга віду страйніць і малодзіць кіроўцу.

Араматызатарам паветра ў салоне з'яўляецца сама кіроўца.

Ануча для працірання шкла зробленая са старых дзіцячых штонікаў.

Каля задняга шкла сядзіць плюшавы зайка ў міліцэйскай фуражцы.

На адваротным боку талона тэхагляду запісаны тэлефон цырульніцы, якая ведае чалавека, у якога трэба купляць тэхагляд.

ПРЫМЕТЫ <u>МУЖЧЫНСКАГА</u> АЎТО

Першая рыска на спідометры стаіць на 100 км/г.

На люстэрку задняга віду — магутныя паўтараметровыя пацеркі.

Усё шкло наглуха затаніраванае, ёсць толькі вузкі прасвет на лабавым — для вачэй, як у танку.

На машыне ніводнай драпіны — суцэльныя шрамы.

Араматызатарам служыць адкрыты пачак прэзерватываў.

На заднім сядзенні з натуральнай скуры валасы натуральнай бландзінкі.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд + судоку (2 кастрычніка). Па гарызанталі: Лукас. Прынцып. Баль. Румб. Ява. Рапс. Квас. Тырса. Мастацтва. Сыр. Нізка. Абора. Жвір. Тур. Бажоў. Ата. Адат. Ідал. Аман. Аба. Альт. Сітаўка. **Па вертыкалі:** Мост. Канзас. Удача. Пастараль. Альяс. Асоба. Трак. Цырата. Вітраж. Морква. Румба. Ода. Стан. Іж. Звада. Кітаб. Пліска. Арала. **Судоку:** адказы гл. у табліцы.

7	6	9	8	2	5	1	4	3
8	5	4	3	6	1	7	2	9
3	2	1	9	4	7	5	6	8
1	7	6	5	8	4	9	3	2
4	3	2	7	1	9	6	8	5
5	9	8	6	3	2	4	1	7
6	8	5	4	9	3	2	7	1
9	1	3	2	7	6	8	5	4
2	4	7	1	5	8	3	9	6

«КінаVarka»: кіно без цукру

Карэспандэнт «Звязды» шукала маладых беларускіх Бергманаў, Трыераў і Кі-Дукаў

У Беларусі страшэнна нестае кінарэжысёраў. Я думала, можа, «КінаVarka», як амбіцыйны праект для маладых (альбо малады праект для амбіцыйных?), з часам дапаможа запоўніць гэты прагал, — выгадуе, так сказаць, новых добрых аўтараў для айчыннага кінематографа. Але як я ні старалася, так і не змагла разгледзець сярод рэжысёраў, якія ўдзельнічаюць у форуме, ні будучага беларускага Бергмана, ні Ларса фон Трыера, ні хоць бы Кіма Кі-Дука...

З 5 кастрычніка ўсе работы, якія ўдзельнічаюць у «КінаVar-цы», выкладзеныя на сайт фестывалю. Любы ахвотны зможа прагаласаваць за фільм, які найбольш яго зачапіў, — «Прыз глядацкіх сімпатый» таксама ёсць сярод 10 намінацый «КінаVar-кі». А аўтар той работы, якая сёлета атрымае «Гран-пры», па абяцаннях арганізатараў, здыме адну з навел для кінаальманаха «Мінск, я люблю цябе!». Так-так, наша сталіца таксама далучаецца да гэтага міжнароднага кінапраекта, і кампанія «Карамболь» хутка прыступіць да яго здымкаў.

Не кіно, а журавінавы морс

«КінаVarka» — гэта такі адмысловы працэс, дзе мала што ўспрымаецца ўсур'ёз. Поўнай зале гледачоў паказваюць, напрыклад, страшэнна збітага мужчыну з крывавымі ранамі і драпінамі, які нібыта толькі-толькі ўцёк ад сваіх ворагаў (фільм «Runaway» Арцёма Волкава), а гледачы смяюцца. Альбо на экране з'яўляецца меланхалічная дзяўчына, якая цягам некалькіх доўгіх секунд смокча з бутэлькі віно (фільм «Няхай будзе так...» Марыны Дзядзюлі), і мне здаецца, што яна перажывае нейкае страшнае гора, а гледачы зноўку смяюцца. Як я ні хацела, але такі не змагла пачувацца «сваёй» сярод публікі «КінаVarki». Магчыма, таму, што на адкрытым паказе фільмаў-удзельнікаў прысутнічалі бадай толькі самі стваральнікі гэтых фільмаў і іх сябры-сваякі-знаёмыя. Падалося, што гэта не нейкае сур'ёзнае мерапрыемства (хоць форуму ўжо некалькі гадоў), а так — «тусоўка» для сваіх. І тым, хто не ведае гісторыі стварэння пэўнага фільма, не прысутнічаў на здымках, «КінаVarka» нічога даць не можа, бо чалавек будзе проста «не ў тэме»: з чаго смяюцца, чым захапляюцца?! А, дык гэта не сапраўдная кроў, а журавінавы морс!

Несур'ёзнасцю, на жаль, патыхала ад многіх работ, якія можна было ўбачыць на адкрытым паказе. Такое адчуванне, што большасць стваральнікаў абмяжоўвалася выключна фармальнымі пошукамі. Сапраўды ў некаторых работах былі цікавыя ракурсы, кампазіцыйнае рашэнне, стылізацыя. Але амаль ва ўсіх не было сэнсу, зместу, насамрэч якасна рэалізаванай ідэі. Кампазіцыя, колер, мантаж — гэта параметры, па якіх ацэньваюць работы ў творчых ВНУ і якімі трэба ўмець карыстацца. Але для таго, каб кіно, нават кароткаметражнае, чапляла, было шчырым і змястоўным, аўтар павінен ведаць, ШТО ЁН ХОЧА СКАЗАЦЬ. Нават калі ўмееш карыстацца камп'ютарнымі праграмамі і відэакамерай, то гэта яшчэ зусім не значыць, што ты — добры рэжысёр... Удзельнікі «КінаVarki» быццам выконвалі заданне нейкага выкладчыка па рэжысуры, аператарскім майстэрстве і г. д., а не імкнуліся перадаць мовай кіно тое, што ў іх набалела ўнутры, чаму неабходна даць выйсце і што, уласна кажучы, і называецца творчасцю. Бо добра выкананае практыкаванне (хоць і такіх было мала) — гэта яшчэ не твор мастацтва.

Кліпавае мысленне

Самым распаўсюджаным жанрам на «КінаVar-цы» стаў не трылер, драма альбо камедыя, а ... кліп, якія, вядома, таксама бываюць розныя. Але сапраўды якасных кліпаў вельмі мала. Як правіла, гэта проста абстрактны (альбо з просценькім сюжэцікам) відэашэраг, які ненавязліва ілюструе (а можа, і не ілюструе зусім) музычны твор. Менавіта такія кліпы пераважалі на форуме альтэрнатыўнага малабюджэтнага відэа. «Класічны» кліп на песню нейкага альтэрнатыўнага гурта з прыгожымі хлопцамі-музыкамі на дэкадэнцкім фоне; кліп на песню гурта CherryVata; падборка нейкага пляжнага відэа пад «лёгкую» сезонную музыку; экстрэмальны чорна-белы кліп з досыць авангардным аператарскімі рашэннямі, але на безгустоўную танную папулярную песню... На сур'ёзную работу не цягнуў ніводны кліп. Асабліва мяне здзівіла, што аўтары (не толькі кліпаў, дарэчы), відаць, успрымаюць словазлучэнне «аўтарскае бачанне» вельмі літаральна. І дэманструюць у найлепшым выпадку добрую па тэхнічнай якасці карцінку, але абсалютна пустую па змесце... Аўтарскае бачанне: што бачу, тое і здымаю?! Ніводнага прадуманага дыялога, ніводнай паўнавартаснай, даведзенай да ладу канцэпцыі.

Сёлета, дарэчы, у «Кіна Varki» новыя суддзі: акцёры Анатоль Кот, Аляксандр Кашпераў і Ганна Хітрык. Яшчэ адзін суддзя праекта, **драматург Андрэй КУРЭЙЧЫК**, з якім давялося паразмаўляць пасля прагляду, не падтрымаў майго песімістычнага настрою:

— У мяне добрае ўражанне, таму што аўтарамі прыкладзена шмат фантазіі, шмат гумару. Сваё нейкае бачанне ёсць у тых рэжысёраў, якія здымаюць для гэтага фестывалю. Прычым я разумею, наколькі гэта складана, таму што большасць фільмаў, напэўна, фінансавалася літаральна са сваёй кішэні, з кішэні сяброў, здымалася на непрафесійную апаратуру. І пры гэтым яны часам пакідаюць большае ўражанне, чым многія дарагія праекты, знятыя за многа-многа грошай. Гэта яшчэ раз паказвае, што самае галоўнае — гэта фантазія і сапраўднае рэжысёрскае бачанне. У некаторых работах яно ёсць. Я не скажу, што ва ўсіх, — безумоўна, узровень розны. Але ў некаторых ёсць, і гэта ўжо добра. Наогул, амерыканскі, еўрапейскі вопыт паказаў, што далёка не ўсе таленавітыя людзі паступаюць у спецыялізаваныя ВНУ. Некага могуць прагледзець, нехта сам не пайшоў, нехта адразу акунуўся ў прафесію, звязаную з тэлебачаннем: здымаў для тэлебачання, а потым захацеў здымаць кіно. Стывен Спілберг, напрыклад, нідзе не вучыўся, проста з камерай хадзіў і нешта здымаў для сябе. А ў выніку атрымаўся вялікі кінарэжысёр. Я думаю, што малады альтэрнатыўны погляд зараз нам вельмі патрэбны. У нас, мне здаецца, надта традыцыйная рэжысёрская школа ў галіне кінематографа. У нас здымаюць так, як ужо ў свеце даўно не здымаюць. Таму трэба проста прыглядацца да маладых, шукаць таленты.

Экуменістычныя матывы

Біблія, рэлігія, Бог, гуманізм — адны з лейтматываў многіх работ «КінаVarki». Нягледзячы на сур'ёзнасць, якую падразумяваюць гэтыя паняцці, кінематаграфічна раскрыты яны неглыбока, «па-школьнаму». Як гэткія пафасныя намёкі на нешта большае: «Біблія» ў руках юнака напрыканцы кліпа альтэрнатыўнага гурта; абразы, якія заўжды трымае пры сабе дзядуля — пацыент лякарні ў фільме «Позірк у акно»... Магчыма, глыбіні ў аўтараў не атрымалася таму, што яны амаль усе імкнуліся ўкласці ў максімальна дазволены 30-хвілінны метраж гісторыю, вартую поўнаметражнага фільма. Трэба быць вялікім майстрам, каб справіцца з такой задачай. Згадайма любы кінаальманах ад «Эраса» да «На дзесяць хвілін старэйшы: віяланчэль», у якім удзельнічалі славутыя кінарэжысёры, яны і то ў сціслых навелах паказвалі ўсяго толькі каларытны эпізод з жыцця, урывак, а не эпапею пра лёс чалавека. Як ні крыўдна, але некаторыя фільмы на «КінаVar-цы» атрымаліся вельмі падобнымі на сацыяльныя ролікі «Белвідэацэнтра». Прычым вы ж разумееце (так?), што сацыяльныя ролікі — гэта спрошчаная мараль і дрэнная акцёрская гульня...

Справа гумару

Але ці ёсць жа нешта станоўчае на «КінаVar-цы»? Так, самы тлусты плюс, які мне ўдалося разгледзець у некаторых работах, — гэта здаровы аўтарскі гумар. З якога, дарэчы, я і пачала. Запомніўся яшчэ фільм «Апошняя вайна», прагляд якога суправаджаўся шчырым дружным рогатам гледачоў. Фільм распавядае пра ветэрана вайны. Ён дагэтуль не вітаецца са сваім аднагодкам, бацька якога ў часы Вялікай Айчыннай быў паліцаем. Дзядуля-ветэран настолькі апантаны памяццю пра страшную вайну, што ягоныя паводзіны здаюцца гіпербалізавана камічнымі. А аднойчы, блукаючы па лесе, ён натыкаецца на здымкі фільма пра вайну, у якіх, вядома ж, удзельнічалі і «немцы». У дзядулі было з сабой ружжо...

Этнічны голад

Фільмы на беларускай мове ці хоць бы кліпы на беларускія песні наогул адсутнічаюць у конкурснай праграме першага беларускага форума альтэрнатыўнага малабюджэтнага відэа. Што падалося мне вельмі дзіўным, таму што сярод творчай моладзі быць патрыётам, у чалавечым сэнсе слова, зараз, без перабольшвання, модна. З іншага боку, я вельмі гэтаму парадавалася: досыць часта патрыятызм, нацыянальныя матывы, беларускую мову проста эксплуатуюць, спадзеючыся за кошт іх вылучыцца сярод астатніх, не ўкладаючы ў гэта ні сэнсу, ні душы. Але я адчувала-такі нейкі этнічны голад, нейкую крыўду за тое, што беларускіх аматараў паздымаць на відэа больш прываблівае савецкая эстэтыка 30-40-х гг. мінулага стагоддзя (фільм «Фаня»), беларуская савецкая эстэтыка гэтага ж перыяду...

Нейкая штучнасць, фармальнасць панавала на экране падчас адкрытага прагляду фільмаў-удзельнікаў. «КінаVarka» «зварыла» кіно без цымусу, без водару. Ды яшчэ і цукар пакласці ў гэтае кіно забыліся.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.22	18.32	11.10
Віцебск —	7.13	18.20	11.07
Магілёў —	7.12	18.22	11.10
Гомель —	7.07	18.20	11.13
Гродна —	7.37	18.47	11.10
Брэст —	7.36	18.49	11.13

Месяц

Маладзік у 21.45.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Фёклы, Андрэя, Васіля, Віталя, Паўла, Сяргея, Уладзіслава.*

К. *Марыі, Юстыны, Марка, Сцяпана, Сяргея.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



7 кастрычніка

Дзве даты

1788 год — нарадзіўся (вёска Гразівец Чавускага раёна Магілёўскай вобл.) Іван Іванавіч Насовіч, беларускі мовазнаўца-лексікограф, фальклярыст, этнограф. Супрацоўнічаў з Аддзяленнем рускай мовы і славеснасці Пецярбургскай АН, Археаграфічнай камісіяй, Аддзяленнем этнаграфіі Рускага геаграфічнага грамадства. Шмат падарожнічаў па Беларусі, сабраў багаты лексічны, фразеалагічны і фальклорна-этнаграфічны матэрыял. Аўтар першага гістарычнага слоўніка беларускай мовы «Алфавітны ўказальнік старадаўніх беларускіх слоў, узятых з «Актаў, якія адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі», у якім растлумачана каля 13 тысяч слоў і паняццяў. Асобнае месца ў навуковай дзейнасці Насовіча займае «Словарь белорусского наречия». У ім больш за 30 тысяч слоў, запісаных аўтарам у Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губернях, а таксама запазычаных з фальклорных твораў і літаратурных помнікаў старажытнай беларускай пісьменнасці, раскрыты значэнні слоў і словазлучэнняў, дадзена іх этымалогія, прыведзены прыкладныя рускія эквіваленты. Складальнік фальклорна-этнаграфічных зборнікаў «Беларускія прыказкі і прымаўкі», «Зборнік беларускіх прыказак», «Беларускія прыказкі і загадкі», «Беларускія песні» і інш. Аўтар гісторыка-лінгвістычнага даследавання «Пра плямёны з часоў Рурыка, якія засялялі беларускую тэрыторыю», артыкулаў, прысвечаных песеннай культуры беларусаў. Яго фальклорныя запісы ўвайшлі ў тамы серыі «Беларуская народная творчасць». Памёр у 1877 годзе.

1885 год — нарадзіўся Нільс Бор, дацкі фізік, адзін са стваральнікаў сучаснай фізікі і Нобелеўскі лаўрэат. Н. Бор рана выявіў у сабе цягу да даследавання загадак атамарнай структуры рэчыва. Скончыўшы ўніверсітэт, ён пачаў працаваць над магістарскай дысертацыяй. Цікавы той факт, што работа над ёй зацягнулася вельмі надоўга, таму што Бор ніяк не мог скончыць з эксперыментальнай часткай , бо ўвесь час ставіў усе новыя і новыя вопыты.

Цытата дня:

«Філасофія вывучае памылковыя погляды людзей, а гісторыя — іх памылковыя ўчынкі».

Філіп Гедала (1889—1944), англійскі пісьменнік.

АДЗЕННЕ МАЛАДЫХ

Згодна з беларускай народнай традыцыяй у адзенні жаніха і нявесты дамінаваў белы (светлы, шэры) колер, які сімвалізаваў пераход маладых з аднаго стану ў іншы, у нашым выпадку — з юнацкасці ў сталае сямейнае жыццё. Аднак адзенне і жаніха, і нявесты складалася з элементаў (пояс, упрыгожванні і да т. п.), якія былі выкананыя з прысутнасцю чырвонага колеру — імі маладыя «экраніравалі» (засцерагалі) сябе ад прысутных.

● Белую шлюбную сукенку з вэлюмам мае права апрануць толькі цнатлівая нявеста. У адваротным выпадку яна падбірае сабе сукенку іншага колеру (бэжавую, руковую, блакітную і г. д.).

● Калі нявеста цяжарная, то яна павінна апрануць убор, у якім будзе дамінаваць чырвоны колер, які з'яўляецца, па народных уяўленнях, надзейным энергетычным абярэгам ад вачэй прысутных на вяселлі людзей. Па гэтай жа прычыне строй чырвонага колеру апранала нявеста на другі дзень вяселля, бо пасля першай шлюбнай ночы яна магла стаць носьбітам новага жыцця.

● Сёння вясельная мода прапануе самыя разнастайныя мадэлі сукенак для нявест. Аднак, выбіраючы святочны ўбор, не забывайце, што вясельная сукенка — гэта не проста строй для звычайнай сяброўскай вечарынкі ці свецкай бяседы. Паказваючы ўсё харство сваёй постаці дзякуючы глыбокаму дэкальтэ і максімальна адкрытым плячам, нявеста робіць сябе зусім неабароненай у плане адмоўнага энергетычнага пасылу, а папросту — сурокаў.

● Сёння існуе шэраг вясельных салонаў, якія прапануюць жаніхам і нявестам адзенне напракат. Варта задумацца, перш чым перасягнуць парог такога салона: якую энергетыку «пакінуў» папярэдні жаніх і нявеста той сукенцы, якую вам прапануюць? Шчасце ўзяць напракат немагчыма, а вось чужыя беды і няшчасці — колькі заўгодна.

● Каб вясельнае адзенне прынесла вам толькі шчасце, паспрабуйце захаваць рэшту пасля яе набыцця і не траціць як мага даўжэй.

● Нядобразычліўцы могуць наклікаць на вас шмат бед і няшчасцяў, выкарыстоўваючы вясельнае адзенне, фату, заручальныя пярсцёнкі. Таму неабходна старанна берагчы іх і не даваць прымяраць іншым людзям.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Віншуем **з днём нараджэння** дарагую дачку **Ганну Анатольеўну ЛАГУН** з г. Віцебска! Жадаем моцнага здароўя, поспехаў у асабістым жыцці і працы, усяго самага найлепшага.
Тата і маці, *г. Сянно.*

Віншуем нашу любую **Танюшу СЯНЬКО з 13-годдзем!** Жадаем моцнага здароўя, любові блізкіх, поспехаў у вучобе і добрага настрою.
Татуля, матуля, дзядуля, бабуля.

Віншуем **з днём нараджэння Ганну Пятроўну ДАВІДОЎСКУЮ.** Зычым ёй моцнага здароўя, сямейнага шчасця, доўгага веку.
Калектыў РУПС «Быстрыца».

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 36 (368)

Здароўе саду — добры ўраджай

Восень — гэта не толькі час збору ўраджаю, гэта і перыяд падрыхтоўкі саду да зімы, важным момантам якой з'яўляецца пабелка.

«Навошта бяліць сад?» — спытаецца навічок. Нехта адкажа: «Для прыгажосці». Але вопытныя садаводы і дачнікі беляць сад, у першую чаргу, не для прыгажосці. Паказчык здароўя дрэва — гэта стан яго кары. Асенняя пабелка саду — працэдура абавязковая. Пры дапамозе пабелкі мы ахоўваем кару пладовых і дэкаратыўных дрэў ад пашкоджанняў у выніку рэзкіх перападаў дзённых і начных тэмператур (сонечных апёкаў, маразабоін) у канцы зімы — пачатку вясны. Днём нічым не ахаваную кару, якая выдзяляецца цёмнай плямай на белым снежным дыване, награе сонца — вось вам і апёк кары. На практыцы даказана, што дрэвы вымярзаюць у асноўным у канцы зімы — пачатку вясны. У гэты час яны выходзяць з фазы глыбокага пакою і пераходзяць у фазу вымушанага чакання цяпла. У канцы зімы ўдзень тэмпература паветра можа павышацца да плюс 15 градусаў. Пачынаецца перабудова на клетачным узроўні — падрыхтоўка да цяпла. Уначы тэмпература паніжаецца да мінус 15, а то і 20 градусаў. Пры такіх рэзкіх ваганнях начных і дзённых тэмператур на ствалах могуць з'яўляцца трэшчыны, так званыя маразабоіны. А вось пабеленае дрэва лепш адбівае святло, менш награецца.

Перад надыходам устойлівага пахаладання штамбы і асновы шкілетных галін беляць вапнавым растворам (на 10 л вады 2 кг свежагашанай вапны, 500 г жалезнага або 300 г меднага купарвасу, 100 г разагрэтага сталярнага клею, замест якога можна ўзяць 200 г мучнога клейстару або 1 кг гліны). Выкарыстоўваюць і гатовую садовую пабелку, водаэмульсійныя фарбы, якія ствараюць устойлівы белы фон працяглы час.

Дрэвы трэба бяліць для таго, каб выратаваць ад мышэй, зайцоў ці іншых жывёл, каб тыя не маглі дастаць да свежай і смачнай кары, а таксама для прафілактыкі хвароб — у першую чаргу, чорнага раку.

Беляць дрэвы, узрост якіх больш за 8—10 гадоў. Маладыя дрэвы, якія яшчэ не пладаносяць, бяліць не варта. Па-першае, на гладкай кары шкоднікам няма дзе затаіцца. Па-другое, вапнавы раствор, закупорваючы поры, адмоўна ўплывае на рост і агульнае развіццё раслін.

Квас з пладоў каштана

Для ўмацавання арганізма чалавека, насычэння яго ёдам, кальцыем, меддзю прыгатуйце квас з пладоў каштана.

На 3 л гатаванай вады ўзяць 20—30 каштанаў, ачышчаных ад «калючак» і разрэзаных папалам. Дабавіць 1 шклянку цукру і для закваскі 1 ст. л. смятаны або кефіру. Усё гэта павінна перабрадзіць на працягу 2 тыдняў, а потым можна піць. У гушчу, якая засталася пасля выпітага квасу, можна зноў даліваць ваду і дабаўляць цукар (1 шклянка на 3 л). Праз 2 дні пасля браджэння можна піць. Гаючыя ўласцівасці напою пры гэтым захоўваюцца.

Клопаты кветкаводаў

● Зграбіце лісты пад кустамі і дрэвамі. Спаліце лісты, паражоныя хваробамі, а здаровыя выкарыстайце для прыгатавання лісцявой зямлі або кампосту.

● Пастарайцеся высадзіць у грунт цыбуліны цюльпанаў, гіяцынтаў, нарцысаў — да замаразкаў яны павінны ўкараніцца. У глебу перад пасадкай унясіце арганічныя і комплексныя мінеральныя ўгнаенні.

● Падрыхтуйце да ўкрыцця ружы. Збярыце з-пад кустоў апалае лісце і спаліце яго. Выражце нявыспелыя і пашкоджаныя парасткі. Галінкі пляцістых і іншых ружаў прыгніце да зямлі і замацуйце шпількамі. Да надыходу маразоў ружы не ўкрывайце.

● Падрыхтуйце да зімы клематысы: акучце зямлёй, здыміце ліяны з апор, пакладзіце на лапнік і ўкрыйце торфам, пілавіннем, дубовымі лістамі.

● Зрэжце сухія сцёблы ва ўсіх шматгадовых кветак, пакінуўшы пянькі вышынёй 5—10 см для ўтрымання снегу зімой.

● З пачаткам ацяпляльнага сезона перанясіце ў халаднаватыя памяшканні ці крыху далей ад батарэй цэнтральнага ацяплення мірт, пеларгонію, амарыліс, цыкламен і інш.

● Азалію, камелію, пуансетыю, цыкламен, якія рыхтуюцца да цвіцення, пастаўце на падаконнік, бліжэй да святла.

● Апырсквайце расліны некалькі разоў на тыдзень. Палівайце рэдка, але многа, каб вада не застойвалася ў паддонах. Не забывайцеся падкормліваць расліны як спецыялізаванымі, так і звычайнымі комплекснымі мінеральнымі ўгнаеннямі.

Яблыкі не падкісляць глебы

«Яблыкаў у нас сёлета многа, не спраўляемся іх парадкаваць. А вось ці можна закопваць у зямлю яблыкі для таго, каб падкісліць глебу, на якой растуць буякі садовыя і якім патрэбна кіслая глеба?» А. Байкоў, пас. Ждановічы

Хутчэй за ўсё яблыкі можна выкарыстаць у якасці ўгнаення. У гэтых мэтах падыдуць і апад яблыкаў, і прадукты іх перапрацоўкі. Лепш за ўсё яблыкі закласці ў кампосную кучу, здрабніўшы плады. У такім выглядзе раскідаць па полі — пажадана на тым участку, дзе ў наступным годзе вы плануеце высаджваць бульбу альбо іншыя прапашныя культуры. Трэба толькі пачакаць, калі яблыкі згніюць, пасля чаго іх закапаць, адначасова ўносячы на ўчастак арганічныя ўгнаенні: гной, кампост.

Калі закапаць у зямлю яблыкі цэлымі, то яны, як і бульба, захаваюцца непашкоджанымі. Справа ў тым, што іх скурка пакрытая тонкім слоем воскападобнага рэчыва, у якім знаходзяцца эфірныя алеі, што засцерагаюць яблыкі ад уздзеяння вады, грыбкоў і іншых мікраарганізмаў. Але калі скурка пашкоджаная, працэс гнення паскараецца ў шмат разоў.

А вось што датычыцца кіслотнасці глебы, то яблыкі яе не павысяць. Па-першае, кіслоты яны змяшчаюць нямнога. А вось большасць соляў, якія змяшчаюцца ў іх, маюць шчалачную рэакцыю. Па-другое, унясенне пад прапашныя культуры арганічных угнаенняў нейтралізуе кіслотнасць.

Калі ў вас няма куды падзець яблыкі і вы хочаце іх выкарыстаць у якасці ўгнаення, здробненыя плады не варта закопваць прама ў садзе. Гэта будзе садзейнічаць развіццю наяўных захворванняў яблынь і іншых пладовых культур.

Замест нафталіну

Ёсць такая пакаёвая расліна, якую ў народзе называюць «крапіўкай».

Яна адносіцца да сям'і губакветных, з радзіма яе Паўднёвая Афрыка. Расліна не мае ні яркіх кветак, ні прыгожых лістоў. У яе шырокія яйкападобныя лісты з зубчастымі краямі пакрытыя шарсцістымі валаскамі. Яны вельмі нагадваюць лісты крапівы.

Пах гэтай расліны нагадвае пах мяты. Яго не церпіць моль. Сцвярджаюць, што нават мухі не любяць гэтую расліну.

Садовыя буякі — культура, якая мае многа вартасцяў

Пра якія буякі ідзе размова? Пра распаўсюджаныя ў нашых лясах і на балотах? Не зусім. У лясах растуць буякі звычайныя ці балотныя — куст вышынёй 1 метр, які жыве да 100 гадоў і пачынае пладаносіць з узросту 15 гадоў. У адрозненне ад дзікіх садовыя буякі высакарослыя — іх яшчэ называюць садовымі. Ягады больш круглыя і смачныя, чым дзікія. Яны раней уступаюць у плоданашэнне і больш ураджайныя. Ураджайнасць садовых буякоў можна параўнаць з ураджайнасцю чорных парэчак.

У пачатку мінулага стагоддзя амерыканскія вучоныя звярнулі ўвагу на карысныя ўласцівасці лясных буякоў, заняліся селекцыяй. У выніку іх настойлівай працы на свет з'явіліся садовыя буякі, памер ягад якіх у некалькі разоў перавышае плады іх дзікіх сабратаў, захоўваючы пры гэтым незвычайны смак і якасць.

У Расіі, Беларусі, Прыбалтыцы высакарослыя буякі з'явіліся ў 70-х гадах мінулага стагоддзя. Вядомы польскі вучоны-біёлаг калісьці пажартаваў: «Калі вы зоймецеся вырошчваннем буякоў садовых, то вы ніколі не памраце». І ён меў рацыю. Цяпер гэтыя ягады рэкламуюць як крыніцу вечнай маладосці. Вучоныя даказалі, што буякі садовыя здольныя не толькі запавольваць працэсы старэння.

Каб палепшыць абмен рэчываў, памяць і каардынацыю рухаў, дастаткова з'ядаць паўшклянкі ягад у дзень. У параўнанні з большасцю ягад, фруктаў, агародніны, дзе таксама прысутнічае комплекс вітамінаў і мікраэлементаў, у буяках змяшчаецца яшчэ многа антыаксідантаў, якія прадухіляюць старэнне клетак. У выніку ўжывання садовых буякоў паляпшаецца памяць, павышаецца вастрыня зроку, работа стрававальнага тракта, залоз унутранай сакрэцыі. Яны таксама здымаюць алергічныя рэакцыі арганізма на лекі і прадукты харчавання. Такога комплекснага станоўчага

ўплыву на ўвесь чалавечы арганізм, як гэта адбываецца ў выніку спажывання буякоў, не дае ўжыванне іншай садавіны і гародніны.

У нашых прыродных умовах садовыя буякі — гэта куст, вышыня якога дасягае 2,5 метра. Ягады выспяваюць у залежнасці ад гатункаў і ўмоў надвор'я. Кусты пачынаюць пладаносіць з 3-гадовага ўзросту. З чацвёртага года, калі кусты добра разрасцуцца, ураджайнасць дасягае 3—5 кг, часам да 7 кг з куста. Буякі можна вырошчваць на любых кіслых глебах (аптымальнае значэнне pH 3—5). Іх трэба садзіць на сонечным месцы і ў рыхлую глебу, а лепш за ўсё — у ямы (глыбіня 60 см, дыяметр 60—80 см), запоўненыя сумессю верхавога торфу і пяску ў суадносінах 3:1.

(Працяг будзе.)

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, ю